Цэнтр Мерашэўскага

# Нявыкарыстаны патэнцыял?

Мапа беларускай культуры ў Польшчы



# НЯВЫКАРЫСТАНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ?

# НЯВЫКАРЫСТАНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

Мапа беларускай культуры ў Польшчы

Варшава 2026
Цэнтр Мерашэўскага

**АНАЛІЗ І РАПАРТ:** аўтары з асабістых прычынаў застаюцца ананімнымі
**КААРДЫНАЦЫЯ:** Паўліна Бараноўска
**РЭДАКТАРКА:** Наста Вандроўная
**ГРАФІЧНЫ ДЫЗАЙН І ВЁРСТКА:** dobosz.studio

© Аўтарскія правы належаць
Цэнтр дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага 2026

**ВЫДАВЕЦ**
Цэнтр дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага
вул. Ясна 14/16а, 00-041 Варшава
Тэл. +48 22 295 00 30
Электронная пошта: kontakt@mieroszewski.pl
www.mieroszewski.pl

# ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| | Уступ | 6 |
| I. | | |
| II. | **Шматкірункавая дзейнасць** | **10** |
| | Інстытуцыі, праекты і ініцыятывы | 11 |
| III. | **Візуальнае мастацтва і дызайн** | **22** |
| | Інстытуцыі, праекты і ініцыятывы | 25 |
| | Аўтары | 31 |
| IV. | **Захаванне спадчыны. Гісторыя і памяць. Мова** | **52** |
| | Інстытуцыі, праекты і ініцыятывы | 55 |
| | Асобы | 62 |
| V. | **Кіно** | **66** |
| | Інстытуцыі, праекты і ініцыятывы | 69 |
| | Аўтары | 73 |
| VI. | **Літаратура і пераклады** | **80** |
| | Інстытуцыі, праекты і ініцыятывы | 83 |
| | Аўтары | 90 |
| VII. | **Музыка і сцэнічныя ініцыятывы** | **98** |
| | Інстытуцыі, праекты і ініцыятывы | 101 |
| | Аўтары | 105 |
| VIII. | **Тэатр і перформанс** | **118** |
| | Інстытуцыі, праекты і ініцыятывы | 121 |
| | Аўтары | 128 |
| | Рэкамендацыі | 140 |
| | Алфавітны паказальнік асоб і ініцыятыў | 142 |

# УСТУП

## ЦЭНТРЫ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў ПОЛЬШЧЫ



## Гэты рапарт узнік як спроба ацаніць маштаб, якасць і праблемы беларускай культурніцкай супольнасці ў Польшчы. З 2020 года эміграцыя творцаў розных дысцыплінаў з Беларусі ў Польшчу адбываецца хутчэй у экстранны, чымся натуральны спосаб. У выніку мясцовы культурніцкі кантэкст пры ўсёй адкрытасці і салідарнасці аказваецца няздольным у якой-‑кольвек істотнай ступені інтэграваць у сябе беларускую творчую эліту.

Пра якую колькасць прадстаўнікоў і прадстаўніц творчых прафесіяў мы кажам? Дакладных альбо хаця б прыблізных звестак, прынамсі пакуль, не існуе. Арганізацыі і адмыслоўцы, якія маніторацць стан беларускай культуры, прызнаюць, што бачаць толькі верхавіну айсберга. Нават агульны лік людзей з Беларусі, якія сёння жывуць у Польшчы, істотна адрозніваецца ў залежнасці ад спосабу падліку і вар'юецца паміж 145 і 350 тысячамі. Лічба да таго ж стала павялічваецца. Хіба адзінае, што можна сказаць з упэўненасцю: беларусы – другая найбуйнейшая група замежнікаў у Польшчы.

Рапарт месціць прыблізна 120 арганізацыяў, ініцыятываў, праектаў і прыблізна 200 аўтараў і аўтарак (сюды ж увайшлі музычныя гурты, то бок колькасць задзеяных творцаў большая), што дзеюць у Польшчы пасля пачатку масавай эміграцыі 2020 года, аднак гэтаксама адлюстроўвае толькі верхавіну айсберга. Шмат якія беларускія творцы ў актуальным рэпрэсіўным кантэксце свядома працуюць пад псеўданімамі альбо ўвогуле ўнікаюць кантактаў з супольнасцю з меркаванняў бяспекі альбо адчування бяспекі. Шмат хто з тых, з кім мы камунікавалі, рыхтуючы рапарт, прызнаваліся, што пазбягаюць згадак пра сябе дзе-кольвек.

Варта ўлічваць і тое, што праз актуальны кантэкст у рэгіёне ды імклівую эміграцыю шмат хто не здолеў захаваць магчымасці займацца творчасцю прафесійна і пераключыўся на іншыя

кваліфікацыі – адпаведна перасталі быць бачнымі супольнасці, хаця і захоўваюць аўтарскі патэнцыял, а магчыма, і дзейнасць.

Так ці інакш менавіта Польшча сталася цэнтрам беларускага эміграцыйнага жыцця ў культуры. Пасля 2020 года беларускія творчыя супольнасці сфармаваліся хіба ў кожным буйным польскім горадзе – Варшаве, Кракаве, Гданьску, Беластоку, Вроцлаве, Познані ды іншых. Пры гэтым некаторыя ўжо жылі і працавалі ў Польшчы на момант падзеяў у Беларусі 2020 года, і частка творцаў гучна пра сябе заявіла за апошнія гады.

Узаемадзеянне беларускай і польскай культураў за гэты час паказала на прыкладах, які можа быць плён ад культурніцкага абмену. Эфектныя прыклады супрацы паўстаюць у папулярнай музыцы – як гурт Soyuz альбо Sw@da і Niczos. Пры гэтым Sw@da і Niczos – музыкі не беларускія, а польска-беларускага памежжа, якіх беларусы адразу залучылі ў сваё кола. Драматург і тэатральны рэжысёр Мікіта Ільінчык імкліва развіваецца як аўтар на польскай сцэне: у выніку ў 2025 годзе атрымаў намінацыю на прэмію Paszporty Polityki ў катэгорыі «Сцэна». Намінацыю на Paszporty Polityki ў катэгорыі «Візуальнае мастацтва» ў 2024 годзе атрымала мастачка Ала Савашэвіч, а ў 2021-м лаўрэаткаю гэтай узнагароды сталася беларуска Яна Шостак. Рэжысёрка Мара Тамковіч пры падтрыманні Польскага кінаінстытуту зняла свой поўнаметражны дэбют «Пад шэрым небам» пра беларускую палітзняволеную: стужку намінавалі на Еўрапейскую кінапрэмію.

Трэба адзначыць, што толькі нязначная колькасць беларускіх творцаў паспяхова інтэгравалася ў мясцовы культурніцкі кантэкст і знайшла істотную аўдыторыю па-за дыяспараю. З эміграцыяй, часта раптоўнаю, большасць пачынае свой шлях з нуля і патрабуе часу, каб прафесійна развіцца ў новым кантэксце. У сваю чаргу часу і высілкаў вымагае пытанне легалізацыі ды наладжванне побыту ў новых умовах, ролю адыгрывае вывучэнне новай мовы. Некаторым не стае інструментаў і ведаў, каб улівацца ў мясцовую культурніцкую індустрыю ды прыстасоўвацца да новых правілаў гульні.

Значная частка супольнасці свядома застаецца ў межах дыяспары і/альбо ў палітычна-пратэсным дыскурсе, паноўным у першыя гады масавага адтоку адмыслоўцаў з Беларусі. Аднак мы можам назіраць паступовую змену дынамікі: сітуацыя ў краіне застаецца ранейшая, уздым 2020 года аказваецца ўсё далей у мінулым, разам з тым салідарнасць міжнароднай супольнасці стала спадае – гэта вымагае альбо сыходу ў больш стабільныя прафесіі, пакідаючы творчасць факультатыўнаю дзейнасцю, альбо пошуку новых пунктаў апоры і спосабаў працы ў культуры.

Тыя, хто выбірае апошняе, вучацца дзеяць у міжнародным кантэксце праз фандрэйзінг, партнёрства, змену фокусу. Гэты рух правакуе ў супольнасці пакуль невыразную, але дыскусію пра рызыку страціць беларускую ідэнтычнасць і асімілявацца ў агульнаеўрапейскі кантэкст. Так ці інакш усведамленне сябе часткаю беларускай супольнасці ды беларускага парадку дня і праз пяць гадоў у эміграцыі застаецца магутным. Гэта відаць, напрыклад, з таго, як часта творцы альбо ініцыятывы вызначаюць сябе як незалежныя альбо, радзей, свабодныя, вольныя, каб

супрацьпаставіць сябе дзяржаве: у такім значэнні гэты панятак не ўласцівы агульнаму еўрапейскаму кантэксту, затое ёсць сімптомам беларускай рэчаіснасці. У гэтым рапарце мы пазбягаем гэтага азначэння, калі толькі яно не ёсць часткаю назвы, мяркуючы, што згаданыя тут асобы ды ініцыятывы апрыёры не рэпрэзентуюць сабою ніякіх палітычных сілаў альбо ідэалогіяў ды працуюць у адэкватным культурніцкім кантэксце, які мяркуе свабоднае выказванне пра любыя з'явы рэчаіснасці, у тым ліку калі яны закранаюць палітыку якой-кольвек краіны альбо групы краінаў.

Трэба адзначыць, што Польшча праз шматлікія арганізацыі, стыпендыі, рэзідэнцыі надала і працягвае надаваць беларускай культуры ў эміграцыі неацэннае падтрыманне. Значная колькасць творцаў і праектаў, згаданых у рапарце, карысталіся і карыстаюцца спрыяннем альбо партнёрствам Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны, лакальных уладаў, шматлікіх культурніцкіх інстытуцыяў. Цэнтр дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага фінансуе праекты беларускіх творцаў у рамках адкрытага конкурсу. Сталаю формаю дапамогі застаецца стыпендыяльная праграма Gaude Polonia міністра культуры і нацыянальнай спадчыны.

Гэты рапарт адлюстроўвае беларускую культурніцкую супольнасць, што дзеіць у Польшчы, у катэгорыях «Візуальнае мастацтва і дызайн», «Кіно», «Літаратура і пераклады», «Музыка і сцэнічныя ініцыятывы», «Тэатр і перформанс». Дадаткова дае ўяўленне пра ініцыятывы і асобы ў раздзеле «Захаванне спадчыны. Гісторыя і памяць. Мова». Пачаць агляд мы дазволім сабе з арганізацыяў, дзейнасць якіх не абмяжоўваецца канкрэтным відам мастацтва, а ахоплівае адразу некалькі альбо культуру агулам. Кожнаму раздзелу, апроч першага, папярэднічае кароткае апісанне актуальнай сітуацыі, складзенае пры дапамозе экспертаў. У апісаннях праектаў і асобаў мы факусуемся на дзейнасці ў Польшчы.

Мы разлічваем, што гэтак паказаная беларуская культурніцкая супольнасць здолее адлюстраваць яе патэнцыял, а асабліва – нявыкарыстаны. Хаця за час пасля 2020 года сярод беларусаў у Польшчы выбудавалася пэўная экасістэма кааперацыяў, праца гэтак істотнай творчай сілы вымагае больш сістэмнага падыходу. Скантактавацца са згаданымі ў тэксце дзеячамі і ініцыятывамі можна праз Цэнтр Мерашэўскага. Да таго ж, паколькі, як ужо адзначалася, рапарт не можа адлюстраваць усёй паўнаты беларускай культуры ў Польшчы, а ініцыятывы знікаюць і з'яўляюцца, пералік адкрыты: мы гатовыя яго абнаўляць па заўвагах у адмысловай форме form.mieroszewski.pl/to/kulturaBY.

У канцы рапарт утрымлівае рэкамендацыі польскаму боку, як праз міжкультурны абмен зрэалізаваць карысць для культурніцкай сферы Польшчы, а таксама паспрыяць умацаванню дэмакратычных практык у беларускім грамадстве, што істотна для будучыні ўсяго рэгіёну.

→ ЗМЕСТ

# ШМАТКІРУНКАВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ



# ІНСТЫТУЦЫІ, ПРАЕКТЫ І ІНІЦЫЯТЫВЫ

## *ВАРШАВА*

### БЕЛАРУСКІ ДОМ У ВАРШАВЕ

Арганізацыя падтрымлівае беларускую дыяспару і працуе як пляцоўка для культурніцкіх, адукацыйных і грамадскіх ініцыятываў. Дзеіць у Польшчы з 2011 года, зладзіла каля 500 івэнтаў. На пляцоўцы арганізацыі адбываюцца выставы, канцэрты, пікнікі, аўтарскія сустрэчы з беларускімі мастакамі, пісьменнікамі і музыкамі. Прапануе магчымасці для адукацыі і развіцця праз курсы, трэнінгі, сустрэчы з экспертамі, праграмы павышэння кваліфікацыі, а таксама ладзіць канферэнцыі, напрыклад, у справе адукацыі беларусаў за мяжой альбо развіцця культуры.

Больш інфармацыі: belaruskidom.eu

### БЕЛАРУСКІЯ МАГІСТРАТЫ

Праект створаны для выбудоўвання супольнасцяў вакол культурніцкіх і грамадска значных праектаў. Паводле ідэі працяглага салідарнага падтрымання, суполка ахвярадаўцаў дамаўляецца падтрымліваць выбраны беларускі праект фіксаванаю сумаю на пэўны перыяд. Першы магістрат – «Кнігаўка» – за 6 месяцаў сабраў больш за 100 тысячаў злотых на аднаўленне выдавецкай справы Андрэя Янушкевіча ў Польшчы. Магістраты таксама падтрымалі клуб для падлеткаў, беларускамоўны спартовы клуб, праект стварэння гарадскіх аўдыяэкскурсіяў па-беларуску. Перыядычна робяць інвестыцыі, або мікраграанты ў кніжныя ініцыятывы, напрыклад, у скарбонку для перакладаў нон-фікшан-гітоў і стварэнне чытацкіх клубаў.

Больш інфармацыі: mahistrat.byculture.org

### БЕЛАРУСКІ МОЛАДЗЕВЫ ХАБ

Пляцоўку стваралі ў 2021 годзе для нэтўоркінгу беларускіх актывістаў і журналістаў, сёння працуе як цэнтр грамадска-дэмакратычнага жыцця беларусаў Варшавы і хаб для арганізацыяў ды ініцыятываў. Аб’ядноўвае супольнасць вакол нефармальнай адукацыі, працы з моладдзю і падлеткамі, інтэлектуальных гульняў, культурніцкіх праектаў і грамадзянскіх ініцыятываў.

→ ЗМЕСТ

Тут рэгулярна адбываюцца лекцыі, дыскусіі, трэнінгі, клубныя сустрэчы, адукацыйныя і культурніцкія імпрэзы. Штогод на пляцоўцы ладзяцца некалькі соцень падзеяў, што наведваюцца тысячамі ўдзельнікаў з Польшчы ды іншых краінаў Еўропы. За 2025 год зладзілі 940 імпрэзаў, куды завіталі каля 14 000 удзельнікаў. Пры хабе дзеюць адукацыйныя і культурніцкія праграмы, у тым ліку Беларуская музычная школа, падлеткавы клуб Wyspa, клуб «Што? Дзе? Калі?», супольнасць беларускага кіно «Кінакола», Філасофскі клуб, валанцёрскія ініцыятывы падтрымання палітвязняў. Прастора таксама служыць рэальным хабам для грамадскіх арганізацыяў і ініцыятываў, прапаноўваючы каўоркінг, рэсурсы і падтрыманне для развіцця праектаў.

Больш інфармацыі: byhub.org

## БЕЛАРУСКАЯ РАДА КУЛЬТУРЫ

Супольнасць экспертаў, менеджараў і творцаў, што з 2020 года працуе над адбудовай і развіццём экасістэмы беларускай культуры ва ўмовах рэпрэсіяў ды эміграцыі культурніцкіх дзеячаў. Некамерцыйная дабрачынная арганізацыя, мае праваабарончы статус. З 2022-га рэалізуе буйную праграму падтрымання беларускай культуры Art-Power Belarus на фінансаванне Еўрапейскага Звязу.

Дзейнасць скіраваная ў прыватнасці на тое, каб адбудоўваць культурніцкую эканоміку і супольнасць; ствараць новыя механізмы падтрымання творцаў, арт-менеджараў і культурніцкіх ініцыятываў; адвакатаваць важнасць культуры як фактару сацыяльнага развіцця і ідэнтычнасці беларусаў; аналізаваць, даследаваць інфармацыйную працу і прасоўваць беларускую культуру на міжнароднай арэне.

Больш інфармацыі: byculture.org

## «БУДЗЬМА БЕЛАРУСАМІ!»

Дзейнасць грамадска-культурніцкай арганізацыі, што паўстала ў 2008 годзе, скіраваная на паглыбленне нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў ды папулярызацыю беларускай мовы і сучаснай культуры. Адзін з кірункаў – медыі і асвета праз інтэрнэт-старонку, дзе асвятляюцца падзеі і трэнды ў беларускай культуры.

За час існавання «Будзьма беларусамі!» зладзіла некалькі сотняў імпрэзаў з удзелам літаратараў, музыкаў, мастакоў, у тым ліку партнёрскія праекты з творчымі

супольнасцямі і культурніцкімі арганізацыямі, а таксама стварыла шырокую сетку менеджараў і экспертаў.

Больш інфармацыі: budzma.org

## GRONKA

Краўдфандынгавая платформа, створаная для падтрымання ідэяў і праектаў беларускіх аўтараў, творцаў і ініцыятываў: ад кніг і падкастаў да адукацыйных ці культурніцкіх праектаў. Дае магчымасць сабраць фінансаванне беспасярэдне ад аўдыторыі без складаных бюракратычных працэсаў. Запушчаная ў ліпені 2024 года, платформа ўжо дапамагла рэалізавацца шэрагу беларускіх праектаў.

Больш інфармацыі: gronka.org

## ДОМ ТВОРЦАЎ

Ініцыятыва заснаваная ў 2021 годзе з мэтаю падтрымаць і рэабілітаваць беларускіх мастакоў у эміграцыі і Беларусі ды спрыяць іхнай творчай рэалізацыі. Пазіцыянуецца як месца для ажыццяўлення новых праектаў, дзе творцы могуць развівацца, аднаўляцца і абменьвацца досведам у асяроддзі бяспекі і падтрымання. Ладзіць мастацкія, тэатральныя і музычныя рэзідэнцыі, выставы, спектаклі, канцэрты, псіхалагічныя трэнінгі і майстар-класы.

Больш інфармацыі: domtvorcau.com

## КВАТЭРА 27

Івэнт- і арт-прастора, якую выкарыстоўваюць для падзеяў, фота- і відэаздымак, майстар-класаў.

Больш інфармацыі: instagram.com/kwatera.27

## КЛУБ БЕЛАРУСКІХ МЕЦЭНАТАЎ

Супольнасць прыватных донараў, створаная для рэгулярнага і стратэгічнага падтрымання беларускай культуры, адукацыі і грамадскіх ініцыятываў. Працуе як

доўгатэрміновы механізм салідарнага фінансавання, а не разавых збораў. Удзельнікі робяць рэгулярныя ўнёскі, з якіх фінансуюцца культурніцкія і асветніцкія праекты. Кіруецца прынцыпамі празрыстасці, даверу і супольнага прыняцця пастановаў наконт падтрымання праектаў.

Асобны кірунак – вяртанне і захаванне культурніцкіх артэфактаў. Сіламі супольнасці мецэнатаў былі выкупленыя прадметы і архівы з прыватных калекцыяў ці нават тыя, што лічыліся страчанымі. Набытыя артэфакты папулярызуюцца праз лекцыі, выставы, даследаванні.

Больш інфармацыі: miecenat.org

## МЕДЫЯПРАЕКТ «КУЛЬТУРНЫ ФРОНТ»

Спецыяльны праект медыярэсурсу Reform.news, што стала піша пра беларускую культуру. Сярод мэтаў – у тым ліку аналіз і фармаванне ландшафту культурніцкіх падзеяў у Польшчы. Рэдакцыя асвятляла працу фестывалю беларускіх фільмаў Bulbamovie ў Варшаве, Фестывалю абуджаных Tutaka на Беласточчыне, супольных выставачных праектаў беларускіх ды польскіх мастакоў і куратараў ды іншых падзеяў. Асобны праект – серыя відэарэпартажаў «Артэфакты. Музей Вольнай Беларусі» аб прадметах, што захоўваюцца ў калекцыі музею. Медыя выступіла інфармацыйным партнёрам літаратурнай прэміі Гедройця, польскага пракату фільму «Пад шэрым небам» Мары Тамковіч, выставачнага праекту Najwyższa forma sztuki ў варшаўскай галерэі Promocyjna. Супрацоўнічае з Музеем гісторыі польскіх габрэяў POLIN.

Больш інфармацыі: reform.news/category/culture

## KШTAŁT

Незалежная беларуская андэграўнд-суполка, што робіць імпрэзы «сваймі рукамі»: найперш канцэрты, але таксама працуе з тэкстамі і візуальнаю культураю. Каманда арганізуе выступы беларускіх музыкаў, часта на незвычайных пляцоўках, дадае ў лайн-ап польскіх артыстаў, шмат увагі надае візуальнай частцы (афішы, шрыфты, святло ў зале) і агульнаму досведу наведвання імпрэзы. Вечары «Кшталт слова» звязаныя з літаратураю, тэкстамі, таксама ладзяцца выставы і праекты ў міждысцыплінарных фарматах.

Больш інфармацыі: instagram.com/kstalt.kstalt

## MIT SPACE

Прастора для імпрэзаў, якая мае сваю праграму падзеяў, а таксама служыць як пляцоўка для культурніцка-адукацыйных сустрэчаў іншых арганізацыяў ды ініцыятываў – ад лекцыяў, канферэнцыяў, майстар-класаў да камерных канцэртаў.

Больш інфармацыі: mitspace.pl

## SEKKTOR

Створаная ў 2022 годзе як Telegram-канал, а пазней і інтэрнэт-старонка, медыяініцыятыва акумулюе магчымасці для беларускіх дзеячаў мастацтва, культуры, грамадскага сектару. Інфармуе пра грантавыя колы, рэзідэнцыі і конкурсы, стажыяванні і праграмы нефармальнай адукацыі. Служыць як агрэгатар абвестак ад міжнародных праграмаў і беларускіх творцаў, культурніцкіх і грамадскіх арганізацыяў.

Больш інфармацыі: sekktor.online

## ФОРУМ КУЛЬТУРНІЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ

Рэгулярная прафесійная пляцоўка для ўзаемадзеяння беларускіх культурніцкіх актараў, сёння яднае больш за 20 арганізацыяў. Дзеіць як прастора для дыялогу і калектыўнага планавання. Падчас сустрэчаў (двойчы на год) абмяркоўваюцца супольныя стратэгіі развіцця і прасоўвання культуры, ладзіцца дыскусія пра фінансаванне і падтрыманне праектаў, ствараюцца супольныя праекты і фарматы супрацы.

Больш інфармацыі: byculture.org/forum-arganizaczyj

## FREE BELARUS CENTER

Цэнтр падтрымання беларусаў, заснаваны ў Кіеве ў 2020 годзе, з 2022-га працуе і ў Варшаве. Ладзіць вялікія публічныя падзеі і збірае вакол іх беларускую супольнасць і польскую аўдыторыю. Флагманскі культурніцкі праект – Hučna Fest у Варшаве, які пазіцыянуецца як спосаб дасягнуць «публічнай бачнасці» беларусаў і паказаць, хто

такія сучасныя беларусы. Адзін з арганізатараў штогадовага беларуска-ўкраінскага Форуму імя Астрожскіх ва Украіне.

Больш інфармацыі: freebelaruscenter.org

### HOŻASPACE

Культурніцкая пляцоўка (каўоркінг), што пазіцыянуе сябе як «прастора вашай ініцыятывы» і рэгулярна ладзіць сустрэчы, курсы, майстар-класы і культурніцкія падзеі (мова, голас, дыкторыка, творчыя заняткі ды іншае). З уласных творчых праектаў – онлайн-мастацкі аўкцыён «Свята будзе!», сродкі з якога скіроўваліся на арганізацыю калядных імпрэзаў і набыццё падарункаў для дзяцей беларускіх сем'яў у вымушанай эміграцыі.

Больш інфармацыі: instagram.com/hozaspace

### ЦЭНТР БЕЛАРУСКАЙ САЛІДАРНАСЦІ

Дапаможны і інтэграцыйны цэнтр, які падтрымлівае асобаў, вымушаных пераехаць у Польшчу праз рэпрэсіі ў Беларусі або вайну ва Украіне. Асноўная місія – сацыяльнае і прававое падтрыманне беларусаў у Польшчы (дапамога ў легалізацыі, юрыдычныя кансультацыі ды іншае), бярэ ўдзел і ў адукацыйных ды творчых праектах, якія спрыяюць захаванню і развіццю беларускай культуры, мовы і мастацкіх практык у эміграцыі. Арганізуе школу, дзе дзяцей навучаюць польскай, беларускай, англійскай мовам, ладзіць творчыя заняткі для дзяцей і дарослых у кірунках музыкі, фатаграфіі ды іншых.

Больш інфармацыі: belaruscenter.eu

## *БЕЛАСТОК І ПАДЛЯШША*

### «АКНО НА УСХОД»

Місія фонду – інтэграваць супольнасці мігрантаў, жыхароў перыферыйных раёнаў, беспрацоўных, а таксама спрыяць добрасуседскім стасункам Польшчы з краінамі Усходняй Еўропы. Праца адбываецца праз сустрэчы, супольныя падзеі,

культурніцка-адукацыйныя фарматы. Частка ініцыятываў арганізацыі арыентаваная на папулярызацыю спадчыны, традыцыяў, мовы і культурнай разнастайнасці рэгіёну, асабліва сярод дзяцей і моладзі.

Больш інфармацыі: onw.org.pl

## БЕЛАРУСКАЕ ГРАМАДСКА-КУЛЬТУРНІЦКАЕ ТАВАРЫСТВА

Адна з найбуйнейшых арганізацыяў беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы, працуе з 1956 года. Займаецца культурніцка-асветніцкаю дзейнасцю – папулярызуе беларускую культуру, традыцыі і гісторыю ў Польшчы, падтрымлівае беларускую мову і культурніцкае жыццё супольнасці. Арганізуе імпрэзы, гурткі і фестывалі, як Агульнапольскі фестываль «Беларуская песня», ды суарганізуе падзеі, як Музычныя дыялогі над Бугам у Мельніку.

Больш інфармацыі: facebook.com/btsk.zg

## «СТАРАЯ ШКОЛА», ГМІНА ЗБУЧЫН НА МЯЖЫ МАЗАВЕЦКАГА, ПАДЛЯСКАГА І ЛЮБЛІНСКАГА ВАЯВОДСТВАЎ

Ініцыятыва беларускай мастачкі і ілюстраткі Аксаны Гатальскай, якая з камандаю стварае культурніцка-навуковую рэзідэнцыю на базе старой драўлянай школы 1942 года. Будынак месціўся ў вёсцы Бзоў і быў перададзены мясцовымі ўладамі бясплатна з умоваю пераносу яго на іншы ўчастак. Праект мяркуецца як месца для мастакоў і даследнікаў, а таксама для падтрымання асобаў ва ўразлівых сітуацыях – з інваліднасцю і тых, хто пераадольвае залежнасці, уцекачоў, у тым ліку беларусаў і ўкраінцаў. Плануецца шматфункцыйная прастора: майстэрні, студыі – у тым ліку гуказапісу, фотастудыя, сучасных тэхналогіяў, выставачная і канферэнц-зала.

Больш інфармацыі: old-school.pl

## ХАБ «НОВАЯ ЗЯМЛЯ»

Прастора, дзе беларусы могуць бясплатна праводзіць публічныя сустрэчы, грамадскія праекты, адукацыйныя заняткі і культурніцкія падзеі, а таксама карыстацца

памяшканнем і абсталяваннем. Мэта – даць месца і інфраструктуру беларускім ініцыятывам у Беластоку.

Больш інфармацыі: belhub.pl

## ФОНД TUTAKA

Культурніцкая арганізацыя, якая прасоўвае беларускую культуру, у тым ліку яе рэгіянальны варыянт (Беласточчына) для шырокай аўдыторыі ў Польшчы. Флагманскія падзеі – Фестываль абуджаных Tutaka, які рэгулярна адбываецца на Падляшшы, а таксама фестываль «Бардаўская восень» і дэкламатарскі конкурс да Дня роднай мовы.

Больш інфармацыі: tutaka.org

## ФЕСТЫВАЛЬ TUTAKA, ГАРАДОК

Вялікі летні фестываль беларускай незалежнай культуры на Беласточчыне, які праходзіць на паляне Барык каля Гарадка за прыблізна 30 кіламетраў ад Беластоку. Праграма складаецца з канцэртаў, тэатру і перформансаў, кінапаказаў, публічных размоваў і дыскусіяў, варштатаў, асобнай праграмы для дзяцей. Фэст робіцца месцам сустрэчы беларускай дыяспары і беларускай меншасці Польшчы, тут прэзентуюцца НДА і грамадскія ініцыятывы. Прапануе кэмпінг-фармат. У 2025 годзе праводзіўся 5-ы раз, штогод яго наведваюць каля 5 тысячаў чалавек офлайн, а каля 10 тысячаў глядзяць онлайн.

Больш інфармацыі: tutakafest.org

## VILLA SOKRATES, КРЫНКІ

Культурніцка-сацыяльны фонд пад кіраўніцтвам мастака Лявона Тарасэвіча, зарэгістраваны ў 2009 годзе. Падтрымлівае і развівае беларускую, польскую і агульнаеўрапейскую культуру, у прыватнасці захоўвае спадчыну пісьменніка і публіцыста Сакрата Яновіча. Кірункі дзейнасці месцяць падтрыманне беларускіх і польскіх творцаў ды інтэлектуалаў; арганізацыю культурніцкіх сустрэчаў, выступаў, майстар-класаў; папулярызацыю літаратуры, мастацтва і традыцыяў; спрыянне міжнароднай супрацы. Арганізуе даследчыя і архіўныя ініцыятывы ў справе захавання гісторыі ды традыцыяў рэгіёну.

Больш інфармацыі: facebook.com/FundacjaVillaSokrates

### ЦЭНТР БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Ваяводская самакіравальная інстытуцыя культуры, арганізатарам якой выступае Падляскае ваяводства, афіцыйна запушчаная ў 2024 годзе. Галоўная місія – папулярызаваць беларускую культуру ў Польшчы і ўсебакова сацыякультурна развіваць беларускую нацыянальную меншасць. Вядзе мастацкую (канцэрты, фестывалі, конкурсы, выставы), адукацыйную (сустрэчы, майстар-класы, семінары, канферэнцыі), даследчую і архіўна-бібліятэчную (збор бібліятэчных матэрыялаў і дакументаў), выдавецкую і інфармацыйную, інтэграцыйную (інтэграцыя і адаптацыя беларускай дыяспары ў лакальнай супольнасці) дзейнасць. Супрацоўнічае з НДА, інстытутамі культуры, самакіраваннямі і замежнымі партнёрамі.

Больш інфармацыі: ckb.bialystok.pl

## *КРАКАЎ*

### БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «КРОК»

Ладзіць культурніцкія падзеі для дыяспары і падтрымлівае беларускія ініцыятывы ў горадзе. Працуе, каб развіваць, захоўваць і прасоўваць беларускую культурную спадчыну ды сучасную культуру, папулярызаваць беларускую гісторыю, спрыяць дыялогу і міжкультурнаму ўзаемадзеянню праз міжнародную супрацу ды інтэграцыйныя праекты. Дзеіць як івэнт-каманда беларускай дыяспары ў Кракаве, ёсць арганізатарам і партнёрам гарадскіх інтэграцыйных імпрэзаў у Кракаве, напрыклад, пікніку Letucień.

Больш інфармацыі: facebook.com/krok.krakow

### ПІКНІК LETUCIEŃ

Бясплатны летні фестываль-пікнік беларускай дыяспары. Адметнасць – фармат мястэчка з некалькімі сцэнамі і тэматычнымі зонамі, дзе можна адначасова слухаць музыку, есці, знаёміцца, браць удзел у майстар-класах і займаць дзяцей. У межах пікніку ладзяцца канцэрты і DJ-сэты на некалькіх сцэнах, фуд-корт з беларускімі

стравамі, кірмаш рамеснікаў, майстар-класы, працуе дзіцячая зона і зона адпачынку. У 2025 годзе фестываль праходзіў 6-ы раз і сабраў больш за 5 тысяч наведнікаў.

Больш інфармацыі: ltcn.pl

# ЛЮБЛІН

## ПРАСТОРА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ DOSWIED

Цэнтр беларускай культуры, які працуе з 2022 года, робіць публічныя культурніцкія падзеі: літаратурныя сустрэчы, размовы, майстар-класы, а таксама тэатральныя і міждысцыплінарныя праекты. Ладзіць літаратурны клуб, сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі, цыклы падзеяў супольна з Універсітэтам Марыі Складоўскай-Кюры ў Любліне, тэатральныя, тэкставыя лабараторыі і паказы на партнёрскіх пляцоўках, сярод якіх – люблінскія інстытуцыі культуры і адукацыі.

Больш інфармацыі: facebook.com/doswied/?locale=mt_MT

# ПОЗНАНЬ

## МУЛЬТЫКУЛЬТУРНЫ ФОНД «ДЗЕЯ»

Ініцыятыва ладзіць канцэрты беларускіх артыстаў у Познані, развівае базу лакальных арт-праектаў, намагаецца злучаць творцаў і нішавыя культурніцкія арганізацыі дзеля паўставання супольных праектаў.

Больш інфармацыі: facebook.com/dziejapl

## PAKOJ_202

Кам'юніці-прастора, дзе ладзяцца вечарыны, адукацыйныя сустрэчы і «выпадковыя івэнты». Фармат працы – кам'юніці + падзеі: сустрэчы, размовы, клубы, майстар--класы альбо партнёрскія імпрэзы.

Больш інфармацыі: facebook.com/Pakoj202

# ТРУЙМЯСТА

## БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРНІЦКАЕ ТАВАРЫСТВА «ХАТКА», ГДАНЬСК

Адна з найстарэйшых беларускіх арганізацыяў на Памор'і, каля 30 гадоў рэпрэзентуе і яднае беларускую супольнасць у Труймясце. Місія – захаваць беларускую ідэнтычнасць, развіваць мову і культуру, а таксама працаваць з мастакамі і навукоўцамі з Польшчы ды Беларусі.

Арганізуе культурніцкія імпрэзы і івэнты для супольнасці: літаратурныя вечарыны, традыцыйныя нацыянальныя святкаванні, выставы, канферэнцыі, фестывалі. Ладзіць сустрэчы з аўтарамі і дыскусіі, звязаныя з прэміяй імя Ежы Гедройця. Наладжвае партнёрства з інстытуцыямі, што дазволіла, напрыклад, адкрыць беларускую паліцу ў Гданьскай бібліятэцы.

Больш інфармацыі: btkchatka.org

## MARAFEST, СОПАТ

Летні музычна-культурніцкі фэст на ўзбярэжжы, які робяць арганізатары з беларускіх асяродкаў у Польшчы. Фестываль-кам'юніці, дзе не толькі адбываюцца канцэрты, але і ствараецца атмасфера супольнай сустрэчы «людзей добрай волі». Праграма залучае разнастайную музыку – ад альтэрнатыўнай да электронікі, часта з дзвюма сцэнамі, дапаўняецца кірмашом і дадатковымі актыўнасцямі. У 2025 годзе ладзіўся 4-ы раз.

Больш інфармацыі: marafest.pl

# ВІЗУАЛЬНАЕ МАСТАЦТВА І ДЫЗАЙН

# Геаграфія гарадоў, дзе жывуць і дзеяць беларускія мастакі, дызайнеры і куратары, пасля падзеяў 2020 года пашырылася імгненна і ў геаметрычнай прагрэсіі. Хіба ў кожным вялікім польскім горадзе сёння можна сустрэць прадстаўнікоў беларускай мастацкай супольнасці.

Паводле куратара з беларускімі каранямі Андрэя Дурэйкі, больш за 70 творцаў візуальнага мастацтва працуюць у Польшчы. Ён жа прызнае, што агульны лік яшчэ больш значны. Эксперт таксама адзначае: не зважаючы на фон рэпрэсіяў і эміграцыі, беларускае мастацтва зазнала вялікую змену на якасным узроўні. Куратарка і арт-менеджарка Вольга Мжэльская пацвярджае: для шмат каго эміграцыя – тут мы кажам галоўным чынам пра эміграцыю пасля 2020 года – зрабілася моцным штуршком у развіцці.

Беларуска Яна Шостак сталася лаўрэаткай узнагароды Paszporty Polityki 2021; Ала Савашэвіч атрымала намінацыю на Paszporty Polityki 2024; беларусы і беларускі бралі ўдзел у адразу некалькіх выставах Warsaw Gallery Weekend 2024 года; Антаніна Сцебур – адна з куратарак выставы O czym wspólnie marzymy? у галерэі Zachęta; фатаграфічны дуэт Kanaplev+Leydik быў залучаныя ў выставу польскай фатаграфіі Oczy moje zwodzą pszczoły Цэнтру сучаснага мастацтва Zamek Ujazdowski; у 2025-м мастачкі і дызайнеркі Kanva, Таша Кацуба і Кацярына Несцяровіч узялі ўдзел у паказе польскай моды East Bound у Бруселі ў межах культурніцкай праграмы з нагоды старшынёўства Польшчы ў Радзе Еўрапейскага Звязу; галерэя Jednostka стала працаваць з фатографкаю Сашаю Вялічкаю. Гэта некаторыя прыклады таго, як беларускія творцы інтэгруюцца ў мясцовую арт-індустрыю.

Спачатку мастакі і мастачкі займалі «намадычную» пазіцыю, але з часам, калі рабілася ясна, што хуткіх пераменаў у Беларусі не будзе, інтэграваліся ўсё больш, і сёння рэпрэзентаваныя ў Польшчы на розных узроўнях – як відаць, у тым ліку на буйных фестывалях, у найвядомейшых польскіх музеях і галерэях ды як аўтары і аўтаркі ўласных прыватных ініцыятываў. Спачатку гэта быў у значнай ступені пратэсны рух, у мастацтве праяўляліся тэмы траўмы, барацьбы з дыктатураю, палітзняволеных, мастацтва магло стацца палітычнаю заяваю, і хоць гэты кірунак ужо не такі актыўны, як у першыя 2–3 гады, ён усцяж істотны.

Для шмат каго з беларускіх мастакоў і мастачак эміграцыя ў Польшчу адкрыла новыя магчымасці, але пакуль прайшло недастаткова часу, каб рабіць высновы пра сапраўдны патэнцыял. Вольга Мжэльская заўважае аднак, што беларускія творцы і куратары ды куратаркі ў Польшчы дасягаюць усё лепшых вынікаў, а частка беларускіх імёнаў робіцца добра пазнавальнымі ў польскім кантэксце.

Паводле Андрэя Дурэйкі, заўважныя тэма вайны Расеі супраць Украіны, фемінісцкі рух, а таксама экалагічнае пытанне. Апошняе цесна звязанае з фальклорам і нацыянальнымі традыцыямі, да якіх звярнуліся шмат якія творцы менавіта за апошнія гады праз патрэбу самаідэнтыфікацыі і самазахавання ў новых абставінах. За час пасля 2020-га выбудавалася больш структураваная сетка кааперацыяў і камунікацыяў, паўсталі інстытуцыі і рэзідэнцыі, што праўда, частка з іх гэтак жа імкліва знікла. Моцна развіўся беларускі куратарскі рэзерв, што паспяхова інтэгруецца ў праекты польскіх пляцовак.

Такую рэпрэзентацыю і прыманне беларускага візуальнага мастацтва, як мяркуе Вольга Мжэльская, складана сабе ўявіць нават у мультыкультурным Берліне, хаця колькасць беларускіх аўтараў у Нямеччыне не нашмат меншая, чымся ў Польшчы. Аднак застаецца вялікі пласт творцаў, якія з розных прычынаў не здолелі дастасавацца да новай рэчаіснасці ды ўпісацца ў кантэкст і па выніку не выходзяць за межы дыяспары.

Менавіта ў візуальным мастацтве пытанне самаідэнтыфікацыі паўстае як найбольш актуальнае: як пры захаванні сённяшняй дынамікі беларускія мастакі і мастачкі, якія паспяхова рэалізуюць сябе ў Польшчы, будуць ідэнтыфікаваць сябе ў будучыні?

# ІНСТЫТУЦЫІ, ПРАЕКТЫ І ІНІЦЫЯТЫВЫ

## *ВАРШАВА*

### АРТ-ПРАЕКТ REVOLUTION

Сучасная міждысцыплінарная культурніцкая ініцыятыва, што выкарыстоўвае мастацтва як інструмент супраць дыскрымінацыі і за правы чалавека, стварае платформу для артыкуляцыі складаных сацыяльна-палітычных тэмаў праз мастацтва за межамі афіцыйных інстытуцыяў. Падтрымлівае творцаў-мігрантаў ды пашырае галасы мастакоў і мастачак, чые працы не могуць быць паказаныя на іхнай радзіме.

Публічныя праекты адкрыта абмяркоўваюць абарону правоў чалавека, правы ўцекачоў і тэму вайны супраць Украіны. Фонд выпускае і прэзентуе кароткія мастацкія фільмы, прысвечаныя падзеям у Беларусі, правам ЛГБТК+, уцекачоў ды іншых групаў; арганізуе выставы і прэм'ерныя паказы з мультымедыйнымі матэрыяламі.

Больш інфармацыі: artprojectrevolution.com

### VARTA

Праект на мяжы культуры і дыджыталу, мэта якога – фіксаваць і дакументаваць выставачныя экспазіцыі з удзелам беларускіх мастакоў і куратараў у фармаце панарамаў 360° для захавання гістарычных момантаў хуткаплынных выставаў, каб з любога пункту свету была магчымасць паглядзець падзеі, у якіх бяруць удзел беларускія творцы.

Больш інфармацыі: instagram.com/varta.digital

### ДОМ БУСЛОЎ

Прастора Вольгі Кардаш, дзе прадаюцца вырабы беларускіх дызайнераў і дызайнерак, у тым ліку самой Вольгі. Тут можна пазнаёміцца з творчасцю мастакоў, дызайнераў мэблі, адзення і аксесуараў з Беларусі, набыць адзенне, біжутэрыю, карціны, а таксама замовіць мэблю паводле наяўных у Доме буслоў узораў. Тут жа адбываюцца культурніцкія мерапрыемствы – майстар-класы і сустрэчы. Раней Вольга Кардаш

мела ўласную краму ў Менску. Адметны сімвал дызайну – бусел, адкуль пайшла назва прасторы.

Больш інфармацыі: instagram.com/house.of.storks.space/

## ZNIVIEN

Беларускі брэнд адзення з нацыянальным характарам.

Больш інфармацыі: znivien.pl

## KANVA

Модны брэнд дызайнеркі Насты Васючэнкі, што быў заснаваны ў Менску ў 2018 годзе, а сёння дзеіць у Польшчы. Праз моду мастачка даследуе культурны код Беларусі і спалучае старажытныя беларускія традыцыі і сімвалы з сучаснай эстэтыкай. KANVA ператварае сімвалы народнага мастацтва ў аксесуары для нашэння і дэкаратыўныя вырабы для дома. Брэнд таксама прадае адмысловы бокс для самастойнага вырабу павука з саломы – вядомага аксесуара ў беларускай народнай культуры.

Больш інфармацыі: kanvakasciume.com

## SALIVA LIVE

Міжнародная онлайн-платформа пра сучаснае мастацтва, працуе як «лічбавы архіў і медыяакно» для выставачных падзеяў, дапамагаючы пашыраць іх аўдыторыю. Выкарыстоўвае інструменты штучнага інтэлекту. Дакументуе і прэзентуе ў фармаце онлайн выставы з розных краінаў, рыхтуе AI-рэзюмэ, AI-апісанні і інтэрв'ю з дзеячамі арт-сцэны. Прымае заяўкі на публікацыю выставачных праектаў. Платформу заснаваў мастак Юра Шуст, рэдактарка – Паліна Шустка.

Больш інфармацыі: saliva.live

## TSUDA

Канцэптуальны модны брэнд з «вясковаю душой» і футурыстычна-сучаснай эстэтыкай. Пазнаецца апсайклінг-вырабамі з вінтажнымі фіранкамі, наіўнымі аздобамі з трактарам – стылізаваным аграрным сімвалам, а таксама адзеннем,

натхнёным вясковым жыццём. Назва паходзіць ад беларускага слова «цуд» і адлюстроўвае пачуццё дзівоснасці, закладзенае ў кожным вырабе.

Больш інфармацыі: tsudaproject.com

### ФШ1: БЕЛАРУСКАЯ ФАТАГРАФІЧНАЯ ПЛАТФОРМА

Незалежная культурніцкая ініцыятыва і інтэрнэт-прастора, прысвечаная беларускай сучаснай фатаграфіі і візуальнай культуры. Праект заснавалі ў Беларусі ў 2016 годзе, дзеяў найперш як школа фатаграфіі, у 2023-м аднавіў працу ў Варшаве. Сёння гэта платформа, асноўная мэта якой – аб'яднаць фатографаў з Беларусі і стварыць прастору ды ўмовы для фатаграфічнай творчасці. Арганізуе сустрэчы, дыскусіі і адукацыйныя захады: лекцыі, майстар-класы і артыст-токі. Будуе супольнасць, дапамагае аўтарам заявіць пра сябе, наладжвае міжнародныя сувязі.

Больш інфармацыі: facebook.com/fsh1minsk/

### «ЭТЫКА»

Праект у стварэнні адзення і аздобаў. Заснаваны ў Менску ў 2020 годзе, з 2023-га працуе ў Польшчы. Канцэпцыя ўстойлівай моды яднаецца з інтэрпрэтаванымі традыцыйнымі беларускімі рамёствамі (вышыўка, ткацтва, вязанне ды іншае) дзеля захавання і прасоўвання беларускай культуры.

Больш інфармацыі: proektetika.com

## *БЕЛАСТОК І ПАДЛЯШША*

### ФОНД MOCHNARTE, МАХНАТАЕ

Арт-пляцоўка і рэзідэнцыя ў Падляшшы ў вёсцы Махнатае (гміна Гайнаўка), каля Белавежскай пушчы і мяжы з Беларуссю. Арганізуе падзеі сучаснага мастацтва і мастацкіх рэзідэнцыяў, збірае калекцыю, супрацоўнічае з беларускімі мастакамі і мастачкамі ды падтрымлівае маладых беларускіх творцаў. Фонд мае ўласную

інфраструктуру: дом перанеслі і змантавалі ў 2022 годзе як частку развіцця сядзібы і прасторы.

Больш інфармацыі: mochnarte.org

# ЛЮБЛІН

## TRZYMAJ

Арт-прастора, месца падзеяў у цэнтры Любліна, якую стварае і вядзе мастачка Віка Калядзюк. Тут адбываюцца выставы, канцэрты, перформансы, танцавальныя і паэтычныя імпрэзы. Пляцоўка падкрэслівае, што не ёсць фондам ці асацыяцыяй і не атрымлівае датацыяў; шмат якія падзеі – бясплатныя, падтрымка часта арганізаваная праз ахвяраванні.

Больш інфармацыі: facebook.com/TrzyMaj22

# ПОЗНАНЬ

## GREY MANDORLA STUDIO

Аўтаномная мастацкая прастора, атэлье, што дзеіць як прастора, кіраваная мастакамі (artist-run space) – творчы хаб і месца сустрэчаў для творцаў, даследнікаў і студэнтаў. Заснаваная мастаком і куратарам Сяргеем Шабохіным, вырасла з патрэбы ў гарызантальнай прасторы для супольных праектаў, выставаў, рэзідэнцыяў і дыскусіяў за межамі традыцыйных інстытуцыяў. Спрые сувязі паміж польскай і ўсходнееўрапейскаю мастацкімі сцэнамі.

Арганізуе персанальныя і групавыя экспазіцыі (напрыклад, Duet Exhibition); ладзіць мастацкія рэзідэнцыі і прэзентацыі для беларускіх ды міжнародных творцаў (Kalektar Residence, PerspAKTIV ды іншае); служыць прастораю сустрэчаў і абмену для супольнасці мігрантаў ды мастацкай супольнасці; узаемадзеіць з мясцовым кантэкстам праз выстаўкі, дыскусіі і калектыўныя сходы.

Больш інфармацыі: studio.gmroom.org

## KUT

Ініцыятыва развівае культуру, мастацтва і супольнасныя практыкі, робячы акцэнт на дыялогу, інклюзіі і міжкультурным абмене, у тым ліку з удзелам беларускай супольнасці. Прастора служыць для абмену досведам і рэалізацыі мастацкіх, крэатыўных праектаў і «лабараторыяў», а таксама для міжнароднай і міждысцыплінарнай супрацы. Важная як лакальны пункт збору ў Познані, забяспечвае бачнасць для культурніцкіх ініцыятываў мігрантаў, падтрымліваючы «нягучныя» працэсы: сустрэчы, адукацыйныя, крэатыўныя фарматы і культурніцкі дыялог.

Больш інфармацыі: kut.ngo

## КЛУБАКАВЯРНЯ «МЫ» (MY)

Супольнасная клуб-кавярня-прастора ў цэнтры Познаню, адзін з «культурніцкіх вузлоў» маладой беларускай дыяспары і яе мастацкага асяроддзя. Ладзіць культурніцкую праграму – сустрэчы з творцамі, выставы, лекцыі, канцэрты, дыджэй-сэты, стэндап; арганізуе майстар-класы для дзяцей і дарослых, у тым ліку па-беларуску; робіцца пляцоўкаю для беларускіх гарадскіх падзеяў; падтрымлівае новыя ініцыятывы. Пазіцыянуе сябе як прастору культурніцкай інтэграцыі ды самаарганізацыі і робіць беларускую прысутнасць у Познані бачнаю.

Больш інфармацыі: instagram.com/my_namiejscu

## KALEKTAR

Даследчая платформа, што архівуе, аналізуе і папулярызуе беларускае сучаснае мастацтва. Створаная з ініцыятывы Сяргея Кірушчанкі, Аляксея Барысёнка і Сяргея Шабохіна. Развіццё пачалося ў 2010-х, як праект фармулюецца ў звязку з ідэяй стварэння музею сучаснага мастацтва ў Беларусі ў будучыні. Намагаецца скампенсаваць дэфіцыт інстытуцыйнага падтрымання і сістэмнай прэзентацыі беларускага сучаснага мастацтва: будуе адкрыты фізічны і віртуальны архіў пра беларускае мастацтва розных перыядаў з фокусам на актуальных тэндэнцыях, фармуе мову апісання і дае пляцоўку для даследаванняў. Падтрымлівае беларускую экспертную супольнасць праз Residence Kalektar у Познані (супольна з прастораю Domie).

Больш інфармацыі: kalektar.org

***

## ALESPUSHKIN.COM

Праект памяці мастака-акцыяніста Алеся Пушкіна, які трагічна загінуў у беларускай турме. У межах ініцыятывы ствараецца і напаўняецца персанальны сайт, алічбоўваецца фонд працаў мастака і распрацоўваюцца камунікацыйныя каналы для сістэмнага захавання, дакументавання і папулярызацыі спадчыны Алеся Пушкіна. Да 60-годдзя мастака каманда зладзіла выставу «Застацца» ў Музеі Вольнай Беларусі ў Варшаве. Вядзецца праца над стварэннем каталогу працаў Алеся Пушкіна.

## АРХІЎ VEHA

Лічбавы архіў беларускай вернакулярнай (аматарскай, або сямейнай) фатаграфіі XX стагоддзя, які збірае і публікуе здымкі, створаныя на тэрыторыі сучаснай Беларусі, з фокусам на матэрыялах да 1980 года. Каталагізуе, апісвае і публікуе алічбаваныя здымкі з прыватных, сямейных архіваў, даследуе і асэнсоўвае «візуальную гісторыю штодзённасці», выдае кнігі і арганізуе выставы ды прэзентацыі. Супрацоўнічае з куратарамі, даследнікамі, студэнтамі ў тэмах самаарганізаваных архіваў, дэкаланізацыі, даследавання беларускага архіву. У супрацы з Цэнтрам беларускай культуры ў Беластоку падрыхтаваў кнігу Ruiny Białorusi, прэм'ера якой адбылася ў 2025 годзе ў галерэі Arsenał у Беластоку.

Больш інфармацыі: veha-archive.org

## MARAMORA

Стартап, сучасная лічбавая прастора – мабільны B2C iOS-дадатак, які карыстальнік можа наладзіць пад сябе, яднае сучасныя творы мастацтва, 5–15-хвілінныя кіраваныя практыкі і практыкаванні, заснаваныя на нейранавуцы, каб мастацтва сталася простай і штодзённай часткай аднаўлення. Ладзіць рэгулярнае рассыланне праз і-мэйл.

Больш інфармацыі: maramora.art

# АЎТАРЫ

## ВАРШАВА

### АБЕРАМОК ВІКТАР

Мастак, візуальны аўтар у графіцы і жывапісе, ілюстратар (напрыклад, у супрацы з часопісам Kontakt) працуе з 3D-інструментамі. Выпускнік Акадэміі мастацтваў у Варшаве. Віктарава творчасць уяўляе сабою запіс досведу сталага перамяшчэння, уцёкаў, жыцця ў складаных умовах, уключна з досведам арышту. Працы мастак успрымае як «мапы» і «сляды» пройдзеных падарожжаў. Лаўрэат конкурсу Generali і варшаўскай Акадэміі мастацтваў Rozwiń skrzydła z lwem. Браў удзел у біенале Bielska Jesień, праект «Продкі» экспанаваўся ў Беларускім доме ў Варшаве.

### АДАМАЎ АЛЯКСАНДР

Міждысцыплінарны мастак і сцэнограф, удзельнік мастацкай групы Shklatar. Працуе ў скульптуры, інсталяцыі, аб'ектным дызайне. Праз эрганамічныя формы, «медычную» эстэтыку, стэрыльнасць і стандартызаваныя прылады даследуе, як клопат, бяспека і «абарончыя» сістэмы могуць ператварацца ў механізмы кантролю.

Сольны праект Hyperrealistic Mother прэзентавалі ў галерэі Szczur у Познані. Сярод групавых выставаў у Польшчы – Szczurołap у варшаўскай галерэі Turnus, AN-7R0P0C3N у Кракаве, Kurs Tuha ў познанскай галерэі Domie, Piasok у Варшаве, When the sun is low – the shadows are long у галерэі Arsenał у Беластоку. Працуе ў тэатры як сцэнограф, сярод зрэалізаваных праектаў – EMMA ў тэатры Komuna Warszawa, Not all of us will go to paradise у Тэатры імя Стэфана Жэромскага ў Кельцах.

Больш інфармацыі: adamau.eu

### АНЁЛАВА КСЕНІЯ

Мастачка і арт-тэрапеўтка. Ключавы доўгатэрміновы праект – Беларускі мартыралог / Martyrology of Belarus як серыя партрэтаў беларускіх палітвязняў на шпалерах, пачатая пасля забойства ў Менску мастака Рамана Бандарэнкі ў лістападзе 2020 года. У межах праекту аўтарка стварыла больш за 1100 партрэтаў. «Беларускі мартыралог» выстаўляецца ў розных краінах Еўропы.

## АРАХОЎСКАЯ ІРЫНА

Фатографка і журналістка, працуе ў сферы візуальнага сторытэлінгу, дакументальнай фатаграфіі і сацыяльна-значных рэпартажаў. Нядаўнія выставы – Sleep Well у галерэі Duży Pokój і на фестывалі Interphoto ў Варшаве, а таксама ў Адкрытых мастацкіх майстэрнях імя Эўгеньюша Гэпэрта ў Вроцлаве.

Больш інфармацыі: arakhouskaya.com

## АТЦЕЦКІ ЯЎГЕН

Фатограф і журналіст, пераважна працуе ў жанры дакументальнай фатаграфіі. Як фатограф супрацоўнічаў з UNDP, UNICEF, Чырвоным Крыжам, сузаснавальнік фоташколы, а цяпер Беларускай фатаграфічнай платформы ФШ1. Сукуратар выставы «BY BOOKS. Беларускія фотапублікацыі з бібліятэкі ФШ1» у Катавіцах, удзельнік Фотафестывалю ў Лодзі. У Варшаве прэзентавалі ягоную фотакнігу «Плошча Перамен» пра падзеі 2020 года.

## АЦЯСАЎ АЛЯКСАНДР

Мастак, скульптар і дызайнер. Працуе з жывапісам і трохмернымі медыямі (скульптура, кераміка). Адзін з выразных тэматычных фокусаў – назіранне за тым, як лічбавае робіцца «сакральным»: у серыі I Believe in the Algorithm разважае пра зліццё веры і тэхналогіяў, як людзі ўсё часцей шукаюць сэнсы і падтрыманне «ў экранах» і алгарытмах. Удзельнік мастацкай рэзідэнцыі дому культуры Dorożkarnia і калектыўнай выставы Cień падчас Моладзевага фестывалю беларускай культуры Kulok у Варшаве.

## БРЫЯН ДАША

Аўдыявізуальная мастачка, рэжысёрка, куратарка. Ейная практыка ўзнікла на скрыжаванні тэатру, перформансу і відэа ды сёння найчасцей увасабляецца ў live-перформансах, кароткіх арт-фільмах, відэакалажах і відэаскетчах. У працах «прымервае» розныя ролі і сцэнары, даследуючы рэпрэзентацыю ў прыватнай і публічнай прасторы, палітыку і цела.

Заснавальніца арт-праекту Revolution – міждысцыплінарнай ініцыятывы, якая праз кароткія фільмы, выставы і майстар-класы гаворыць аб правах чалавека, у тым ліку правы жанчын, ЛГБТК+ і ўцекачоў, працуе з досведам рэпрэсіяў і вымушанай міграцыі. У Польшчы Дашыны працы прэзентаваліся на выставе The Woman Question: 1550–2025 у Музеі сучаснага мастацтва. Таксама арт-праект Revolution разам

з працамі Анастасіі Рыдлеўскай прэзентаваўся на выставе Thrown out of the sea to die у варшаўскай галерэі HOS, дзе Даша выступіла ў ролі куратаркі.

Больш інфармацыі: linktr.ee/dashabrian

## БУРКО-ДЗЕМІДЗЮК АНАСТАСІЯ

Мастачка, якая працуе пераважна з жывапісам і малюнкам. Ейны «ціхі жывапіс» – пра памяць, ідэнтычнасць і культурную прыналежнасць, у працах часта з'яўляюцца кветкі, галінкі, арнаменты, фальклорныя матывы, асабістыя (сямейныя) гісторыі і «візуальныя архівы».

Уладальніца I прэміі Quadriennale Betesda; Гран-пры (ex aequo) III Агульнапольскага мастацкага конкурсу Moje Zakopane; III прэміі European Art Contest. Персанальная выстава «Успаміны на дне сэрца» адбылася ў межах XX фестывалю Otwarte Ogrody ў Мілянуўку, праект Dom Pamięci выстаўляўся ў Гарадской мастацкай галерэі імя Владыслава Замойскага ў Закапаным.

## БУРНАШАЎ ГЛЕБ

Візуальны мастак. Практыка вырасла з дакументальнай і мастацкай фатаграфіі, але паступова перайшла ў тым ліку ў перформанс ды інсталяцыю, мае досвед сцэнографа ў кінаіндустрыі. На Глебаву мову моцна паўплывалі асабісты досвед (хатні гвалт у сям'і, эміграцыя бацькоў) і палітычныя падзеі ў Беларусі.

Адзін з найбольш вядомых ягоных праектаў – інсталяцыя «Рытуал віны і сораму Рэспублікі»: пяціметровая «дошка гонару» з тэлевізарамі, дзе адначасова паказваюцца так званыя пакаянныя відэа беларусаў, якія мастак архівуе як сведчанні гвалту і прыніжэння. Праект ствараўся з восені 2021-га да траўня 2022-га і быў паказаны на фестывалі Месяца фатаграфіі ў Кракаве. Аўтар праекту «Партрэт пратэстоўцаў», сабранага з тысяч здымкаў твараў удзельнікаў беларускіх пратэстаў.

## БУСЕЛ РАЗАЛІНА

Візуальная мастачка, працуе пераважна з керамікаю, дапаўняючы яе гукам, відэа, тэкстам, знойдзенымі аб'ектамі і часам AI-элементамі. Ейная практыка даследуе міграцыю, сацыяльную няроўнасць, калектыўную траўму і найперш – межы фізічных і сімвалічных абмежаванняў, часта праз матывы страты, жалобы, пахавальнай рытуальнасці і рэлігійнай іканаграфіі.

Сярод Разаліных працаў – інсталяцыйныя праекты, дзе керамічныя аб'екты працуюць як «матэрыяльныя сведкі» пераходу: напрыклад, разважае пра пераезд як рытуал развітання і новага пачатку, спалучаючы керамічныя элементы з мультымедыйнымі пластамі. Персанальная выстава Życie w zawieszeniu прайшла

ў Цэнтры мастацтва ў Быдгашчы, брала ўдзел у калектыўнай выставе «Хай зяе» вакол фотаархіву Veha ў галерэі MOS у Гожаве-Велькапольскім.

Больш інфармацыі: behance.net/buselrozalina

## ВАСЮКОВІЧ АЛЯКСАНДР

Дакументальны фатограф і фотажурналіст. Найчасцей працуе з тэмамі правоў чалавека і сацыяльнай несправядлівасці, у тым ліку з гісторыямі пра гвалт, уразлівасць і наступствы канфліктаў. Удзельнік калектыўнай выставы Ales Pushkin. Afterlife у Музеі Вольнай Беларусі.

Больш інфармацыі: vasukovich.com

## БАНЭТ МАРЫЯ АЛЕНА

Міждысцыплінарная мастачка, чыя праца яднае аналагавую фатаграфію, відэа, скульптуру, паэзію і гук. Узмацняе выразнасць, выкарыстоўваючы адначасова гістарычныя фотатэхнікі і сучасныя медыі для інтэрпрэтацыі з'яваў вакол. Стыпендыятка Gaude Polonia; атрымальніца культурніцкай стыпендыі Гданьску і мастацкага гранту маршалка Паморскага ваяводства, стыпендыятка праграмы Каліноўскага ў Варшаўскім універсітэце, атрымальніца мастацкай стыпендыі інстытуту культуры Villa Deciusza.

Праект Moja rzeka выстаўляўся ў Варшаве ў Цэнтры сучаснага мастацтва Zamek Ujazdowski ў Кракаве ў межах фестывалю Kultura na Uchodźstwie і ў Быдгашчы. Праект Zaręczyny z morzem прэзентавалі ў інстытуце Willa Decjusza ў Кракаве.

Больш інфармацыі: maria-bonet.com

## ВАШКЕВІЧ ЛЁША

Мастак, скульптар і майстар манікюру (nail-artist), працуе на мяжы скульптуры, дызайну і перфарматыўнай б'юці-практыкі. Скончыў Акадэмію мастацтваў у Вроцлаве і перанёс скульптурнае мысленне ў «малую форму» – арт-манікюр як матэрыяльную, фактурную інсталяцыю на целе. Заснавальнік праекту і студыі Ugly Nails у Варшаве: ягоныя «брыдкія пазногці» – гэта наўмысна гратэскныя, арганічныя, тэкстураваныя

формы (зубы, карані, «плесня», інсектныя матывы), дзе важная не прыгажосць, а выразнасць і мастацкі жэст.

Больш інфармацыі: uglynails.eu

## ВЯЛІЧКА САША

Міждысцыплінарная мастачка, магістарка радыёфізікі. Практыка разгортваецца на скрыжаванні фатаграфіі, інсталяцыі і новага медыя (new media), часта з выкарыстаннем праграмавання і «тэхналагічнай логікі». Асноўныя тэмы – палітычная эміграцыя, прапаганда, постпраўда, маніпуляцыі, калектыўная памяць і траўма; як медыярамкі і лічбавы шум замяшчаюць рэальныя праблемы і як грамадства жыве з траўматычным досведам. Выпускніца школы сучаснай фатаграфіі Fotografika і стыпендыятка Gaude Polonia.

Ключавы праект – State of Denial – даследуе, як дзяржаўная прапаганда і забаўляльны кантэнт адцягваюць ад невыносных навінаў. Праект паказвалі на міжнародных пляцоўках, у тым ліку ў праграме Les Boutographies (Манпэлье), дзе стаўся лаўрэатам Гран-пры 2025. Сярод узнагародаў – Мемарыяльная прэмія Конрада Пустолы за палітычную крытыку, Прэмія SEEEU за фотарэпартаж Першага Еўрапейскага Месяца фатаграфіі ў Японіі.

## ГАНЧАРОЎ ДАНІЛА

Мастак святла, сцэнограф, працуе з відэа і праекцыямі ў тэатральных і перфарматыўных праектах. У Польшчы залучаны ў беларускае тэатральнае асяроддзе: як мастак святла і праекцыяў бярэ ўдзел у імправізацыйных паказах «Гаральд» ды іншых падзеях Тутэйшага тэатру.

## ГЛУШЭНЬ ЯЎГЕН

Мастак-фатограф, які працуе з аналагаваю фатаграфіяй, а таксама відэа і графікаю. Цікавіцца альтэрнатыўнымі, ручнымі працэсамі, эксперыментуе з канструкцыяй камераў і тэхнікамі друку. У праектах часта з'яўляецца тэма вайны, (не)названых ахвяраў і ўразлівасці чалавека. Напрыклад, серыя Nameless / Bezimienny апавядае пра жыццё і смерць, мір і вайну. Выстава праекту адбылася ў OFFO (Katowice Miasto Ogrodów) у Катавіцах. Браў удзел у выставе Where People and Beasts Wander in the Shadow of the Wall пра памежную сцяну і досвед міграцыі ў Варшаўскай абсерваторыі культуры.

## ГРАБЕННІКАВА ВІКА

Візуальная мастачка, якая працуе найперш з калажам (2D/3D), ілюстрацыяй, а таксама выкарыстоўвае фота, анімацыю ў асобных працах. Queer-fem актывістка і культурніцкая даследніца; у фокусе – цела, рэпрэзентацыя, правы чалавека, кўір-перспектывы і рух да небінарных наратываў гендару. Прайшла рэзідэнцыю ў культурніцкай інстытуцыі BWA Wrocław, брала ўдзел у дыскусійна-прэзентацыйнай праграме TE-RAZ у Бюро выставаў – Фондзе польскага сучаснага мастацтва ў Варшаве.

## ГРЫЦКЕВІЧ КСЕНІЯ

Сучасная мастачка ў жывапісе, скончыла Акадэмію мастацтваў у Кракаве. Ейная мова – найперш фігуратыўны, інтымны жывапіс, дзе даследуе стасункі, ролі ў супольнасці і напружанне паміж уладай, эмпатыяй і клопатам; асобны кірунак апошніх гадоў – тэма голасу і маўчання ды праца з гукам. Сярод персанальных выставаў: Ear Piece у галерэі Wanda ў Варшаве ў межах Warsaw Gallery Weekend, Voicelessness у кракаўскім фондзе-галерэі Piana, Cisza jest głosów zbieraniem у цэнтры мастацтва Galeria EL у Эльблёнгу.

## ЦЕМРА ДАР'Я

Міждысцыплінарная мастачка, якая працуе ў полі канцэптуальнага мастацтва, на мяжы жывапісу і аб'ектнай, скульптурнай працы. Ейны вядомы прыём – «скульптурны жывапіс» з выкарыстаннем гіпсавых бінтоў, павязак як матэрыялу і метафары. Асноўныя тэмы: траўма, памяць, трансфармацыя, ідэнтычнасць, досвед выгнання і палітычнага гвалту; уласны метад апісвае як прастору дыялогу і «аднаўлення», дзе рана не хаваецца, а асэнсоўваецца. Мела персанальныя выставы Lazaret у Музеі Вольнай Беларусі і Fragile / Kruchość у мастацкай галерэі MAD у Познані.

Больш інфармацыі: cemra.art

## ЗАЛУЦКАЯ ВЕРА

Куратарка і каардынатарка праектаў, мастацтвазнаўца і культуралагіня, аўтарка тэкстаў пра сучаснае мастацтва. Рэдактарка часопісу Blok, сузаснавальніца і ўдзельніца ZA*Grupa – супольнасці замежных мастакоў, якія жывуць у Польшчы, а таксама прэзідэнтка фонду GESSEL для Нацыянальнага музею ў Варшаве і фонду GESSEL для Нацыянальнай мастацкай галерэі Zachęta.

Асноўныя інтарэсы – мастацтва Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы ў кантэксце посткаланіяльных даследаванняў. Вучылася ў Ягелонскім універсітэце ў Кракаве, дзе атрымала ступень магістаркі ў інстытуце гісторыі мастацтва.

## KANAPLEV+LEYDIK (ЛЕЙДЗІК ЮЛІЯ І КАНАПЛЁЎ ЯЎГЕН)

Творчы дуэт, працуе з фатаграфіяй і відэа. Практыка ляжыць на скрыжаванні арт--праектаў, камерцыйных і сацыяльных здымак. Узялі ўдзел у вялікім групавым

выставачным праекце Oczy moje zwodzą pszczoły ў Цэнтры сучаснага мастацтва Zamek Ujazdowski ў Варшаве, што паказаў шырокі зрэз сучаснай польскай фатаграфіі.

Больш інфармацыі: kanaplevleydik.com

## КАНДРАЦЕНКА ТАНЯ

Мастачка, чый жывапіс – экспрэсіўны, яркі, на мяжы фігуратыўнага і абстрактнага, з увагай да чалавечых станаў і ўнутранай напружанасці; у новых працах часта асэнсоўвае досвед «памежжа», прысутнасці і адсутнасці, эміграцыі і сучасных сацыяльна-палітычных зрухаў. Удзельніца выставачных праектаў Border Status у галерэі сучаснага мастацтва 101 projekt у Варшаве і Granice obecności ў Borowik Foundation у Варшаве.

## КАРНЕЕНКА МАРЫЯ

Фатографка і сучасная візуальная мастачка. Працуе з фатаграфіяй, відэа і калажам, са змяшанымі медыямі, а таксама з фарматам мак'юмэнтары (mockumentary, псеўдадакументальнага фільму). Шмат увагі надае даследаванням і міфалагізацыі рэальнасці, у тым ліку гарадскому фальклору. Апублікавала фотакнігу Rattus Sapiens. Уваходзіць у каманду Беларускай фатаграфічнай платформы ФШ1.

## КАСТУСІК ПАВАЛ

Мастак, які працуе пераважна ў станковым жывапісе і графіцы, ад алейных палотнаў да графічных працаў. Праходзіў паслядыпломнае навучанне ў Сіракузе (Італія), атрымаў ступень доктара ў Акадэміі мастацтваў у Варшаве. Браў удзел у выставе беларускага жывапісу Tvor.by у галерэі Agart у Беластоку, праграме Noc grafiki ў галерэі Wolno ў Варшаве.

## КІРВЕЛЬ ЯРАСЛАЎ

Мастак, які працуе пераважна з жывапісам, а аўтарскі падыход называе кірвелізмам: малюе тое, што сапраўды цікава; не абмяжоўваецца сродкамі самавыяўлення; не баіцца «быць смешным»; ідзе «як рука павядзе», а не «як у падручніку»; робіць стаўку на яркасць, кантраст і лёгкі зрух ад дакладнай рэальнасці ў бок уласнай візуальнай фантазіі. Персанальныя выставы: Kirvelizm у Акадэміі мастацтваў у Варшаве, «Дошка гонару» ў Музеі Вольнай Беларусі, Kviecień у бары Karma ў Варшаве.

## КЛІП ВОЛЬГА

Куратарка, арт-кансультантка, культурніцкая менеджарка, аўтарка адукацыйных курсаў для арт-менеджараў і мастакоў. У працы падкрэслівае «мост» паміж

мастацтвам і штодзённасцю, працу з недастаткова прэзентаванымі мастакамі, а таксама падтрыманне мастакоў праз ментарства, кансультацыі і праектную працу. Галерэя Olga Klip у Варшаве – уласная галерэйная прастора, дзе Вольга выступае як арганізатарка і куратарка праектаў. Тут быў зладжаны ейны куратарскі праект Żywy Pokój / Living Room. Як экспертка і куратарка брала ўдзел у MigrArt × MSN Day у Музеі сучаснага мастацтва ў Варшаве. Стыпендыятка Gaude Polonia.

## КОПАЧ АРЦЕМІЙ

Мастак, які працуе пераважна са скульптурай і даследуе чалавека праз пластыку галавы, партрэту, з вялікай увагаю да керамічнага працэсу і «рамяства» як часткі выказвання. Студэнт скульптурнай майстэрні Акадэміі мастацтваў у Варшаве, атрымальнік стыпендыі міністра культуры Польшчы за выбітныя дасягненні. Акрамя працы ў «класічнай» скульптуры, мае відэа- і дыджытал-творы (відэаарт, відэаінсталяцыя, камп'ютарная анімацыя). Персанальная дэбютная выстава Bez tytułu / Untitled прайшла ў Цэнтры сучаснага мастацтва Zamek Ujazdowski ў Варшаве. Удзельнік групавых экспазіцыяў Sztuka, pamięć, człowieczeństwo – выставе студэнтаў і выкладнікаў Акадэміі мастацтваў у Варшаве і Лодзінскай кінашколы, студэнцкага біенале малой скульптурнай формы ў Познані.

## КОПАЧ ВІКТАР

Скульптар. Ягоная практыка – перадусім манументальная і публічная скульптура (камень, мармур, граніт, бронза), з тэндэнцыяў ад фігуратыўнасці ў «камерных» працах да больш абстрактнай, прасторавай формы ў вялікіх аб'ектах. Удзельнік дзясяткаў міжнародных скульптурных сімпозіумаў, біенале і конкурсаў. Ягоныя працы ў Польшчы былі прэзентаваныя на выставах Скульптуры Высоцкага і Копача ў гатэлі Sofitel Grand Sopot, на біенале Laboratorium Rzeźby ў варшаўскім пражскім цэнтры Koneser, у галерэі Młociny, на Выставе варшаўскай скульптуры ў доме мастака Plastyka, Zbrylenie ў варшаўскай галерэі DAP. Удзельнік Варшаўскага мастацкага кірмашу EXPO XXI.

## КОТ-ЗАЙЦАЎ АЛЯКСАНДР

Працуе на скрыжаванні музыкі і фатаграфіі, візуальнага мастацтва, аўтар фотапраекту DOM пра досвед дому / бездаму, памяць і ідэнтычнасць у эміграцыі. Праект спачатку існаваў як фотакніга DOM, але пасля падзеяў 2020-га і пачатку поўнамаштабнай вайны ва Украіне аўтар вярнуўся да яго як да гісторыі, якая сталася масавай і калектыўнай для тысяч беларусаў. Выставы праекту праходзілі ў Варшаве, Вроцлаве, Вільні.

## КУЗЬМІЧ ВОЛЬГА

Ілюстратарка і аніматарка. Ейная мова – «плакатна-ілюстрацыйная» графіка і анімацыя. Стварае візуальны кантэнт для кніг, а таксама мабільных праграмаў, рэкламы і гульняў.

## МАІСЕЙ РАМАН

Мастак і фатограф, сябра Звязу польскіх мастакоў (ZPAP); супрацоўнічаў з галерэямі 101 Projekt у Варшаве і Yegorov у Кракаве, цяпер супрацоўнічае з варшаўскаю галерэяй Xanadu. У жывапісе працуе як станковы мастак; у фатаграфіі развівае і аналагавы, і лічбавы кірункі: ад ранняй стужкавай практыкі і самастойнага праяўлення да сучаснай працы з сярэднім фарматам 6×6, а таксама вулічных, рэпартажных і пастановачных здымкаў.

Браў удзел у калектыўных выставах ZPAP у Варшаве, як Салон секцыі жывапісу Magia światła. З апошніх прафесійных дасягненняў у фатаграфіі – узнагароды ў міжнародных конкурсах 1839 Awards, Black & White Photography Awards, LensCulture.

Больш інфармацыі: romaisei.com

## МАСЛЁНЧАНКА ЛІЗА

Куратарка і камунікацыйная стратэгіня, а таксама PR-менеджарка ў культуры, фрыланс-журналістка і аўтарка тэкстаў пра сучаснае мастацтва. Магістарка мастацтваў пры Варшаўскім універсітэце. Каардынатарка выставачных праектаў – напрыклад, выставы Demonstracyjna mimikra: 7 filmów w piwnicy Сяргея Шабохіна ў доме культуры Staromiejski ў Варшаве. Разам з Blau Studio – аўтарка праекту Blau Map, лічбавага праваднiка і «сеткі месцаў», складзеных на падставе размоваў з мастакамі і арт-практыкамі.

## МЖЭЛЬСКАЯ ВОЛЬГА

Куратарка, арт-менеджарка і культурніцкая менеджарка. У практыцы робіць акцэнт на працы з супольнасцямі, перасячэнні мастацтва з палітыкай і фемінізмам, а таксама на інтэграцыі беларускіх мастакоў у польскае асяроддзе. Вядзе Instagram-відэапраект Little Hedonist пра сучаснае мастацтва і жыццё ў выгнанні. Куратарка выставы Rewilding: the Breath of Creeping Shadows пра экалогію, адчувальнасць і «аднаўленне сувязі» з прыродай у межах Warsaw Gallery Weekend у галерэі BWA Warszawa.

Сукуратарка выставы Oniryczna rzeczywistość у Emi_Art_Warsaw. Рабіла куратарскую працу і экскурсіі ў межах выставы «Дом, у якім разлятаюцца сцэны. Паміж двума імгненнямі» Ігара Цішына ў Музеі Вольнай Беларусі. Сузаснавальніца праграмы Język Kultury на скрыжаванні культуры, камунікацыі і супольнасцяў,

а таксама ініцыятывы Dyslexia Community, прысвечанай дыслексіі і асветніцкаму падтрыманню людзей з дыслексіяй. Атрымальніца мастацкай стыпендыі Варшавы.

## МІШУК МІХАСЬ

Мастак, які працуе на скрыжаванні жывапісу і вулічнага мастацтва. У жывапісе развівае серыю ландшафтаў у выгнанні і піша ў тым ліку настальгічна-іранічныя гарадскія краявіды (Менск і памяць пра Менск), а ў стрыт-арце вядомы ягоны персанаж Вадалаз (папяровыя фігуры, якія «ўзаемадзеюць» з гарадскою прасторай і рэагуюць на падзеі). Працаваў у сферы кіно, прадакшану і як мастак-пастаноўшчык. У межах беларускай экспазіцыі на Фотафестывалі ў Лодзі ў 2023 годзе паказвалася серыя Міхасёвых малюнкаў, звязаных з турэмным досведам.

## МУЖАВА ЯЎГЕНІЯ

Фатографка і мастачка. Працавала як камерцыйная і фэшн-фатографка, робіць мастацкія партрэты і канцэптуальныя серыі; апошнія гады паралельна развівае сябе ў абстрактным жывапісе (акрыл на паперы). Вядомая праца – We Are Not Meat, адна з пераможцаў у міжнародным конкурсе і выставе плакатаў White–Red–White. Экспанавалася ў гарадской прасторы Варшавы.

## МУЖАЎ КАНСТАНЦІН

Міждысцыплінарны мастак, працуе са скульптураю, перформансам і відэа (таксама сустракаюцца жывапіс, аб'екты). Аўтар мінімалістычных скульптураў і перформансаў, дзе сутыкае цялеснае і сацыяльнае ды часта працуе з тэмаю межаў і абмежаванняў ды ўнутранага супраціву ім. Зрэалізаваў перформансы Cast Iron ля помніку Капернікy ў Варшаве, Sklep у Музеі Вольнай Беларусі. Удзельнік групавога праекту Connected Art #2 у ZannartStudio ў Варшаве.

## ОСІПАЎ МАКСІМ

Жывапісец, вядомы найперш працамі ў жанры маляваных дываноў – маляванак. Гэта вялікія наратыўныя «палотны-дываны» з арнаментальнаю рамкаю, сіметрыяй і наўмысна «простай» (фолкавай) перспектывай, але з сучаснымі сюжэтамі і востраю сацыяльнай оптыкай. Стыпендыят Gaude Polonia. Персанальная выстава I can explain everything / «Я магу ўсё патлумачыць» прайшла ў галерэі Нацыянальнага цэнтру культуры Kordegarda ў Варшаве.

## ПАЛЯКОВА КАРАЛІНА

Візуальная мастачка, фатографка і відэамэйкерка, якая працуе з фатаграфіяй, відэа і калажам. Ейныя калажныя серыі, у тым ліку Miejskie kolaże / «Гарадскія калажы», пабудаваныя як «перамантаж» памяці і візуальнага досведу Усходняй Еўропы: фрагменты аўтарскіх здымкаў злучаюцца ў новую рэальнасць, падобную да сну.

Працуе з музыкай і відэа – стварае кліпы для беларускіх музыкаў і праекты на мяжы візуальнага і гукавога. Запусціла ўласную дызайн-ініцыятыву – брэнд «Бессмертна» / bsmrtna – і сталася сузаснавальніцай ды ўдзельніцай жаночага хору эмігрантак Spievy, у рэпертуары якога – традыцыйныя беларускія песні.

## РАДЗІВОНАЎ АНТОН

Беларускі мастак у жывапісе, графіцы, кераміцы, дыджытале. Працуе найперш з алеем на палатне і вобразамі, якія перадаюць досвед страты, траўмы і надзеі на новы пачатак. Персанальная выстава «Доўгае падарожжа» прайшла ў Музеі Вольнай Беларусі, удзельнік Варшаўскага салону 2026.

## САЛОДКІ ДЗМІТРЫЙ

Мастацтвазнаўца, куратар, лектар, які спецыялізуецца на гісторыі мастацтва, культуры, міфалогіі і этымалогіі. Асаблівае месца ў даробку займае вывучэнне сакральнага мастацтва. Праводзіць лекцыі і аўтарскія экскурсіі ў Варшаве – музейныя туры, тэматычныя лекцыі. Аўтар экскурсійнага праекту пра іканаграфію Раства ў Нацыянальным музеі ў Варшаве і онлайн-цыклу лекцыяў «Больш чым прыгожа».

## САЯПІНА НАДЗЯ

Міждысцыплінарная мастачка, якая працуе ў полі сацыяльна ангажаванага мастацтва. Практыка залучае перформанс, мультымедыя і інсталяцыю, тэкст, малюнак, а таксама метады інтэрв'ю, апытанняў, архівавання, партыцыпатыўных практык і арт-тэрапіі – як спосаб «даць голас» выключаным, уразлівым і траўматызаваным. Зрэалізавала выставу Pokuć у Варшаве, у Narracje #16 у Гданьску брала ўдзел з інсталяцыяй We Were Human. We Longed for Beauty і відэа We Washed Each Other’s Hair.

## СПРЫНДЖУК ІЛЛЯ

Візуальны мастак. Працуе найперш у полі жывапісу, але таксама звяртаецца да новых медыяў, інсталяцыяў і акцыйных практык. Важныя тэмы прысутнасці і ідэнтычнасці, няўпэўненасці і небяспекі, «права быць пачутым», а таксама ўлады і яе ўплыву на сацыяльныя межы. Працы часта апісваюцца як аб'екты-інсталяцыі, што «ўрываюцца» ў прастору і пакідаюць у ёй след. Удзельнік арт-рэзідэнцыі Mochnarte.

Больш інфармацыі: sprindzhuk.com

## СТРАТОВІЧ ЮЛЯ

Міждысцыплінарная мастачка. Працуе з жывапісам, а таксама з інсталяцыяй і кіно і відэа, даследуючы тэмы памяці, ідэнтычнасці і плыннасці часу. Персанальныя

выставы: Last Summer у галерэі і аўкцыённым доме ToTuart у Варшаве, Steel and Water у ToTuart у Варшаве.

Больш інфармацыі: yuliyastratovich.com

## СУМАРАВА-КОПАЧ ДАР'Я

Мастачка, піша пераважна алеем на палатне. У аснове практыкі – сучасны фігуратыўны жывапіс (часта жаночыя вобразы), нацюрморты і матывы штодзённасці. Разважае на тэмы ўнутранага досведу чалавека, пра спажывецтва і рэсайлінг рэчаў. Персанальная выстава Światło прайшла ў Цэнтры імя Яна Новака-Езёраньскага ў Варшаве. «Дынастыя» сталася калектыўнаю сямейнаю выставай у Mit Space у Варшаве – праект аб'яднаў тры пакаленні сям'і Сумаравых і Копачаў. Дар'іны працы прэзентаваныя ў каталогу варшаўскай галерэі Art in House.

## СУРСКІ ЯГОР

Мастацтвазнаўца, дакументаліст і лектар, які працуе з гісторыяй і сучаснасцю мастацтва, а таксама з вуснымі гісторыямі і дакументальнаю наратыўнасцю. Працуе як выкладнік, адукатар, развівае адукацыйныя ініцыятывы. Кіраўнік кансультацыйнага пункту на базе Акадэміі добрай адукацыі, бярэ ўдзел у развіцці суботняй школы для беларускіх дзяцей.

## СЦЕБУР АНТАНІНА

Куратарка, мастацтвазнаўца, даследніца і арт-крытыца. Піша і выкладае актывісцкія практыкі ў сучасным мастацтве, працуе з тэмамі палітычнага перформансу, феміністкай крытыкі, салідарнасці і постсавецкіх кантэкстаў. Куратарка выставы What Are Our Collective Dreams? Global Connections – Abandoned Friendships у варшаўскай Нацыянальнай мастацкай галерэі Zachęta. Удзельніца каманды міжнароднага антываеннага праекту antiwarcoaltion.art. Перамагла ў адкрытым міжнародным конкурсе куратараў: ейную прапанову прызналі найлепшай і абралі ў якасці канцэпцыі выставачнай праграмы transmediale 2027 у Берліне.

## ХЕЛЬДА ЯН

Скульптар і міждысцыплінарны мастак, скончыў Акадэмію мастацтваў у Варшаве, магістр мастацтва і філасофіі. Атрымаў ступень доктара мастацтва ў Акадэміі мастацтваў у Гданьску. Працуе са скульптурай з дрэва, а таксама выкарыстоўвае лічбавыя інструменты (3D/CNC). Адзін з выразных фокусаў – тэма мяжы і памежжа, супрацьпастаўленне сістэмаў і досведу Беларусь – Еўропа. Персанальная экспазіцыя Ramy czasowe адбылася ў Dobre Miejsce ў Варшаве, у Польшчы Янавы працы таксама паказваліся на выставе When the Sun Is Low – The Shadows Are Long / «Калі сонца нізка – цені доўгія» ў галерэі Arsenał у Беластоку.

## ХЛАБА АЛЯ

Мастачка і дызайнерка, працуе на сутыку мастацтва і моды, стварае сучасныя формы, укаранёныя ў казках і фальклорных матывах Беларусі ды іншых культураў. Разглядае адзенне як від мастацтва, які прадугледжвае беспасярэднюю блізкасць і цялесны кантакт з чалавекам. Брала ўдзел у праектных паказах FachLab, а таксама ў майстар-класах і паказах фонду Kraina.

## ШАБЛОЎСКАЯ ЮЛІЯ

Фатографка-дакументалістка і журналістка. Скончыла Акадэмію фатаграфіі ў Варшаве. Ейная мова – сацыяльная дакументальная фатаграфія і доўгатэрміновыя праекты: праз назіранне за супольнасцямі і працаю НДА фіксуе змены ў грамадстве і чалавечыя ўзаемаадносіны. Узначальвала аддзел фатаграфіі на тэлеканале «Белсат» як фотарэдактарка і куратарка візуальнай плыні. Аўтарка адукацыйнага New Home Project – ініцыятывы на мяжы фатаграфіі ды арт-тэрапіі для дзяцей і моладзі з Беларусі і Украіны з удзелам UNICEF Polska. Праект быў прэзентаваны на Фотафестывалі ў Лодзі.

## ШАДКО ЯЎГЕН

Беларускі сучасны жывапісец, вучыўся ва Універсітэце Мікалая Каперніка ў Торуні. Ягоная мова – найперш экспрэсіўны, меланхалічны партрэт. Твары часта «замаскаваныя» або размытыя, скажоныя мазкамі, нібыта закрытыя пластамі фарбы як метафара псіхалагічнай уразлівасці, напружання і нестабільнасці эпохі. Удзельнік супольнай выстаўкі Granice obecności ў Borowik Foundation у Варшаве. Браў удзел у дабрачынных і рынкавых падзеях галерэі Piękna ў Варшаве і Дабрачынным аўкцыёне дапамогі ўцекачам з Украіны і Беларусі.

## ШОСТАК ЯНА

Міждысцыплінарная мастачка і актывістка. Працоўныя медыумы: перформанс, відэа- і інтэрнэт-арт, тэкст і публічныя акцыі. У практыцы «хакуе» сацыяльныя сітуацыі і медыяпрастору, каб уключаць шырокія супольнасці ў размову пра гвалт дзяржавы, салідарнасць, уцякацтва і міграцыю ды правы жанчын.

Nowacy / Nowaks – адзін з ранніх знаных сацыяльна-мастацкіх праектаў у Польшчы, які прапаноўваў змяняць дыскурс пра ўцекачоў праз новую назву ў 2018 годзе. Хвіліна крыку для Беларусі – штодзённы пратэсны жэст, які стаўся адным з самых пазнавальных Яніных дзеянняў у Польшчы і выходзіў за межы арт-сцэны ў грамадскія і медыйныя прасторы.

Лаўрэатка прэміі Paszporty Polityki ў катэгорыі візуальнага мастацтва за спалучэнне мастацтва і актывізму. Сурэжысёрка дакументальнага праекту Miss of Poland / Miss Polonii, адзначанага Doc Lab Poland.

### ШОТ ГАННА

Фатографка. Ейная мова – партрэтная фатаграфія, уважлівая да твару, позірку і псіхалагічнага стану, дзе вобраз чалавека становіцца інструментам размовы пра памяць і ідэнтычнасць. Стыпендыятка Gaude Polonia з праектам «На мяжы памяці» / At the Edge of Memory, які даследуе сямейную гісторыю і гісторыю Заходняй Беларусі на скрыжаванні культураў.

### УРУБЛЕЎСКІ АЛЯКСЕЙ

Скульптар: працуе з бронзаю, каменем, керамікаю, металам, смалою. Вобразны свет працаў часта будуецца на старажытных і сучасных міфах – шумерскіх, антычных сюжэтах ды іх «перакладзе» ў сёньняшні кантэкст, з акцэнтам на пластыку формы і колер як носьбіт дадатковага сэнсу. Сябра Звязу польскіх мастакоў (ZPAP), у межах стыпендыі Gaude Polonia працаваў над скульптурным праектам Ogród, паказаным у 2023 годзе на выставе ў Акадэміі мастацтваў у Варшаве. Удзельнік Фестывалю скульптуры ZPAP у галерэі дому мастака Plastyka ў Варшаве і выставы Zbrylenie.

## *БЕЛАСТОК І ПАДЛЯШША*

### ГРЭСЬ МІХАЛ

Фатограф і культурніцкі дзеяч, звязаны з беларускім асяроддзем Падляшша і Беластоку; працуе як відэааўтар, мантажыст і арганізацыйны каардынатар культурніцкіх праектаў. Ягоная мова – дакументаванне памяці і лакальнай культуры (падляская беларуская вёска, людзі, традыцыя), у тым ліку ў фарматах фота і відэа. Ławoczka – відэадакументальны праект пра захаванне памяці беларускай вёскі Падляшша, зрэалізаваны ў супрацы з Гмінным цэнтрам культуры ў Гарадку яшчэ ў 2013 годзе. Супрацоўнічае з Villa Sokrates, каардынатар працы мастака Лявона Тарасэвіча.

### ТАРАСЭВІЧ ЛЯВОН, ВАЛІЛЫ

Мастак, выпускнік варшаўскай Акадэміі мастацтваў (дыплом у 1984-м), прафесар і выкладнік там жа. Ягоная мова – жывапіс, які выходзіць за межы палатна. Колер і рытм Тарасэвіч часта пераносіць у прастору – на сцены, падлогу, архітэктурныя элементы, ствараючы «палі» колеру і ўражанне поўнага паглынання гледача. У 2001 годзе рэпрэзентаваў Польшчу ў Польскім павільёне на 49-й Венецыянскай біенале з праектам To paint. Лаўрэат прэміі імя Яна Цыбіса (1998), Paszporty Polityki (2000), прэміі ZAiKS у галіне візуальных мастацтваў (2012).

### СЕЛЬВЕСЮК ВАЛЕНЦІ, МАХНАТАЕ

Дзеяч беларускай культуры на Падляшшы: гісторык мастацтва, прадпрымальнік і калекцыянер, ініцыятар і заснавальнік фонду Mochnarte. Выступае як мецэнат і арганізатар ініцыятываў у сучасным беларускім мастацтве і культуры.

### ПЧОЛКА ЛЕСЯ, БЕЛАСТОК

Візуальная мастачка, архівістка і актывістка. Заснавальніца і дырэктарка архіву Veha – незалежнага архіўнага праекту, прысвечанага захаванню і даследаванню штодзённых і сямейных фотаздымкаў ды памяці Беларусі. Персанальныя выставы: BY LAW супольна з мастаком Уладзімірам Грамовічам у Музеі эміграцыі ў Гдыні ў межах праекту Suplement; Weakness Street у Галерэі Гюнтэра Граса ў Гданьску.

Больш інфармацыі: a-lesia.com/

## ВРОЦЛАЎ

### КАНАФАЛЬСКАЯ АЛЯКСАНДРА

Мастачка, выканаўца і візуальная аўтарка, фрыланс-артыстка. Вядомая найперш як майстарка пясочнай анімацыі – аўтарка і выканальніца праграмаў, перформансаў і шоу, якія залучаюць пясочную графіку і жывы паказ выяваў, створаных з пяску на святле.

### КУЗЬМІЧОВА КАЦЯРЫНА

Фатографка. Ейная творчасць даследуе, як нябачныя межы – геаграфічныя, ідэалагічныя і псіхалагічныя – уплываюць на жыццё асобных людзей і супольнасцяў. У цэнтры ўвагі – чалавечыя стасункі, памяць, сістэмы ўлады і пытанні гендарнай ідэнтычнасці. Персанальныя выставы: Betonium у познанскай галерэі Centrala і галерэі MD_S у Вроцлаве; Hiraeth у галерэі MgFoto ў Мысьleніцы і галерэі Vivid у Вроцлаве; Light and shadow: artistic road of Katerina Kouzmitcheva ў Культурніцкім цэнтры Любліна; Limbo ў галерэі фатаграфіі B&B у Бельска-Бялай. Стыпендыятка Gaude Polonia.

### САВАШЭВІЧ АЛА

Сучасная мастачка, якая працуе са скульптурай, інсталяцыяй, відэа і перформансам. Лаўрэатка ўзнагароды Фонду польскага мастацтва ING, Вроцлаўскіх мастацкіх узнагародаў, была намінаваная на прэмію Paszporty Polityki. Скончыла Акадэмію мастацтва і дызайну імя Эўгеньюша Гэпэрта ў Вроцлаве; з 2021 года – дактарантка Акадэміі мастацтваў у Кракаве.

Аліна мова – матэрыяльныя, часта манументальныя формы, у тым ліку тэкстыль (лямец). Працуе з «жаночаю» ручною працай як з палітычнаю метафараю, даследуе памяць, ідэнтычнасць, траўму, аўтарытарызм і патрыярхат, а таксама механізмы сацыялізацыі і падзелу працы. Персанальная выстава In the Moon She Stood, Listening to the Wind прайшла ў галерэі Wozownia, Цэнтры польскай скульптуры ў Ароньска.

Больш інфармацыі: alasavashevich.com

### САРЫЧАЎ МАКСІМ

Візуальны мастак і фотажурналіст. Ягоная мова – доўгатэрміновыя праекты на мяжы фатаграфіі, фотажурналістыкі і мастацтва, дзе працуе з тэмамі гвалту з боку аўтарытарнай улады і ў традыцыйным грамадстве, а таксама з палітычным і чалавечым вымярэннем калектыўнай памяці ды гісторыі. Сузаснавальнік онлайн-платформы Shklo пра беларускую фатаграфію і візуальнае мастацтва. Персанальная выстава Blind Spot прайшла ў межах Interphoto ў беластоцкай галерэі Marchand. Удзельнік групавога праекту Politics in Art у Музеі сучаснага мастацтва (MOCAK) у Кракаве і групавой экспазіцыі Long Live Belarus! на Кракаўскім фотафестывалі.

## *КАТАВІЦЭ*

### БЕЛАВЕЦ МАРТА

Мастачка, якая працуе з графікай і ручнымі друкарскімі тэхнікамі, у тым ліку сітадрукам, а таксама скульптураю, часта спалучае плоскасныя і прасторавыя формы. Працуе з сацыяльна-палітычнаю тэмаю, шмат у чым абапіраючыся на асабісты досвед эміграцыі і разважанні пра «мяжу» як пра сімвал падзелу. Скончыла Акадэмію мастацтваў у Катавіцах, ейны дыплом – Granica. Symbole ograniczenia i podziału – увайшоў у выставу między sztuką a ciszą... Granica ў Katowice Miasto Ogrodów. Работу паказалі ў межах 16-й выставы Найлепшыя мастацкія дыпломы (Najlepsze Dyplomy Artystyczne) ў Гданьску ў Zbrojownia Sztuki, а таксама брала ўдзел у выставе працаў катавіцкай Акадэміі мастацтваў у Вроцлаве Stany wyjątkowe.

## *ЛЮБЛІН*

### КАЛЯДЗЮК ВІКА

Візуальная мастачка, перформерка і мультымедыйная творца, працуе з перформансам, мультымедыя, інтэрактыўнымі прасторамі і эксперыментальнымі

формамі выяўлення. Выкарыстоўвае асабісты досвед і сацыяльныя інтэрвенцыі ў прасторы паказаў і падзеяў. Выстаўлялася ў межах Windows'22 з праектам Bądź na bieżąco! у люблінскай майстэрні Otwarta.

# ПОЗНАНЬ

## АРХІПАВА ВОЛЬГА

Мастацтвазнаўца, культуралагіня і куратарка. Доўгі час працавала ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь як вядучая навуковая працаўніца аддзелу сучаснага беларускага мастацтва і куратарка музейнай калекцыі «Беларускі жывапіс». Даследчыя інтарэсы – беларускія мастацкія аб'яднанні, авангард 1980–1990-х, абстрактнае мастацтва, а таксама біяграфіі і спадчына мастакоў XX стагоддзя. Куратарка выставы Białowieża Forest / «Белавежская пушча» ў галерэі Duża Scena UAP у Познані.

## BERGAMOT GROUP

Дуэт Вольгі Маслоўскай і Рамана Трацюка працуе найперш з перформансам, а таксама з відэа, фатаграфіяй і аб'ектамі. Практыка часта закранае тэмы камунікацыі, гвалту, гендару і сацыяльных роляў, а ў шэрагу акцыяў размывае мяжу паміж мастаком і гледачом. Удзельнікі Malta Festival Poznań: акцыя Lot/Flight у фармаце флэш-мобу працавала з тэмамі салідарнасці і калектыўнага перажывання траўмы. Раман Трацюк выкладае ў Акадэміі мастацтваў у Познані.

## ЛУНЁЎ АЛЯКСЕЙ

Візуальны мастак, які працуе з інсталяцыяй, тэкстам і жэстам у публічнай прасторы, калектыўнымі праектамі і тэмаю ЛГБТК+. Практыка часта звязваецца з эмансіпацыйнымі і кўір-наратывамі. Браў удзел у калектыўным мазаічным праекце (Deus) Pluto conservat omnia (разам з Малгажатаю Мыцэк, Раманам Трацюком, Катажынаю Войтчак), паказаным у кантэксце NADA Villa Warsaw у галерэі BWA Warszawa. Разам з Сяргеем Шабохіным зладзіў выставу Queer Tracing Paper у Галерэі Барбары Барыжэўскай у Варшаве. Браў удзел у праектах у Познані, у тым ліку ў выставе Białowieża Forest у галерэі Duża Scena UAP.

## МАКСІМОВІЧ МАРК

Мастак, графік і мураліст, сябра ZPAP. Вучыўся ў Акадэміі мастацтваў у Познані, дзе атрымаў ступень магістра мастацтва. Працуе з муралямі, жывапісам, графікай і выцінанкай; сузаснавальнік Wow Wall Studio – каманды, якая рэалізуе буйныя

публічныя роспісы ў розных гарадах. Сярод праектаў – муралы ў Познані (напрыклад, Świat tańca) і ў іншых гарадах.

### МЕЮМАЕЎ ІЛЛЯ

Куратар, каардынатар мастацкіх праектаў і даследнік культуры, звязаны з дзейнасцю фонду Barak Kultury. Прафесійная і даследчая практыка сканцэнтраваная на праблемах сучаснага мастацтва, міграцыі і функцыянавання мастакоў ва ўмовах вымушанай мабільнасці. Як каардынатар фестывалю Druga Próba дзеліць адказнасць за праграму і развіццё міжнароднай супрацы, у прыватнасці паміж мастацкімі супольнасцямі Беларусі, Украіны і Польшчы. У сваёй працы канцэнтруецца на падтрыманні мастакоў з міграцыйным досведам, дапамагаючы ім рэалізоўваць мастацкія праекты і пашыраць прысутнасць у публічнай прасторы. Выступае таксама як куратар выставаў і аўтар канцэптуальных тэкстаў, спалучаючы арганізацыйную практыку з тэарэтычнаю рэфлексіяй. Яго праца адпавядае тэндэнцыі сацыяльна ангажаванага мастацтва, дзе значную ролю адыгрываюць пытанні ідэнтычнасці, памяці і ўзаемасувязі паміж мастацтвам і палітычным кантэкстам.

### СЦЯЦКО ЛІЗАВЕТА

Куратарка, мастацтвазнаўца і даследніца сучаснага мастацтва, працуе з аналізам выставачных практык, інстытуцыйнаю крытыкай і мастацтвам Усходняй Еўропы. У фокусе ейных інтарэсаў – сучаснае беларускае мастацтва, мастацкія супольнасці ў выгнанні, палітычны і сацыяльны кантэкст мастацкіх працэсаў, а таксама мова куратарскіх і выставачных наратываў. Куратарка выставы Na pamieżžach у галерэі Aula UAP у Познані, а таксама выставы Аляксандра Адамава Hyperrealistic Mother у познанскай галерэі Szczur. Аўтарка крытычных і акадэмічных тэкстаў пра беларускую і цэнтральна-ўсходнееўрапейскую мастацкую сцэну.

## ТРУЙМЯСТА

### ВЕЛЕДЗІМОВІЧ АЛЯКСАНДР, ГДАНЬСК

Фатограф, пісьменнік і выкладчык. Ягоная мова – аналагавая фатаграфія, якая балансуе паміж сімвалічным «па-за часам» і дакументальнасцю. Праз дакладна пабудаваныя кадры, размыванне і падкрэсліванне контуру ды «люстраны» погляд стварае гісторыі, дзе рэальнае і высненае ўвесь час мяняюцца месцамі. Стыпендыят Gaude Polonia, у межах якой стварыў персанальную выставу Utopia ў Беларускім доме ў Варшаве яшчэ ў 2016 годзе. Вынікам удзелу ў Gaude Polonia таксама сталася публікацыя артбуку Aleksiada, натхнёнага сямейнаю легендаю пра Другую сусветную

вайну і інтэрпрэтацыяй сучаснай гісторыі, у тым ліку Варшаўскага паўстання. Персанальная выстава delikatne przesunięcie адбылася ў галерэі Rooms у Гданьску.

## КАЦУБА ТАША, ГДАНЬСК

Мастачка і дызайнерка адзення, працуе на мяжы моды і сучаснага мастацтва. Ейная мова – тэкстыль, касцюм, маскі і «мяккая зброя» як мастацкі каментар да гвалту і палітычнай рэальнасці; асабісты досвед ператварае ў публічнае выказванне. У 2021 годзе заснавала брэнд @katsuba.clothes.

Персанальная выстава 209 Days of Grey адбылася ў галерэі Promocyina ў Варшаве. Перформанс Nawet o tym nie myśl быў у праграме падзеяў Фонду польскага мастацтва ING, спадарожных Warsaw Gallery Weekend 2024. Як аўтарка касцюмаў брала ўдзел у перформансе Kwitnący świat Chthulucenu, што паўстаў у межах праграмы «Крытыкі палітычнай». Брала ўдзел у праектах, рэалізаваных на сцэне Драматычнага тэатру ў Варшаве, Сучаснага тэатру ў Вроцлаве, тэатру GOЯKI ў Берліне. Ташыны праекты і калекцыі адлюстроўваліся ў Vogue Polska.

## РЫДЛЕЎСКАЯ АНАСТАСІЯ, ГДАНЬСК

Мультыдысцыплінарная мастачка, музыка і філалагіня. Ейная мова – жывапіс, тэкст, аб'ект (маска), інсталяцыя і перформанс, дзе асабісты досвед ператвараецца ў міфалогіі і вобразныя сістэмы. У фокусе – псіхічная нестабільнасць, траўма, памяць, небінарная самаідэнтыфікацыя і досвед жыцця ў апрыёры ўціскальных сістэмах. Персанальныя выставы: I had a dream, but I wasn't sleeping у KarowaGallery ў Варшаве і The Sun Is Shining Strange Today Again у Музеі Вольнай Беларусі. Атрымальніца стыпендыі для творцаў самакіравання Паморскага ваяводства і стыпендыі Gaude Polonia.

## САНДРАС НІКА, ГДАНЬСК

Мастачка, блогерка, выкладніца і актывістка. Ейная мова – эмацыйны жывапіс і малюнак, дзе асабістае перажыванне і «пачуццёвы дзённік» робяцца публічным выказваннем; паралельна працуе з адукацыйнымі і сацыяльнымі фарматамі. Як культурніцкая ініцыятарка заснавала ў Гданьску новую пляцоўку – Dom Dzika, дзе ладзяцца выставы, сустрэчы і адукацыйныя падзеі.

Больш інфармацыі: www.nikasandros.com

# ШЧЭЦІН

## ПАЗНЯК УЛАДЗІМІР

Мастак, выкладнік, скончыў факультэт жывапісу і новых медыяў Акадэміі мастацтва ў Шчэціне са ступенню магістра. Ягоная мова – міждысцыплінарная практыка (скульптура, малюнак, перформанс, відэа), працуе з тэмамі ўлады, страху, кантролю і сацыяльнай напружанасці. Лаўрэат стыпендыі міністра культуры і нацыянальнай спадчыны Польшчы ў 2012 годзе; лаўрэат узнагароды Таварыства аўтараў ZAiKS у конкурсе Najlepsze Dyplomy ASP у 2016 годзе.

Персанальныя выставы: Ul Pazniak – When the shit hits the fan у Project Room у Цэнтр сучаснага мастацтва Zamek Ujazdowski ў Варшаве ў 2016 годзе; Uladzimir Pazniak – My po prostu zdechniemy, a oni pójdą do nieba ў CSW Kronika ў Бытаме ў 2021 годзе. Удзельнік калектыўнага выставачнага праекту Traumy wojny ў Нацыянальным музеі ў Шчэціне.

# ЗАХАВАННЕ СПАДЧЫНЫ. ГІСТОРЫЯ І ПАМЯЦЬ. МОВА

III

## Спадчына, гісторыя і мова праз сваю сутнасць аказаліся найбольш палітызаванаю сфераю беларускай культуры ў эміграцыі, бо прапануюць падыход да ідэнтычнасці і палітыкі памяці, які шмат у чым супярэчыць палітычнаму курсу сённяшняга афіцыйнага Менску.

Паводле дырэктара Беларускага інстытуту публічнай гісторыі Аляксея Ластоўскага, менавіта гістарычная сярод усіх акадэмічных дысцыплінаў у хвалі рэпрэсіяў у Беларусі пацярпела найбольш, пры гэтым каля 80% гісторыкаў, якім больш не знайшлося месца ў Беларусі, на ягонае назіранне, знайшлі прытулак у Польшчы.

Некаторыя прафесары занялі навуковыя пасады ў польскай сістэме адукацыі і навукі, частка гісторыкаў займаецца кароткатэрміновымі навуковымі праектамі ў польскіх універсітэтах, напрыклад, абаронаю дактаратаў, некаторыя, на жаль, не захавалі магчымасці займацца гісторыяй як прафесіяй.

Шмат якія стыпендыяльныя праграмы, што існавалі для беларускіх навукоўцаў з 2020 года, з часам згортваюцца (пры гэтым прапанова з боку Расеі стабільна застаецца высокая), у выніку экспертам даводзіцца альбо ўбудоўвацца ў замежны кантэкст, альбо заставацца з нічым. Пры гэтым, хаця беларуская гістарычная навука ў эміграцыі захоўвае афіляцыю да беларускай праблематыкі, непазбежна адбываецца змяшчэнне фокусу і спробы пагадзіць свае веды з новым навуковым кантэкстам.

Тым часам запыт на гісторыю, зварот да спадчыны, беларускую мову ў часе маштабнай эміграцыі аказаўся прадказальна высокі: людзі намагаюцца зразумець сваё месца ў свеце і гістарычнае мінулае ў звязцы з еўрапейскім кантэкстам. Аднак уяўленне пра незалежную беларускую гістарыяграфію ў эміграцыі, здольную ствараць эфектыўны контрнаратыў ідэалагізаванаму прачытанню гісторыі, Аляксей Ластоўскі называе наіўным праз прагматычныя чыннікі: перш за супольную місію для гісторыкаў паўстае пытанне індывідуальнага выжывання і адаптацыі.

Аднаю з пляцовак, якія яднаюць беларускіх навуковых дзеячаў у Польшчы, стаўся Цэнтр беларускіх студыяў пры Варшаўскім універсітэце. Тут працуюць больш за 10 беларускіх гісторыкаў, дзеіць заснаваная прафесарам Андрэем Вардамацкім Беларуская аналітычная майстэрня, штогод супрацоўнікі выпускаюць Гадавік Цэнтру беларускіх студыяў.

У Польшчы ж заснавалі Беларускі інстытут публічнай гісторыі, што на сёння яднае каля 20 экспертаў з Беларусі. Прапрацоўваецца магчымасць паўстання Беларускага даследчага ўніверсітэту імя Астафея Валовіча, якая залежыць у тым ліку ад палітычнай волі.

Абвостранае пытанне самаідэнтычнасці, якое назіраецца ў беларускай эміграцыі, паспрыяла і паўстанню ініцыятываў для пошуку і захавання спадчыны, а таксама пашырэнню ўжывання беларускай мовы. Апошняе адбываецца ў тым ліку натуральным чынам, асабліва пасля пачатку поўнамаштабнай вайны Расеі супраць Украіны: беларускай мове і беларускамоўным праектам стала надавацца большая вага, тым часам ужыванне расейскай мовы стала час ад часу маркіравацца палітычна.

Пасля ліквідацыі ў Беларусі менавіта ў Польшчы было зарэгістраванае Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны – арганізацыя, што прапагандуе і развівае беларускую мову. Тут жа паўстала новая ініцыятыва – даследчы Інстытут беларускай мовы. З Беларусі ў Польшчу перайшла дзейнасць адукацыйных курсаў «Мова нанова», якія знайшліся ў розных польскіх гарадах з заўважнаю беларускаю дыяспараю. Зноў жа ў некалькіх польскіх гарадах працуюць беларускія школкі і клубы для дзяцей выходнага дня – пераважна за ахвяраванні бацькоў і карыстаючыся з бясплатных памяшканняў ад партнёраў.

Магчымасць вывучаць беларускую мову захоўваецца ў польскіх навучальных установах – напрыклад, у школах і ліцэях Падляскага ваяводства, а таксама ў некаторых універсітэтах, як Варшаўскі альбо імя Адама Міцкевіча ў Познані. Што праўда, інтарэс да вывучэння беларускай мовы ў вышэйшых навучальных установах Польшчы застаецца маргінальны.

У Варшаве дзеіць адна з лічаных беларускіх інстытуцыяў у эміграцыі, якія стала і мэтанакіравана захоўваюць спадчыну: Музей Вольнай Беларусі паўстаў дзеля захавання гісторыі беларускага супраціву, што сёння магчыма толькі за мяжой, і за апошнія гады стаўся мультыкультурнаю пляцоўкай, якая яднае прадстаўнікоў розных відаў мастацтва.

Захоўвае спадчыну і Цэнтр беларускай культуры ў Беластоку альбо ініцыятыва Maldzis, што шукае і выкупляе звязаныя з Беларуссю артэфакты. На сёння гэта кропкавыя ініцыятывы, што адказваюць на адчувальную патрэбу прафесійнай супольнасці пры адсутнасці доступу да беларускіх архіваў ды кантролі над захаваннем спадчыны ў шырокім яе разуменні ў краіне збіраць і захоўваць тое, што адпавядае незалежнаму канону гісторыі альбо нават рызыкуе знікнуць. Наспелая патрэба пакуль не набыла сістэматычнага характару, які вымагае надзейнага партнёрства ў прыватнасці з польскімі інстытуцыямі.

# ІНСТЫТУЦЫІ, ПРАЕКТЫ І ІНІЦЫЯТЫВЫ

## ВАРШАВА

### БЕЛАРУСКАЯ МУЗЕЙНАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ

Платформа для супрацы беларускіх музейных спецыялістаў, даследнікаў, гісторыкаў, культуролагаў і ўсіх, хто працуе са спадчынай. Асобны фокус – на працы ва ўмовах эміграцыі, стратэгічным развіцці, камунікацыі, захаванні культурных каштоўнасцяў ды інтэграцыі беларускай культуры ў еўрапейскі кантэкст. Праект з'явіўся з ініцыятывы Музею Вольнай Беларусі і працуе ў фармаце лабараторыі – праз сустрэчы, сесіі для выпрацоўвання практычных рашэнняў і ўзмацнення прафесійнай супольнасці; прэзентацыі і абмен досведам паміж ініцыятывамі беларускіх музеяў, калекцыяў у замежжы.

Больш інфармацыі: freebelarus.museum/laboratories

### БЕЛАРУСКАЯ ШКОЛА МАСТАЦТВАЎ ІМЯ МІКОЛЫ РАВЕНСКАГА

Адукацыйны праект, заснаваны ў 2022 годзе на базе фонду Volny Chor для падтрымання беларускіх дзеячоў культуры і беларускіх сем'яў у выгнанні. Дзейнасць скіраваная на захаванне і развіццё беларускай культуры, падтрыманне прафесійных беларускіх дзеячоў мастацтва ў вымушанай эміграцыі. У школе працуюць 12 беларускіх настаўнікаў і навучаюцца каля 200 вучняў – дзяцей і дарослых.

Творчыя кірункі: тэатральнае мастацтва, беларуская літаратура, хор, сальфеджыа, фартэпіяна, гітара, скрыпка, флейта, акардэон, вакальны і інструментальны ансамблі. Сярод праектаў – конкурсы мастацкага чытання, рыхтаванне тэатральных пастановак і літаратурна-тэатральных кампазіцыяў, канцэрты, сустрэчы з славутымі кампазітарамі і музыкамі, творчыя летнікі.

Больш інфармацыі: www.shkolaravenskaga.pl/

### БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ ПУБЛІЧНАЙ ГІСТОРЫІ

Аб'яднанне гісторыкаў, палітолагаў, мастацтвазнаўцаў, якое дзеіць на тэрыторыі Польшчы і сваёй мэтай ставіць развіццё нацыянальнай памяці без аўтарытарнай ды ідэалагічнай прызмы. На сёння яднае каля 20 чалавек, рэалізоўвае даследчыя праекты, напрыклад, пра гістарычную палітыку ўладаў Беларусі альбо стан школьных

падручнікаў па гісторыі ў Беларусі, праводзіць публічныя дыскусіі. Развівае інфармацыйныя рэсурсы ў Telegram і на YouTube з у тым ліку арыгінальнымі матэрыяламі на тэму палітыкі памяці, напаўняе беларускую Вікіпедыю. Сёння працуе над стварэннем грамадскіх камісіяў, якія шукалі б паразуменне ў канфліктных гістарычных наратывах, патэнцыйна – супольна з польскімі, украінскімі і літоўскімі экспертамі.

Больш інфармацыі: youtube.com/@BelarusianInstituteofPublicHis/featured

## БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ СПАДЧЫНЫ

Паўстаў з ініцыятывы 15 экспертаў у культурнай спадчыне з Беларусі і беларускіх асяродкаў Варшавы і Вільні. Місія – спрыяць даследаванням, захаванню, рэстаўрацыі і прамоцыі культурнай і прыроднай спадчыны Беларусі, а таксама абмену ведамі і досведам паміж залучанымі ў гэтыя працэсы спецыялістамі з абодвух бакоў беларускай мяжы.

Дзейнасць найперш скіраваная на даследаванне гісторыі архітэктуры Беларусі ў рэгіянальным кантэксце і яе інтэрпрэтацыі як супольнай польска-літоўска-беларускай культурнай спадчыны. Асаблівая ўвага надаецца даследаванню дзейнасці польскіх архітэктараў на тэрыторыі Беларусі ў XIX – першай палове XX стагоддзяў. Важны кірунак дзейнасці – адукацыйныя праекты для асобаў, залучаных і/або зацікаўленых у захаванні культурнай спадчыны на тэрыторыі Беларусі.

## ПРАГРАМА «ВУСЫ СКАРЫНЫ»

Гістарычнае шоу на беларускім тэлеканале «Белсат» папулярна апавядае пра нечаканыя павароты, міфы і белыя плямы беларускай гісторыі. Вядоўца – гісторык Цімох Акудовіч. У 2024 годзе праграму назвалі праектам года ў галасаванні Telegram-канала «YouTube Беларусі».

З верасня 2025 года на «Белсаце» выходзіць працяг праекту – «Сармацкі вус» пра агульную гісторыю Польшчы і Беларусі, якая бярэ пачатак у Польскім Каралеўстве і Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў. Праграма адкрывае забытыя гісторыі, постаці і падзеі, што сфармавалі лёс абедзвюх нацыяў. Вядоўцы – Цімох Акудовіч і Віктар Шукеловіч.

Больш інфармацыі: facebook.com/VusySkaryny

## ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ МОВЫ

Ініцыятыва незалежных навукоўцаў за межамі Беларусі. Працягвае даследаваць беларускую мову і робіць гэта не ў апазіцыю таго, што было зроблена раней. Місія – захаваць і развіваць беларускую моўную прастору. Заданні: даследаваць беларускую мову ў розных галінах, ствараць і пашыраць адукацыйныя ды навуковыя матэрыялы беларускае мовы, ладзіць моўныя кансультацыі і экспертызы. Інстытут актыўна распаўсюджвае веды пра беларускую мову і кантэкст, робіць публічныя матэрыялы і камунікуе з аўдыторыяй праз сацыяльныя сеткі.

Больш інфармацыі: instagram.com/instytutbm?utm_source=ig_web_button_share_sheet&igsh=ZDNlZDc0MzIxNw==

## KASARY

Гурт адраджае традыцыю беларускага мужчынскага спеву. Складаецца з васьмі ўдзельнікаў, сярод якіх – беларускі спявак і музыка Сяржук Доўгушаў. Утварыўся ў 2023 годзе ў Варшаве, усе ўдзельнікі паходзяць з Беларусі.

У рэпертуары, заснаваным на архіўных запісах традыцыйных беларускіх песняў, прысутнічаюць касарскія, застольныя, лірычныя і ваенныя творы. Гурт стаўся лаўрэатам конкурсу Stara Tradycja падчас аднаго з найбуйнейшых польскіх фестываляў традыцыйнай культуры Wszystkie Mazurki Świata. Запісаў поўнафарматны альбом Kasary.

Больш інфармацыі: kasaryband.com

## MALDZIS

Культурніцка-гістарычная ініцыятыва, якая спалучае даследчыя, адукацыйныя і публічныя праграмы, каб падтрымліваць і развіваць беларускую культурную памяць і прысутнасць у грамадскім дыскурсе, асабліва ў эміграцыі. Імкнецца адкрываць, вяртаць і папулярызаваць беларускую культурную спадчыну, працягваючы справу, якую ў свой час пачаў даследнік Адам Мальдзіс: пошук забытых крыніцаў, тэкстаў і постацяў беларускага культурнага поля.

Яднае беларусаў вакол гісторыі, культурных каштоўнасцяў і нацыянальнай ідэнтычнасці, а таксама працуе над лічбавымі і публічнымі праектамі для шырокай аўдыторыі. Ладзіць адукацыйныя, грамадскія і культурніцкія імпрэзы, у тым ліку Maldzis Festival – з дыскусіямі, выставамі і канцэртамі.

Больш інфармацыі: maldzis.world

## МУЗЕЙ ВОЛЬНАЙ БЕЛАРУСІ

Музей займаецца зборам, захоўваннем і вывучэннем гісторыі беларускага супраціву дыктатуры і змагання за незалежнасць. Галоўнай тэмай калекцыі з'яўляюцца прэзідэнцкія выбары ў Беларусі 2020 года і масавыя пратэсты і рэпрэсіі, якія пайшлі за гэтым.

Будынак музея таксама з'яўляецца культурніцкім асяродкам: пляцоўка ладзіць мерапрыемствы агульнамастацкага значэння ў розных фарматах, ад выставаў да кінапаказаў пад адкрытым небам. Штогод на пляцоўцы Музея адбываецца каля 70 падзеяў, якія аб'ядноўваюць творцаў і публіку з розных краінаў.

Больш інфармацыі: freebelarus.museum

## SPIEVY Z-PAD MOSTA

Жаночы хор эмігрантак з Беларусі і Украіны, які выконвае традыцыйныя беларускія спевы і спевы памежных славянскіх тэрыторыяў – Польшчы, Украіны, Літвы. Пачаў збірацца пад Сьвентакшыскім мастом у Варшаве ў 2023 годзе. Рэпертуар складаюць традыцыйныя беларускія песні, якія спявалі жанчыны падчас паганскіх абрадаў і рытуалаў.

Місія суполкі – захаваць і папулярызаваць беларускую мову і традыцыйныя песні; узаемнае падтрыманне беларускіх жанчын у эміграцыі; правядзенне адукацыйных і тэрапеўтычных імпрэзаў; інтэграцыя культурных традыцыяў Беларусі ў кантэкст памежных краінаў.

Больш інфармацыі: instagram.com/spievy

## ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ

Грамадская арганізацыя, заснаваная ў Беларусі ў 1989 годзе дзеячамі беларускай інтэлігенцыі з мэтай папулярызацыі беларускай мовы і культуры. За гады дзейнасці ТБМ разраслося ў агульнанацыянальную сетку і аб'ядноўвала тысячы сябраў па ўсёй краіне. У 2021 годзе ў выніку масавых рэпрэсіяў арганізацыя была ліквідаваная ў Беларусі. Адноўленая ў 2023 годзе ў Польшчы і сёння працягвае сваю місію па папулярызацыі беларускай мовы і культуры ў Польшчы ды іншых краінах свету.

Больш інфармацыі: tbmskaryny.com

### «ТРАДЫЦЫЯ»

Беларуская культурніцка-асветніцкая этнакампанія, якая працуе ў сферы традыцыйнай культуры і нематэрыяльнай спадчыны. Выступае як платформа для захавання, пераасэнсавання і актуалізацыі беларускай традыцыйнай культуры ў сучасным грамадскім і культурным кантэксце.

Папулярызуе беларускую народную культуру (спевы, абрады, танцы, рамёствы); арганізуе канцэрты, фестывалі, майстар-класы, этнаграфічныя імпрэзы і адукацыйныя праекты; падтрымлівае і развівае аўтэнтычныя формы традыцыі, спалучае іх з сучаснымі фарматамі падачы. Супрацоўнічае з фальклорнымі гуртамі, даследнікамі, музыкамі і культурніцкімі інстытуцыямі.

Больш інфармацыі: tradycyja.com

### ШКОЛА БЕЛАРУСКАЙ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ETHNO.ART.BY

Адна з місіяў супольнасці – паказаць на ўласным прыкладзе, што традыцыі – гэта сучасна і цікава. Праводзіць штотыднёвыя заняткі па беларускіх народных танцах, спевах, ігры на дудзе; аднаўляе і праводзіць абрады, святы; ладзіць майстар-класы пляцення вянкоў і калядных павукоў, вырабу свечак, выцінанак; арганізуе культурніцкія імпрэзы ў Польшчы і за мяжою (Кракаў, Гданьск, Торунь, Вільня, у Нідэрландах і Аўстрыі).

Больш інфармацыі: instagram.com/ethno.art.by

## *БЕЛАСТОК І ПАДЛЯШША*

### БЕЛАРУСКАЕ ГІСТАРЫЧНАЕ ТАВАРЫСТВА

Грамадская арганізацыя, якая даследуе і папулярызуе беларускую гісторыю і культуру. Заснаваная ў 1993 годзе. Складаецца з прафесійных гісторыкаў, выкладнікаў, настаўнікаў гісторыі, архівістаў, музейнікаў і журналістаў. Мэта – распрацаваць і падтрымаць навуковую і культурніцкую дзейнасць, атрымаць і распаўсюдзіць веды пра гісторыю беларусаў; захаваць і пашыраць веды пра беларускія традыцыі і рэлігійна-культурную спадчыну; спрыяць талерантным міжнацыянальным стасункам у Польшчы.

Дзейнасць: арганізацыя навуковых канферэнцыяў, семінараў, выставаў, моладзевых летнікаў; выдавецкая дзейнасць – выпуск кніг на беларускай і польскай мовах; вядзенне ўласнай бібліятэкі; падтрыманне інтэрнэт-бібліятэкі Kamunikat.org. Сярод праектаў – даследаванне гісторыі беларусаў Падляшша ды іншых рэгіёнаў,

выданне навуковых працаў і часопісу, а таксама праект Nasza Pamięć – пра гісторыю паваенных стасункаў польска-беларускіх супольнасцяў.

Больш інфармацыі:kamunikat.org/bht

## БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЗБОРНІК

Навуковы гістарычны паўгадавік (апошнім часам гадавік), прысвечаны гісторыі Беларусі і беларускага грамадства. Выдаецца з 1994 года ў Беластоку Беларускім гістарычным таварыствам. Прызначаны для гісторыкаў і даследнікаў, але можа быць карысны ўсім, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі і беларускага этнасу.

У выданні друкуюцца артыкулы, камунікаты, біяграфічныя матэрыялы і крыніцы, рэцэнзіі, агляды ды іншыя матэрыялы па гісторыі Беларусі ў шырокім сэнсе, у тым ліку гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і беларускага грамадскага руху. Публікуецца на польскай і беларускай мовах (часам таксама на расейскай).

Больш інфармацыі: kamunikat.org/bzh

## INVICTUS 1863

Клуб гістарычнай рэканструкцыі, дзеіць з 2024 года. Мэта праекту – ажывіць гісторыю, у прыватнасці дух Паўстання 1863 года. Суполка імкнецца да грамадска-асветніцкай дзейнасці, скіраванай на развіццё цікавасці да гераічнай гісторыі, у тым ліку лакальнай. Клуб зарганізаваў і ўзяў удзел у шэрагу імпрэзаў гістарычнага, адукацыйнага і забаўляльнага характару.

Больш інфармацыі: facebook.com/invictus1863

## МУЗЕЙ МАЛОЙ АЙЧЫНЫ Ў СТУДЗІВОДАХ І СТУДЫЯ ФАЛЬКЛОРУ ПАДЛЯСКІХ БЕЛАРУСАЎ ŻEMERWA

Прыватны этнаграфічна-гістарычны музей-скансэн, заснаваны ў 1993 годзе Дарафеем Фёнікам. Сталая экспазіцыя месціцца ў драўлянай хаце (1925) і ў гарадскім доме (1823), перанесеным у 2003-м, ёсць таксама клець (1935). Тут ладзяцца часовыя выставы, майстар-класы па рамёствах, традыцыйных спевах і танцах, выдаюцца кнігі. З 1998-га выдаюць краязнаўчы квартальнік Bielski Hostineć, ладзяць штогадовы фэст Tam po majowoj rosi.

Пры музеі дзеіць студыя падляскіх беларусаў Żemerwa. У яго рэпертуары – пераважна традыцыйныя песні, запісаныя ў мясцовасцях Падляшша і Палесся;

калектыў працуе з арыентацыяй на аўтэнтычны фальклорны спеў і перадачу традыцыяў наступным пакаленням.

Больш інфармацыі: facebook.com/studziwody

### ТАВАРЫСТВА «МУЗЕЙ І ЦЭНТР БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ГАЙНАЎЦЫ»

Грамадская арганізацыя беларускай меншасці ў Польшчы, якая вядзе музейна-культурніцкую дзейнасць у Гайнаўцы (Падляшша). Было створанае ў 1984 годзе з мэтаю захаваць і папулярызаваць беларускую культурную спадчыну – традыцыі, мову, мастацтва. Ладзяцца выставы, імпрэзы і культурніцкія праекты. Мае і захоўвае музейную экспазіцыю і распрацоўвае адукацыйныя ініцыятывы.

Больш інфармацыі: muzeumbialoruskie.pl

### PALATNO

Медыя, якое дапамагае беларусам у Беларусі і ўва ўсім свеце захоўваць нацыянальную ідэнтычнасць. Выпускае ненавінавы кантэнт па-беларуску ў тэкставым, аўдыя- і відэафарматах. У выбары тэмаў рэдакцыя кіруецца наступным падыходам: інфармацыя абапіраецца на факты, адукоўвае і/або забаўляе, дапамагае трымацца беларушчыны.

Больш інфармацыі: Palatno.media

## ВРОЦЛАЎ

### МОЛАДЗЕВЫ КЛУБ РАЗВІЦЦЯ І КУЛЬТУРЫ SPADČYNA

Адукацыйна-культурніцкі клуб для дзяцей і моладзі, які развівае беларускую культурніцкую прастору ў Вроцлаве. Клуб яднае 5 секцыяў – народныя песні, народныя танцы, гісторыя, рамёствы, правы чалавека. Тут спрабуюць новыя фарматы: ладзіліся дыскусійныя клубы, экскурсіі, летнік, стварауся музычны гурт.

Больш інфармацыі: facebook.com/groups/spadczyna

# АСОБЫ

## *ВАРШАВА*

### БАЦЮКОЎ АЛЯКСЕЙ

Гісторык, выкладнік, аўтар газеты «Наша Ніва», часопісаў Arche і «Наша гісторыя». У Беларусі 10 гадоў працаваў дырэктарам Музею гісторыі Магілёва, працягвае займацца беларускаю спадчынай у Польшчы. Аўтар літаратурных твораў і тэатральных пастановак. Тэлежурналіст, відэаблогер. Аўтар кнігі «Магілёўскае цунамі. Даследаванне-фотаальбом».

### ДОЎГУШАЎ СЯРЖУК

Спявак, музыка-мультыінструменталіст, этнограф, выкладнік і арт-менеджар. Заснавальнік культурніцкага руху «Спеўны сход» і ініцыятар праектаў, звязаных з развіццём традыцыйнай беларускай культуры, у тым ліку этнакампаніі «Традыцыя» / Tradycyja, арт-рэзідэнцыі «Дом творцаў», варшаўскага Вольнага аркестру, гурта Kasary. Праца сікраваная на збор, аднаўленне і «ўвядзенне ў жывы ўжытак» беларускай традыцыйнай культуры – не толькі як сцэнічнага фальклору, а як практыкі для супольнасці.

### ЛОБАЧ УЛАДЗІМІР

Гісторык, этнограф, фальклярыст, доктар гістарычных навук. Асноўныя даследаванні прысвечаныя пытанням этнасеміётыкі, міфалогіі прасторы, традыцыйнага культурнага ландшафту, сакральнай геаграфіі, народнай медыцыны беларусаў, этнастэрэатыпам.

Даследуе традыцыйны культурны ландшафт беларусаў, міфапаэтычную карціну свету на розных таксанамічных узроўнях. На беларускім фальклорна-этнаграфічным матэрыяле вывучае сімвалічны статус і рытуальныя функцыі як прыродных, гэтак і антрапагенных элементаў культурнага ландшафту. Тэарэтычна распрацоўвае сімвалічную трансгранічнасць, даследуе сімвалічныя прынцыпы аб'ектывацыі гісторыі з дапамогай элементаў культурнага ландшафту, уласцівыя беларускай этнакультурнай традыцыі. З 2022 года года праводзіць даследаванні ў Інстытуце славістыкі Польскай акадэміі навук у Варшаве.

### ПАШКОВІЧ ВОЛЬГА

Майстрыца этнаграфічных лялек, калекцыянерка, культурніцкая і асветніцкая дзяячка. Выкладае краязнаўства і беларусазнаўства ў Беларускай школе ў Варшаве, дзе вядзе заняткі для дзяцей з 0 да 8 класу паводле ўласна распрацаванай праграмы, створанай

з улікам досведу дзяцей эмігрантаў, іхнага шматкультурнага асяроддзя і патрэбы ў мяккім фармаванні беларускай ідэнтычнасці. Дзейнасць грунтуецца на глыбокім вывучэнні народных традыцыяў, абрадаў і этнаграфіі, а лялька ў ейным разуменні – носьбіт памяці, культурнага коду і сувязі з родам.

Вольжына калекцыя налічвае больш за 120 этнаграфічных і аўтарскіх лялек. Яна стварае і сучасныя аўтарскія працы, у якіх лялька робіцца інструментам асэнсавання ідэнтычнасці, страты, адаптацыі і ўнутранай апоры. За стварэнне калекцыі, а таксама за вялікую колькасць праведзеных выставаў і майстар-класаў Вольгу Пашковіч намінавалі на прэмію «Чалавек года» ў сферы культуры ў Польшчы ў 2024 годзе.

### РАДАМАН АНДРЭЙ

Гісторык, доктар гуманітарных навук па гісторыі (Беластоцкі ўніверсітэт), сябра суполкі літуаністычных даследаванняў у Інстытуце гісторыі Польскай акадэміі навук. Вывучае гісторыю права і дзяржаўнасці Вялікага Княства Літоўскага. Аўтар больш за 80 навуковых працаў. Сябра Літуаністычнай камісіі пры Камітэце гістарычных навук Польскай акадэміі навук. Сябра арганізацыйнага камітэту Беларускага даследчага ўніверсітэту імя Астафея Валовіча. Сябра Беларускага інстытуту публічнай гісторыі.

### РУДКОЎСКІ ПЁТР

Доктар філасофіі, палітолаг. Спецыялізуецца на палітычных трансфармацыях і пытаннях нацыянальнай ідэнтычнасці. У мінулым акадэмічны дырэктар Беларускага інстытуту стратэгічных даследаванняў (BISS). Працуе намеснікам галоўнага рэдактара часопісу Free Belarus Journal.

## *БЕЛАСТОК І ПАДЛЯШША*

### ВАДАНОСАВА КАЦЯРЫНА

Тэлевядоўца, журналістка, паэтка, спявачка, аўтарка і выканаўца музыкі, мультыінструменталістка, акторка, стваральніца традыцыйных і гістарычных касцюмалагічных і тэкстыльных тэхнік, рэканструктарка народных і шляхецкіх строяў, аўтарка выставы Stroj.

У 2025 годзе атрымала ўзнагароды ад Беларускага ПЭНу, тэлеканалу «Белсат» і NDA Group за цыкл аўтарскіх гістарычных тэлепраграмаў «Нітка Зорка» пра гісторыю Беларусі ў кантэксце гісторыі моды. Супрацоўнічае з «Белсатам», арганізацыяй «Будзьма беларусамі!» і Тыкоцінскім аматарскім тэатрам.

### ГРЫЦ МАРЫЯ

Папулярызатарка беларускай культуры. Ладзіць разавыя і сталыя культурніцкія імпрэзы розных кірункаў – традыцыйнай культуры, мовазнаўчыя, краязнаўчыя, дзіцячыя ды іншыя.

### КІРКЕВІЧ АЛЕСЬ

Сцэнарыст, вядоўца, папулярызатар гісторыі, журналіст. Стваральнік YouTube-каналаў «Трызуб і Пагоня», «Сармат», «Смаленне вепрука» (выходзяць на канале «Будзьма беларусамі!»). Адзін з натхняльнікаў Гістарычнага клубу Beer&History ў Беластоку. Аўтар зборніку прозы «Самурай» і ўспамінаў «Сем месяцаў у беларускай турме».

### КУЛЕВІЧ РУСЛАН

Журналіст і краязнаўца. Аўтар кніг «Гісторыі з гродзенскіх вуліц» (2017) і «Горад адзін, успаміны розныя» (2019), «Апошнія сведкі Гродна» (2025). Заснавальнік і галоўны рэдактар выдання Most.

### СУХАНОСІК НАСТАССЯ

Кіраўніца культурніцкіх і медыяпраектаў, рэжысёрка імпрэзаў фонду Tutaka. Акторка тэатру «Прыехалі», вядоўца відэапраекту пра беларускую літаратуру «Смаленне вепрука» (Budzma.org), выкладніца сцэнічнай мовы ў дзіцячай тэатральнай студыі.

## КРАКАЎ

### ХМЕЛЬ НАСТАССЯ

Этнаспявачка і вакальная трэнерка. Кіраўніца гурта этнічных беларускіх спеваў «Лялея» і ўдзельніца гурта Kriwi.

## ТРУЙМЯСТА

### БАРЫШНІКАЎ ЯЎГЕН, ГДАНЬСК

Музыка-мультыінструменталіст, аўтар і выканаўца песняў, дудар, даследнік дударскай традыцыі Беларусі, удзельнік беларускага фальклорнага руху, арганізатар падзеяў ад танцавальных вечарынаў да навуковых канферэнцыяў, аніматар культуры.

## БАРЫШНІКАВА ВОЛЬГА, ГДАНЬСК

Этнамузыкалагіня, спявачка, музыка, выкладніца традыцыйнага спеву, майстрыца народнага строю. Ладзіць лекцыі і майстар-класы па традыцыйным спеве ў Польшчы, Літве, Латвіі. Аўтарка манаграфіі «І даўней так пелі. Музычны фальклор старавераў паўночна-заходняй Беларусі».

# КІНО

# IV

## Услед за найбольшаю хваляю беларускай эміграцыі ў Польшчы знайшла сябе і вялікая частка незалежных кінематаграфістаў і кінематаграфістак. На момант 2020 года беларускія творцы ўжо мелі пэўныя прафесійныя сувязі з польскімі калегамі і прыклады паспяховай супрацы – як дакументальныя фільмы Summa Андрэя Куцілы альбо «Чыстае мастацтва» Максіма Шведа.

Істотная частка дакументалістыкі ўжо тады паўставала дзякуючы тэлеканалу «Белсат», што фінансуецца польскім Міністэрствам замежных справаў («Белсат» працягвае працу, але больш не ў якасці самастойнага тэлеканалу). Некаторыя творцы, якія ў беларускім кантэксце лічыліся шматабяцальнымі, жылі ў Польшчы.

У новай рэчаіснасці разбудаванае беларускае кам'юніці за мяжою сталася адною з крыніцаў тэмаў для рэжысёраў і рэжысёрак дакументальнага кіно, да таго ж Польшча дазволіла здымаць візуальна дакладныя іграваыя фільмы, падзеі якіх адбываюцца ў Беларусі. У выніку больш за палову сябраў Беларускай незалежнай кінаакадэміі – аб'яднання прафесіяналаў, у фільмаграфіях якіх пацверджаны фестывальны альбо пракатны досвед, – дзеяць менавіта ў Польшчы.

Польскія калегі адразу прапанавалі беларусам фарматы супрацы. Да прыкладу, Нацыянальная школа кіно, тэлебачання і тэатру ў Лодзі правяла два наборы на бясплатную гадавую праграму стажыявання, якую прайшлі каля 20 асобаў. Школа Вайды ў Варшаве супольна з Гдыньскаю кінашколаю зладзіла 7-месячны аўтарскі курс Film Bridge – Belarus для 6 адабраных творцаў. За апошнія гады некалькі кінапраектаў з беларускімі каранямі былі падтрыманыя PISF.

Пакуль што самы відавочны поспех такога культурніцкага абмену – фільм «Пад шэрым небам» беларуска-польскай рэжысёркі Мары Тамковіч пра беларускую палітзняволеную журналістку Кацярыну Андрэеву і ейнага мужа Ігара Ільяша (цяпер таксама палітзняволенага). Стужка мела пракат у Польшчы і была паказаная ды

адзначаная шэрагам фестываляў і прэміяў. Пэўныя праекты застаюцца ў працы, іншыя яшчэ толькі бяруць удзел у пітчынгах кінаінстытуту.

Пры падтрыманні польскага бюджэту менавіта ў 2021-м у Варшаве аднавіўся фестываль беларускага кіно Bulbamovie, які некалькі гадоў запар яднаў беларускую і польскую аўдыторыі ды ладзіў сустрэчы з творцамі і каляпалітычныя дыскусіі. У Польшчу перацяклі альбо ў Польшчы з'явіліся некалькі падзеяў, якія ладзіліся альбо ладзяцца беларусамі.

Усё гэта, відавочна, не стварае для аўтараў і аўтарак паўнавартасных умоваў для развіцця альбо хоць у якой ступені справядлівай канкурэнцыі як у Польшчы, так і ў краінах Еўрапейскага Звязу агулам. Хаця кінасферу і дзяржаўнае фінансаванне ў Беларусі ніколі нельга было назваць спрыяльнымі для незалежнага кіно: рэпрэсіўны кантэкст і эміграцыя так ці інакш сталі для фільммэйкераў значным узрушэннем. Кіно як самае дарагое з мастацтваў і мастацтва з доўгаю вытворчасцю сёння для беларусаў – прастора вельмі спарадычных перамог у міжнародным кантэксце, якая вымагае працяглай і не абавязкова паспяховай адаптацыі да актуальных умоваў.

А ўмовы вымагаюць ад фільммэйкераў найчасцей без грамадзянства і, вядома, без грашовага ўнёску «першай краіны» шукаць шляхі для магчымага атрымання фінансавання ў новых для сябе месцах. У выніку шмат якія таленавітыя праекты, што базуюцца на ўнікальным досведзе, так і застаюцца ў сталах. Прастору займае нізкабюджэтнае, безбюджэтнае і кароткаметражнае кіно, а перспектыўныя творцы пераходзяць да тэле- і YouTube-фарматаў.

Поўныя метры беларускіх рэжысёраў і рэжысёрак, што ўсё-такі паўстаюць як вынік прафесійнай капрадукцыі, не ёсць беларускімі паводле вытворчасці. Да таго ж легальны статус беларускіх творцаў часта стварае ўмовы для адціскання аўтарскіх правоў альбо невыканання ўмоваў кантрактаў з боку партнёраў.

Дакументальнае кіно ў сваю чаргу амаль цалкам пазбавілася доступу да здымак у Беларусі, а значыць, і магчымасці паўнавартасна заспець краіну ў адзін з найбольш складаных перыядаў яе гісторыі, а таксама сваёй мастацкай і грамадскай ролі.

У гэтым рапарце згаданыя ініцыятывы, што ўжо набылі сталы характар працы альбо прэтэндуюць на рэгулярнасць, а таксама найбольш заўважныя аўтары і аўтаркі, якія альбо рэалізуюць ідэі ў Польшчы пасля 2020 года, альбо маюць перспектыўныя для беларуска-польскага ды міжнароднага кантэксту кінапраекты і працуюць над іх прасоўваннем.

# ІНСТЫТУЦЫІ, ПРАЕКТЫ І ІНІЦЫЯТЫВЫ

## *ВАРШАВА*

### «БЕЛСАТ DOC»

Аддзел дакументальнага кіно ў межах рэдакцыі «Белсат» Польскага тэлебачання (TVP) – адзіная на сёння незалежная платформа, што рэгулярна стварае беларускія дакументальныя фільмы і тэлерэпартажы. З 2011 года стварыла больш за 150 дакументальных стужак пра беларускую гісторыю, культуру і сучаснасць. Праз YouTube-канал гэтыя гісторыі даступныя для гледачоў ува ўсім свеце.

З «Белсат Doc» супрацоўнічалі і супрацоўнічаюць вядомыя беларускія дакументалісты і дакументалісткі – Андрэй Куціла, Максім Швед, Вольга Воранава (псеўданім) ды іншыя. Фільмы, створаныя рэдакцыяй, былі прэзентаваныя на дзясятках міжнародных і беларускіх кінафестывалях. У 2025 годзе выйшлі рэпартажы і фільмы Юрыя Каліны, Арцёма Лобача, Кшыштафа Капчыньскага, Аляксандра Гарадка ды іншых творцаў. YouTube-канал «Белсат Doc» у 2025 годзе меў 402 тысячы арганічных праглядаў, больш за 70 % з іх – з Беларусі.

Больш інфармацыі: belsatdoc.wordpress.com

### BULBAMOVIE

Кінафестываль упершыню адбыўся ў Варшаве ў 2011 годзе з мэтаю паказваць самае заўважнае беларускае кіно. Заснавальнік і арганізатар Януш Гаўрылюк апісвае характар першых эдыцыяў словамі «андэграўнд, панк, адсутнасць правілаў». Пачынаючы з другой эдыцыі, фестываль займеў конкурс – пераможцы атрымлівалі «Залатую бульбу», «Срэбную бульбу» і «Бронзавую бульбу». Чатыры эдыцыі прайшлі пры падтрыманні Міністэрства замежных справаў Польшчы, яшчэ дзве ладзіліся без дапамогі, а пасля фестываль знік.

Аднавіўся ў часе палітычнага крызісу ў Беларусі і з 2021-га штогод адбываўся ў варшаўскім кінатэатры Iluzjon. У праграму траплялі найноўшыя беларускія стужкі, а таксама ладзіліся рэтраспектыўныя паказы. Апошні раз фестываль адбыўся ў 2024-м пры падтрыманні польскага Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны.

Больш інфармацыі: bulbamovie.wordpress.com

## «НЯМАЯ ЛІХАМАНКА»

Фестываль паказвае нямое кіно з розных краінаў у суправаджэнні жывой музыкі, напісанай альбо зымправізаванай беларускімі і польскімі кампазітарамі. Першая і пакуль адзіная эдыцыя адбылася ўлетку 2025 года пад адкрытым небам у цэнтры Варшавы – у дворыку на Foksal 11.

Ініцыятыва мае на мэце даваць другое жыццё нямым фільмам праз музычнае прачытанне і прапаноўваць гледачам нетыповы досвед спажывання кіно. У межах фестывалю адбыліся паказы фільмаў з Украіны, Польшчы, Нямеччыны і Беларусі. За музычнае суправаджэнне адказвалі Вольга Падгайская, Аляксандра Хмелеўска, Дар'юш Пшыбыльскі.

Больш інфармацыі: instagram.com/niema_goraczka

## «ПАЎНОЧНАЕ ЗЗЯННЕ»

Кінафестываль паказвае незалежныя беларускія фільмы, а таксама кіно краінаў Паўночнай Еўропы, Балтыі і Украіны, да таго ж ладзіць прафесійныя захады для кінематаграфістаў і кінематаграфістак. Штогадовая падзея пачала сваё існаванне яшчэ ў Беларусі, але ў часе палітычнага крызісу стала праходзіць за мяжой і ў фармаце онлайн.

З 2024 года найноўшыя працы беларускіх творцаў і абраныя фільмы з шырэйшай праграмы «Паўночнага ззяння» паказваюцца і ў Варшаве. Тут жа ладзяцца Q&A і дыскусіі з рэжысёрамі ды рэжысёркамі. Фестываль імкнецца стварыць прастору для прафесійнага нэтўоркінгу паміж беларускімі ды польскімі кінематаграфістамі і ў будучыні плануе пашырыць супрацу з польскімі кінаінстытуцыямі і незалежнымі ініцыятывамі.

Больш інфармацыі: northernlightsff.com

***

## БЕЛАРУСКАЯ НЕЗАЛЕЖНАЯ КІНААКАДЭМІЯ

Аб'яднанне беларускіх кінематаграфістаў і кінематаграфістак паўстала за межамі Беларусі ў 2022 годзе і пры ўдзеле Еўрапейскай кінаакадэміі ды нямецкага Міністэрства культуры было прэзентаванае на Еўрапейскім кінарынку Берлінскага міжнароднага кінафестывалю. Штуршком да заснавання сталіся выклікі, звязаныя з масавымі рэпрэсіямі ў Беларусі і эміграцыяй прадстаўнікоў кіно, а таксама пачатак поўнамаштабнай вайны Расеі супраць Украіны.

Беларуская незалежная кінаакадэмія на сёння яднае некалькі дзясяткаў фільм-мэйкераў беларускага паходжання, якія жывуць у розных краінах, перадусім

у Польшчы. BIFA працуе на пашырэнне магчымасцяў беларускіх кінатворцаў, як прыклад – арганізуе прэзентацыю кінапраектаў на Еўрапейскім кінарынку Berlinale. Сябры кінаакадэміі рэпрэзентуюць беларускае кінакам'юніці на міжнародных кінафестывалях і канферэнцыях, праўленне адказвае за адвакацыю правоў і патрэбаў беларускіх фільммэйкераў за мяжою. Разам з 20 іншымі еўрапейскімі арганізацыямі BIFA падпісала дакумент пра заснаванне Федэрацыі кінаакадэміяў Еўропы (FACE).

Больш інфармацыі: belfilmacademy.com

## БЕЛАРУСКАЯ ПРЭМІЯ КІНАКРЫТЫКАЎ «ЧЫРВОНЫ ВЕРАС»

Кінапрэмія закліканая вылучаць і папулярызаваць дасягненні незалежнага беларускага кіно, а таксама матываваць фільммэйкераў і фільммэйкерак заставацца ў прафесіі, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы. Першая эдыцыя абвясціла вынікі ў 2022-м, і з таго часу прэмія адбываецца раз на два гады.

Цырымонія ўзнагароджання другой эдыцыі адбылася на платформе Еўрапейскага кінарынку Берлінскага міжнароднага кінафестывалю, трэці сезон падвёў вынікі ў Варшаве. Прэмія адзначае пераможцаў у 15 намінацыях, а ў журы служаць асобы з сферы кіно – крытыкі і крытыцы, журналісты і журналісткі, даследнікі і даследніцы, знаўцы.

Больш інфармацыі: redheatheraward.com

## BELARUSIAN FILMMAKERS' NETWORK

Ініцыятыва скіраваная на развіццё беларускага кіно і яго прасоўванне ў глабальным кантэксце праз практычную кінаадукацыю, падтрыманне творчай мабільнасці і публічнай бачнасці стваральнікаў кіно ды іхных фільмаў, наладжванне партнёрства ў еўрапейскай кінасферы і адвакацыя інтарэсаў беларускай кінасупольнасці.

Сярод флагманскіх праектаў BFN – рэгулярны БарКэмп беларускіх фільммэйкераў, які адбываецца ў тым ліку ў Варшаве, і Інкубатар мікрабюджэтнага кіно. Адзін з пераможцаў Інкубатару – стужка «Лебядзіная песня Фёдара Озерава» Юрыя Сямашкі – меў прэм'еру на Берлінскім міжнародным кінафестывалі 2025 года ў секцыі Forum.

У сетку ўваходзяць фільммэйкеры з Беларусі і з-за мяжы.

Больш інфармацыі: belfilmnet.work

## VODBLISK

Онлайн-кінатэатр стварыла каманда кінафестывалю «Паўночнае ззянне» для паказу беларускага кіно, сярод іншага, знятага беларусамі ў Польшчы. Кінатэатр даступны для гледачоў па ўсім свеце, і яго аўдыторыя на тэрыторыі Польшчы найвялікшая пасля Беларусі. Спрыяе ўтварэнню інфраструктуры для беларускага кіно: платформа падтрымлівае творцаў, робіць іхныя працы даступнымі шырокай аўдыторыі і спрыяе міжнацыянальнаму дыялогу.

Больш інфармацыі: vodblisk.com

# АЎТАРЫ

## ВАРШАВА

### АГРЭНІЧ НЭЛА

Рэжысёрка ігравога і дакументальнага кіно, сцэнарыстка, акторка. Ейныя кароткаметражныя фільмы бралі ўдзел і перамагалі ў міжнародных фестывалях у Нямеччыне, Чэхіі, Казахстане, Беларусі, Польшчы, Украіне, Арменіі ды іншых краінах. Пасля пераезду ў Польшчу скончыла курс Film Bridge – Belarus Школы Вайды і Гдыньскай кінашколы. Працуе над поўнаметражнымі стужкамі: праект дакументальнага фільму Gooseman у супрацы з польскаю кінакампаніяй Apple films атрымаў фінансаванне PISF, сцэнар ігравой стужкі «Жнівень» у супрацы з Grupa ZPR Media атрымаў ад PISF падтрыманне на сцэнарны дэвэлапмэнт і рыхтуецца да наступных этапаў вытворчасці.

### БУЙНІЦКІ МАКСІМ

Скончыў курс Film Bridge – Belarus Школы Вайды і Гдыньскай кінашколы, у межах якога зняў кароткаметражны дакументальны фільм «Дзённік Анастасіі». Таксама ў 2022-м зняў дакументальную стужку «Беларускі працэс» прадукцыі Народнага антыкрызіснага ўпраўлення і Фонду «Беларусь будучыні» – работу паказалі на тэлеканалах «Белсат», TVP Polonia і TVP World. У 2023–2024 гадах працаваў у групе дакументальнага фільму «1953. Бітва за надзею» (1953. Walka o nadzieję) прадукцыі ZPR Media, адказваючы за дакументацыю і пераклад. Распрацоўвае ўласны праект міні-серыялу Rzeczpospolita Czerniakowska пра варшаўскую здымную кватэру, у якой жывуць палякі, украінцы і беларусы.

### ГАЛУБОВІЧ КСЕНІЯ

Рэжысёрка дакументальнага кіно, фатографка, прайшла курс Film Bridge – Belarus Школы Вайды і Гдыньскай кінашколы. Ксеніны фотапраекты даследуюць правы чалавека, псіхічнае здароўе і сацыяльныя праблемы. З 2021 года працуе над дакументальным фільмам «Я зрабіў памылку, прыехаўшы сюды», што закранае тэму мігранцкага крызісу на мяжы Беларусі і краінаў Еўразвязу. З пачатку поўнамаштабнага

ўварвання Расеі ва Украіну жыве ў Польшчы і Украіне, як журналістка займаецца тэмамі акупаваных Расеяй украінскіх тэрыторыяў і Беларусі пад расейскім уплывам.

Больш інфармацыі: ksenіyahalubovich.com

## ГАПІЕНКА ІВАН

Рэжысёр-аніматар, мастак, дызайнер руху, сузаснавальнік Juniper Animation Studio (2022–2024). Аўтар мастацкіх кароткаметражных фільмаў, у тым ліку праектаў, створаных для планетараў і VR-платформаў. Працуе над кароткаметражнаю стужкаю з партнёрамі з ЗША і Аўстраліі.

Іванаў досвед залучае таксама супрацу з міжнароднымі камандамі і комплекснае кіраванне вытворчымі канвеерамі для камерцыйных праектаў камп'ютарнай графікі, як Carlsberg New Dawn, Juventus × Betera і Hero Wars, у тым ліку працу з тэхналогіямі віртуальнай вытворчасці. Іван – удзельнік і лаўрэат міжнародных кінафестываляў, у тым ліку Загрэбскага кінафестывалю, Вялікага фестывалю мультфільмаў, Fantoche, фестывалю The Fulldome у Брне, прэміі New York Movie Awards і Florence Film Awards.

Больш інфармацыі: linktr.ee/ivangopienko

## ЗУЙ МІХАІЛ

Беларускі актор, сцэнарыст і музыка. Шоуранэр і сцэнарыст серыялу «Працэсы» для тэлеканалу «Белсат». Заснавальнік і актор сатырычнага YouTube-каналу ChinChin-Channel, стварыў у Польшчы некалькі міні-серыялаў.

Былы актор Тэатру імя Янкі Купалы, цяпер удзельнік тэатральнай групы «Вольныя купалаўцы». Музыка сінціпоп-гурта Zui, які выступае на польскіх музычных фестывалях. Аўтар сцэнара і кампазітар кароткаметражнага жахлівіку «Суд мёртвых» ды пілотнай серыі серыялу «Свінгеры».

## КАВАЛЁЎ СЯРГЕЙ

Рэжысёр, аператар, сябра міжнароднай асацыяцыі Inedits (Еўрапейская асацыяцыя для спрыяння распаўсюду і захавання аматарскага кіно), захоўвае аўдыявізуальную спадчыну беларусаў. З 2020 года як аўтар здымак выступіў у сямі дакументальных стужках і адным іграв ым кіно. Зрэжысураваў чатыры кароткія дакументы, два з якіх заснаваныя на аматарскіх архіўных матэрыялах і знойдзеных кадраў (found footage). Стажываўся ў Нацыянальнай школе кіно, тэлебачання і тэатру ў Лодзі, а таксама ў варшаўскім MSN і Fondazione Home Movies. Пад апекаю польскага рэжысёра Мацея Дрыгаса ініцыяваў праект для даследавання, як прыватная памяць фармуе калектыўную гісторыю. Стужкі з Сяргеевым удзелам дэманстраваліся

на 13 міжнародных кінафестывалях, у тым ліку мелі прэм'еры на Berlinale 2025 і Dok Leipzig 2023.

Больш інфармацыі: kalyska-archive.org/en

## КАШПЕРСКІ АНДРЭЙ

Кінарэжысёр, сцэнарыст, прадзюсар, які працуе ў галіне кіно і інтэрнэт-праектаў. Вядомы як стваральнік сатырычнага YouTube-праекту ChinChinChannel (больш за 6 мільёнаў праглядаў) і рэжысёр серыялу-анталогіі «Працэсы» для «Белсату» (3,5 мільёна праглядаў). Кароткаметражны фільм «Суд мёртвых», зняты ў Польшчы, адабралі на міжнародныя кінафестывалі, у тым ліку Macabro (Мексіка, 2025).

У творчасці часта звяртаецца да вострых жанраў (сатыра, абсурдысцкая камедыя, жахлівік), крытычна асэнсоўваючы палітычныя ды сацыяльныя рэаліі Беларусі, Украіны і Расеі. Працуе над праектамі, якія не грунтуюцца на постсавецкай рэальнасці: камедыйны серыял «Свінгеры» і драмедзі пра скінхэда «Ад сэрца да сонца».

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Андрэй_Кашперскі

## МАРЧЫК СЯРГЕЙ

Рэжысёр, прадзюсар і аператар. Больш за 15 гадоў займаецца тэмай узброеных канфліктаў і сацыяльна-палітычных пераўтварэнняў у свеце. Рэалізоўваў дакументальныя фільмы ў турэцкім Курдыстане, Іраку, Сірыі, Іярданіі, Венесуэле, Арменіі, Беларусі, Афганістане і Украіне. Выпускнік курсу Dok Pro ў Школе Вайды. Заснавальнік Marchello Production і FreeDoc Foundation.

Рэжысёрскі дэбют Living with the Taliban атрымаў Гран-пры на HumanDOC IDFF, а таксама ўзнагароды Best International Mid-Length і Cantin Special Jury Award на Junction North IDFF у Канадзе.

Больш інфармацыі: filmpolski.pl/fp/index.php?osoba=11144141

## МАТАФОНАЎ АЛЯКСАНДР

Рэжысёр дакументальнага кіно, прадзюсар, фатограф, выкладае ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце. Прайшоў курсы Dok Pro Wajda School & Wajda Studio і скончыў магістратуру ў Нацыянальнай школе кіно, тэлебачання і тэатру ў Лодзі. Заснаваў фірму Studio Labyrinth для прадукцыі дакументальнага кіно. Пад гэтым лэйблам зрэалізаваў фільм Tak Dużo i Tak Mało для TVP. Распрацоўвае новы

праект – Zainteresowania Hanny, галоўная гераіня якога, уцякачка з Беларусі, шукае новы дом у Польшчы і знаходзіць яго праз кантакт з прыродаю.

## МІХАЛКОВІЧ АЛЯКСАНДР

Рэжысёр дакументальнага кіно, фатограф, стыпендыят Gaude Polonia. Вядомы фільмамі «Мая бабуля з Марсу» і «Радзіма». Апошні, зняты з Ганнаю Бадзякаю, расказвае аб практыцы гвалту ў беларускай арміі. Стужка атрымала галоўную ўзнагароду Капэнгагенскага міжнароднага фестывалю дакументальнага кіно CPH:DOX, дзе адбылася прэм'ера, а таксама намінацыю на Еўрапейскую кінапрэмію ў катэгорыі «Найлепшы дакументальны фільм». Як рэжысёр засяроджваецца на доўгатэрміновых праектах.

Больш інфармацыі: cargocollective.com/mihalkovich

## ПАЛУПАНАЎ АНДРЭЙ

Рэжысёр, выкладнік, аўтар фільмаў «Традыцыйна Шапэн» і «Казкатэрапія», арганізатар акторскіх трэнінгаў і навучальных курсаў. Сярод іншага інтэгруе штучны інтэлект у класічную кінавытворчасць праз навучанне і фестываль нейрасеткавых стужак.

## РУДАКОВА МАР'ЯНА

Беларуска-польская рэжысёрка анімацыі ў кірунках стоп-моўшн і 2D, працуе пад брэндам Klikni.studio. Вучылася ў Лодзі на праграме StopMoLab ад анімацыйнага форуму Animarkt, працягвае адукацыю ў Польска-японскай акадэміі камп'ютарных тэхналогіяў на кірунку анімацыйных фільмаў.

Здымае камерцыйную анімацыю, а таксама кароткаметражную мастацкую анімацыю, прасоўвае тэму жанчын. Выкладае анімацыю ў паліцэальнай школе Cosinus у Варшаве.

Больш інфармацыі: kniknistudio.com

## СЯНЬКОВА УЛАДА

Рэжысёрка ігравога кіно, выпускніца Школы Вайды, вядомая поўнаметражнымі фільмамі «Граф у апельсінах» і «ІІ». Апошні – пра булінг у беларускай школе – у 2019 годзе быў уганараваны Асаблівым згадваннем журы Варшаўскага міжнароднага кінафестывалю. Сёння аўтарка працуе над уласнымі кінапраектамі з тэмамі

беларускай эміграцыі ў Польшчы, спробаў знайсці сябе ў новай рэчаіснасці і перажывання траўматычных падзеяў.

Больш інфармацыі: imdb.com/name/nm6781781

## СЯМАШКА ЮРЫЙ

Рэжысёр і сцэнарыст іґравога ды анімацыйнага кіно, аўтар кароткаметражных фільмаў «Смеццевая галава» і «Кроў і караоке», а таксама поўнаметражнай стужкі «Лебядзіная песня Фёдара Озерава».

Прэм'ера поўнаметражнага дэбюту, знятага ў Варшаве, адбылася ў 2025 годзе на Берлінскім міжнародным кінафестывалі ў секцыі Forum. На Berlinale стужка атрымала прэмію чытачоў газеты Tagesspiegel. Польская прэм'ера адбылася на фестывалі Nowe Horyzonty ў Вроцлаве: паводле рэйтынгаў кінафестывалю, фільм аказаўся найбольш папулярным сярод кінакрытыкаў у сваёй секцыі. Агулам «Лебядзіную песню Фёдара Озерава» паказалі на больш як 10 кінафестывалях.

## ТАМКОВІЧ МАРА

Беларуска-польская рэжысёрка, сябра Польскай кінаакадэміі, скончыла Варшаўскую кінашколу. Вядомая кароткаметражнымі працамі «Дачка» ды «У жывым эфіры» і поўнаметражным фільмам «Пад шэрым небам».

Прэм'ера поўнага метра, заснаванага на гісторыі беларускіх палітвязняў, адбылася на Tribeca Festival у Нью-Ёрку, а на Фестывалі польскага іґравога кіно ў Гдыні стужка атрымала ўзнагароду ў катэгорыі «За рэжысёрскі дэбют альбо другі фільм». «Пад шэрым небам» намінавалі на Еўрапейскую кінапрэмію ў катэгорыі «Еўрапейскае адкрыццё». Мару запрасілі ў Варшаўскую кінашколу як выкладніцу.

Больш інфармацыі: filmpolski.pl/fp/index.php?osoba=11137134

## ШВЕД МАКСІМ

Рэжысёр дакументальнага кіно, аўтар фільмаў «Чыстае мастацтва», «Беларусь. Маршрут перабудаваны» і «Дзе мой край», апошні з якіх быў завершаны ўжо пасля пераезду ў Польшчу. Скончыў курс Dok Pro Школы Вайды ў 2016 годзе. Прэм'ера дэбютнага фільму «Чыстае мастацтва» адбылася на 56-м Кракаўскім кінафестывалі, стужка атрымала ўзнагароды на Artdocfest і Менскім міжнародным кінафестывалі «Лістапад». Сёння Максім Швед працуе як кінарэжысёр, аператар, рэпарцёр і фатограф.

Больш інфармацыі: imdb.com/name/nm11081321/

### ЯФІМАЎ ЯГОР

Прадзюсар і кінааператар, скончыў Варшаўскую кінашколу, прайшоў стажыяванне ў Нацыянальнай школе кіно, тэлебачання і тэатру ў Лодзі. Прадзюсаваў серыял «Працэсы» Андрэя Кашперскага, які выйшаў на тэлеканале «Белсат», як рэжысёр здымае дакументальныя фільмы для TVP.

Стала супрацоўнічае з беларускімі рэжысёрамі новай генерацыі і кіруецца місіяй развіцця незалежнага аўтарскага кіно з Беларусі – дакументальнага і ігравога. Некалькі кінапраектаў, у якіх працуе Ягор, атрымалі фінансаванне PISF. Адзін з іх – «Урокі хіміі» – распрацаваны з беларускім актывістам і былым палітвязнем Лявонам Халатранам.

Больш інфармацыі: filmpolski.pl/fp/index.php?osoba=11140056

## ЛОДЗЬ

### ДАШУК ВОЛЬГА

Рэжысёрка дакументальнага кіно, кінаэкспертка, выкладніца. У Беларусі стварыла больш за 20 фільмаў. Цяпер дактарантка Нацыянальнай школы кіно, тэлебачання і тэатру ў Лодзі: чытае лекцыі і працуе над уласнымі кінапраектамі, сярод якіх – праект ігравога кіно.

Больш інфармацыі: imdb.com/name/nm11445181

### КУЦІЛА АНДРЭЙ

Рэжысёр дакументальнага кіно, аўтар фільмаў «Стрыптыз і вайна», Summa, When Flowers Are Not Silent. За стужку Summa ў 2018 годзе атрымаў узнагароду кінафестывалю IDFA ў катэгорыі «Найлепшы сярэднеметражны дакументальны фільм». Яе ж адзначылі як найлепшую дакументальную стужку ў Нацыянальным конкурсе Кракаўскага кінафестывалю ў 2019-м.

Апошні поўнаметражны фільм – When Flowers Are Not Silent – прысвечаны жанчынам падчас масавых пратэстаў у Беларусі і Андрэевай сястры, якая трапіла за краты. Стужка атрымала ўзнагароду «Найлепшы поўнаметражны дакументальны фільм» на Варшаўскім кінафестывалі. У 2021 годзе рэжысёр пакінуў Беларусь,

у 2022-м скончыў стажыяванне ў Лодзінскай кінашколе і працуе над наступным дакументальным праектам.

Больш інфармацыі: filmpolski.pl/fp/index.php?osoba=11177414

## СВІРЭПА ТАНЯ

Беларуская рэжысёрка дакументальнага кіно. Дэбютны поўнаметражны фільм «Беларусь 23.34» пра катаванні ў беларускіх турмах выйшаў у 2023 годзе. Стужка сталася лаўрэатам кінафестывалю Bulbamovie (узнагарода ад Polska Filmoteka Narodowa), а таксама была паказаная на DOK.fest München, Artdocfest ды іншых і намінаваная на прэмію Silver Eye 2022.

Аўтарка была вольнаю слухачкаю Нацыянальнай школы кіно, тэлебачання і тэатру ў Лодзі, удзельніцаю майстар-класаў B2B Docs у тым ліку ў Кракаве і Варшаве. Працуе над кароткаметражным гібрыдным дакументальным фільмам «Я цябе дачакаюся» і поўнаметражнаю гібрыднаю дакументальнаю стужкаю «Мне больш не страшна» (No prob production house), падтрыманаю стыпендыяй міністра культуры Польшчы Gaude Polonia.

Больш інфармацыі: svirepa.tanya.tilda.ws

# ЛІТАРАТУРА І ПЕРАКЛАДЫ

# За час пасля 2020 года ў Польшчы ўтварылася шмат беларускіх выдавецтваў, з'явіліся пляцоўкі, дзе можна набыць беларускія кнігі, да таго ж значна пашырылася ўзаемадзеянне польскага і беларускага літаратурных колаў.

Кіраўніца Беларускага інстытуту кнігі Лілія Ільюшына адзначае, што гэты рух насустрач – яшчэ толькі пачатак шляху. У любым разе апроч Адама Міцкевіча і Сяргея Пясецкага беларусаў і палякаў у літаратуры яднае ўсё больш, беларускія і польскія творцы ўсё часцей узаемна перакладаюцца і робяцца ўсё больш вядомымі суседняй аўдыторыі.

Самая заўважная ў польскім асяроддзі – нобэлеўская лаўрэатка Святлана Алексіевіч: усе 5 кніг пісьменніцы, сярод якіх «У вайны не жаночы твар», «Цынкавыя хлопчыкі», «Час second-hand», выдаюцца і перавыдаюцца ў выдавецтве Czarne. Апошні пераклад рабіўся Ежы Чэхам. У Польшчы выдалі некалькі паэтычных і празаічных выданняў Уладзіміра Някляева: напрыклад, зборнік вершаў Sam ад выдавецтва KEW. Раней яно ж выпусціла кнігу Някляева Automat z wodą gazowaną z syropem lub bez, што трапіла ў кароткі спіс літаратурнай узнагароды Цэнтральнай Еўропы Angelus.

Пад назваю O wilku mówiono w izbie выдавецтва KEW надрукавала кнігу «Па што ідзеш, воўча» Евы Вежнавец у перакладзе Малгажаты Бухалік. Адзін з найвядомейшых польскіх перакладнікаў – Богдан Задура – пераклаў выбраныя вершы Уладзіміра Арлова, а таксама ягоную кнігу Tańce nad miastem. Trzy opowieści для выдавецтва Literackie.

Нямала беларускіх пазіцыяў за апошнія гады выпусціла люблінскае выдавецтва Warsztaty Kultury – Porucznik Piatrowicz i chorąży Duch Уладзіміра Арлова зноў жа ў перакладзе Багдана Задуры, дзве кнігі Андрэя Адамовіча – Tłuścioch i leszcz i Dzień poezji śmierci dzień – з удзелам Багдана Задуры і ягонага сына Марка Сэрг'юша Задуры. Тут жа выходзяць пераклады Альгерда Бахарэвіча – Mały leksykon medyczny według Bacharewicza, і Юліі Цімафеевай – Cyrk i inne wiersze i Autoportret w postaci pestki awokado.

Выдавецтва Pogranicze з Сэйнаў выпусціла кнігу выбранай паэзіі Андрэя Хадановіча Zabawy fantomowe, «Сароку на шыбеніцы» Альгерда Бахарэвіча ў перакладзе Яна і Галіны Максымюкоў ды паэму «Сарматыя» Марыі Мартысевіч у перакладзе Богдана Задуры.

Паводле Андрэя Хадановіча, пакуль беларусы ведаюць польскую літаратуру лепш, чымся палякі – беларускую. Адзін з самых прыкметных беларускіх выдаўцоў у Польшчы – выдавецтва «Янушкевіч», якое таксама мае стацыянарную ў Варшаве

→ ЗМЕСТ

і онлайн-краму «Кнігаўка», дзе можна знайсці прадукцыю розных беларускіх выдавецтваў, што дзеяць за мяжою.

Яно ж застаецца ў авангардзе перакладаў польскіх аўтараў на беларускую мову: выдадзеныя 5 першых кніг з сагі «Вядзьмар» Анджэя Сапкоўскага ў перакладзе Кацярыны Мацiеўскай і «Гаспадар ледзянога саду» Ярослава Гжэндовіча ў перакладах Алены Пятровіч і Марыі Пушкінай. Таксама раман «Зімоўка» і кніга апавяданняў «Самасейкі» Дамінікі Словік у перакладзе Алены Пятровіч. Выйшлі дзве кнігі Шчэпана Твардаха – «Кароль» у перакладзе Міколы Раманоўскага і «Нуль» у перакладзе Кацярыны Мацiеўскай.

Выдавецтва Gutenberg Publisher у Кракаве таксама мае серыю польскай літаратуры па-беларуску: нобэлеўскія лаўрэаты Віслава Шымборска і Чэслаў Мілаш выйшлі білінгвальнымі тамамі – уклаў Андрэй Хадановіч, да працы спрычыніліся розныя перакладнікі. Тут жа былі выпушчаныя «Яшчэ адзін дзень жыцця» Рышарда Капусьцінськага і раман «Лялька» Балеслава Пруса. Выдавецтва «Полацкія лабірынты» ў Варшаве выпусціла культавую польскую кнігу «Апярэдзіць Госпада Бога» Ганны Краль пра аднаго з кіраўнікоў паўстання ў Варшаўскім гета Марэка Эдэльмана.

У кантэксце беларускай літаратуры таксама варта згадаць, што Польшча робіцца галоўнаю краінаю для правядзення беларускага фестывалю інтэлектуальнай кнігі Pradmova; тут жа сёлета ўпершыню адбыўся Міжнародны паэтычны фестываль імя Міхася Стральцова «Вершы на асфальце»; беларускія выдаўцы і літаратары стала бяруць удзел у важных кніжных падзеях Польшчы – Варшаўскім міжнародным кніжным кірмашы, Катавіцкім кірмашы, Беластоцкім кірмашы, Фестывалі Чэслава Мілаша ў Кракаве, фестывалях Бруна Шульца і Silesius ва Вроцлаве ды іншых.

Істотная для культурніцкага абмену ў літаратуры супраца Беларускага ПЭНу і Польскага ПЭН-клубу, дзе апошні дзеліцца з калегамі пляцоўкаю для беларускіх альбо польска-беларускіх імпрэзаў і дапамагае прыцягваць увагу да забароненай у Беларусі літаратуры. Да таго ж польскія гарады, што належаць да Міжнароднай сеткі гарадоў-прытулкаў (International Cities of Refuge Network), прымаюць у сябе беларускіх пісьменнікаў.

Ізноў жа ў Польшчы ўручаюцца беларускія літаратурныя прэміі, перадусім варта згадаць прэмію Ежы Гедройця, што свайго часу ўзнікла на ініцыятыву польскіх дыпламатаў. Сімвалічная тут асоба Гедройця – культавага польскага рэдактара, які нарадзіўся ў Менску і зрабіў вялікі ўнёсак у польскую культуру менавіта ва ўмовах эміграцыі.

# ІНСТЫТУЦЫІ, ПРАЕКТЫ І ІНІЦЫЯТЫВЫ

## *ВАРШАВА*

### БЕЛАРУСКІЯ АЎДЫЯКНІГІ AUDIOBOOKS.BY.

Аўдыявыдавецтва, дыстрыб'ютар, каталог, заснаваны Мікітам Белаглазавым. Запісвае, збірае і распаўсюджвае беларускую літаратуру ў аўдыяфармаце на вялікіх пляцоўках. На сёння ў каталогу каля 700 кніг, больш за 50 з іх створаныя камандай Audiobooks.by. Супрацоўнічае з буйнымі беларускімі выдавецтвамі – «Янушкевіч», «Логвінаў», Gutenberg Publisher ды іншымі. Прапануе платны і бясплатны доступ да аўдыякніг.

Больш інфармацыі: audiobooks.by

### БЕЛАРУСКІ ПЭН

Беларускі нацыянальны цэнтр PEN International – сусветнага аб'яднання пісьменнікаў ды іншых творцаў, што выступае за свабоду слова, правы культурніцкіх дзеячаў ды развіццё літаратуры і культуры ў Беларусі. Заснавалі ў 1989 годзе як Беларускі ПЭН-цэнтр, згодна з міжнароднымі прынцыпамі арганізацыі PEN, яднаў беларускіх пісьменнікаў, перакладнікаў, літаратурных крытыкаў, журналістаў і іншых творцаў, якія абараняюць свабоду творчасці і слова. З 2022 года Беларускі ПЭН працуе ў Польшчы.

Праваабарончы кірунак арганізацыі – маніторынг і дакументаванне парушэнняў правоў чалавека і культурніцкіх правоў, асабліва адносна пісьменнікаў, журналістаў і дзеячаў культуры ў Беларусі, кампаніі салідарнасці і адвакацыя рэпрэсаваных творцаў на міжнародным узроўні.

Творчы кірунак – літаратурныя прэміі і праекты, скіраваныя на развіццё беларускай літаратуры (напрыклад, прэміі Алеся Адамовіча, Францішка Багушэвіча, Літаратурная прэмія імя Ежы Гедройца); фестывалі, рэзідэнцыі, творчыя сустрэчы, адукацыйныя праграмы.

Больш інфармацыі: penbelarus.org

### «ЖЫВЕТЭКА»

Беларуская бібліятэка – праект Аляксандры Гушчы – мяркуе стварэнне кніжнага фонду ў публічнай бібліятэцы, каб спрасціць доступ да кніг беларусам, а таксама інтэграваць беларускую дыяспару ў польскае грамадства праз культуру. Увесну і восень, два разы

на год, у бібліятэцы ладзяцца дні беларускай культуры, куды запрашаюць асобаў, якія робяць вялікі ўнёсак у папулярызацыю беларускай мовы і літаратуры. На сёння фонд «Жыветэкі» налічвае 200+ кніг. Бібліятэка адкрытая да супрацы. Працуе ў Biblioteka MDM.

## ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ

Ініцыятыва для прамоцыі і рэпрэзентацыі беларускай кнігі ды падтрымання беларускага кніжнага асяроддзя ў Беларусі і за яе межамі. Працуе з 2023 года як «агульная пляцоўка» для ўсіх, хто робіць беларускую кнігу, з акцэнтам на прысутнасць Беларусі ў міжнародным кніжным полі.

Асноўныя кірункі працы – прасоўванне і распаўсюд беларускай кнігі, папулярызацыя чытання і чытацкай культуры; міжнароднае партнёрства і прэзентаванне беларускай кнігі на пляцоўках за мяжою (дыскусіі, падзеі, удзел у кніжных кірмашах); аб'яднанне ўдзельнікаў кніжнай сферы: аўтараў, выдаўцоў, чытачоў, кнігараспаўсюднікаў, ілюстратараў, бібліятэкараў; падтрыманне кнігавыдавецкіх ініцыятываў і супольных праектаў. Тры гады запар арганізоўваў беларускі стэнд на кніжным кірмашы ў Франкфурце-на-Майне.

Больш інфармацыі: instagram.com/instbelknihi

## «КНІЖНЫ ВОЗ»

Аўдыявыдавецтва для дзяцей запісвае і размяшчае аўдыякнігі па-беларуску для дзяцей усіх узростаў. Мае больш за 100 выданняў, пераважная частка якіх зробленая камандай «Кніжнага воза».

Больш інфармацыі: knizhnyvoz.com

## «ЛЫСЫ ЧЭРАП»

Выдавецтва пазначае сябе як «акультнае выдавецтва», працуе пад дэвізам «хутка, танна, без забабонаў», арыентуецца на тэксты «па-за мэйнстрымам», якім складана прабіцца ў камерцыйныя выдавецтвы. Робяць стаўку на даступнасць для чытача і аператыўнасць для аўтара. Апроч кніг, працуюць з выданнем музыкі на касетах.

Больш інфармацыі: ko-fi.com/lysycerap/shop

## «МЯНЕ НЯМА»

Незалежнае беларускае выдавецтва. Галоўны рэдактар і сузаснавальнік – пісьменнік Павел Анціпаў. Фокус – сучасная беларуская літаратура (проза, эсэістыка, паэзія) і выданні «без лімітаў і цэнзуры» на беларускай і рускай мовах. Маюць намер перавыдаваць актуальную літаратуру XXI стагоддзя, у тым ліку кнігі, што сталі цяжкадаступнымі. Робяць друкаваныя і электронныя кнігі з дастаўкай па свеце.

Больш інфармацыі: mnnm.store

## «ПОЛАЦКІЯ ЛАБІРЫНТЫ»

Выдавецтва, якое працуе з сучаснаю беларускаю літаратураю, нон-фікшн і тэкстамі, што асэнсоўваюць гісторыю, культуру і досвед Беларусі ў шырокім еўрапейскім кантэксце. Выдавецтва арыентуецца на інтэлектуальную, грамадзянсказначную літаратуру, часта звязаную з тэмамі памяці, правоў чалавека, рэпрэсіяў і супраціву.

Прынцыповая пазіцыя «Полацкіх лабірынтаў» – выданне кніг, якія не могуць выйсці ў Беларусі праз дзяржаўную цэнзуру і забароны. Гэта тэксты, выключаныя з афіцыйнай культурніцкай прасторы, але істотныя для разумення сучаснай беларускай рэальнасці і гісторыі.

Больш інфармацыі: facebook.com/PolackijaLabirynty

## «СЕЙБІТ» / SAYBEAT

Выдавецкая ініцыятыва, заснаваная літаратарам Максам Шчуром і графічным дызайнерам Уладзімірам Маджэнтовічам для публікацыі кніг некамерцыйных і нефарматных аўтараў па-беларуску – арыгінальных і перакладных.

Больш інфармацыі: facebook.com/SayBeat

## SŁOWIANKA

Выдавецтва выдае кнігі для дзяцей па-беларуску. Публікуе казкі вядомага актора і героя дзіцячай тэлепраграмы «Калыханка» Аляксандра Ждановіча ў серыі «Той самы Маляваныч», а таксама творы беларускіх класікаў і сучаснікаў.

Больш інфармацыі: slowianka.edu.pl/knihi

## PRADMOVA

Міжнародны фестываль інтэлектуальнай кнігі і свабоднай думкі ўзнік як прастора для глыбокага асэнсавання сучасных культурніцкіх, сацыяльных і палітычных працэсаў праз слова, тэкст і публічную дыскусію. Яднае пісьменнікаў, філосафаў, гісторыкаў, даследнікаў, перакладнікаў і актыўных чытачоў з розных краінаў, арганізуе лекцыі, дыскусіі, аўтарскія сустрэчы, прэзентацыі, канцэрты.

У цэнтры ўвагі – інтэлектуальная кніга як форма супрацыву павярхоўнасці, інструмент крытычнага мыслення і сродак захавання калектыўнай памяці. Асаблівую ролю фестываль надае беларускай мове і культуры, інтэгруючы іх у шырэйшы еўрапейскі і сусветны кантэкст, а таксама падтрымліваючы незалежную гуманітарную думку ва ўмовах абмежавання свабоды слова. З 2022 года фестываль адбываецца за межамі Беларусі – у гарадах Польшчы, а таксама ў Літве, Нямеччыне, Чэхіі, Грузіі і онлайн-фармаце.

Больш інфармацыі: pradmova.eu/

## «ЧАБОР»

Выдавецтва працуе ў звязцы з беларускаю кнігарняю «Чабор» у Цэнтры беларускай салідарнасці. Спецыялізуецца на рыхтаванні беларускамоўных выданняў і перакладаў, у тым ліку з польскай мовы. Мае імпрынт-лінейку «Скарынічы».

Больш інфармацыі czabor.sumupstore.com

## ВЫДАВЕЦТВА «ЯНУШКЕВІЧ» І КНІГАРНЯ «КНІГАЎКА»

Шматпланавы кніжны праект поўнага цыклу, заснаваны выдаўцом Андрэем Янушкевічам. Яднае выдавецтва, кнігарню (офлайн і онлайн), мае досвед шырокай рэпрэзентацыі беларускіх кніг на вялікіх маркетплэйсах – Allegro, Amazon, Empik. Працуе ў Польшчы з 2023 года.

Выдае кнігі па-беларуску, у тым ліку пераклады сусветнай літаратуры і сучасную прозу, нон-фікшн. У каталогу – дэбютныя кнігі маладых беларускіх аўтараў, пераклады сусветных бестселераў на беларускую мову, як «Гары Потэр» і «Вядзьмак». Выдае вялікую колькасць перакладаў з польскай мовы.

Больш інфармацыі: knihauka.com

# БЕЛАСТОК І ПАДЛЯШША

## ФОНД KAMUNIKAT

Культурніцка-асветніцкая арганізацыя, якая вядзе найбуйнейшую беларускую інтэрнэт-бібліятэку і развівае вакол яе выдавецкія і медыйныя праекты. Асноўныя напрамкі працы – лічбавая бібліятэка, дзе Kamunikat збірае і дае доступ да беларускіх публікацый; алічбоўка перыёдыкі і архіваў, у тым ліку выданняў, што выходзілі ў Беларусі і ў эміграцыі, рабіліся беларускай меншасцю ў Польшчы і Літве; запіс аўдыякніг у агучванні сучасных беларускіх аўтараў, частка якіх робіцца ў супрацы з беларускімі творчымі асяродкамі і выкладаецца бясплатна. З 2021 года фундацыя таксама займаецца выдавецкай дзейнасцю і распаўсюджвае свае друкаваныя кнігі праз кірмашы, імпрэзы дыяспары і інтэрнэт.

Больш інфармацыі: Kamunikat.org

# ВРОЦЛАЎ

## BYPROSVET

Ініцыятыва, што падтрымлівае самвыдат і беларускую культуру, у тым ліку праз фінансаванне і арганізацыю сеткі друку і распаўсюду газетаў, улётак і налепак. Мае ўласную інтэрнэт-краму з культурніцкімі прадуктамі (кнігі, нататнікі, календары, пазлы і іншае).

Больш інфармацыі: byprosvet.org

# КРАКАЎ

## АСАЦЫЯЦЫЯ БЕЛАРУСКІХ ВЫДАЎЦОЎ

Прафесійнае некамерцыйнае аб'яднанне незалежных беларускіх выдавецтваў і выдавецкіх ініцыятываў, створанае падчас фестывалю Pradmova 11 сузаснавальнікамі. Старшыня – рэдактарка выдавецтва Gutenberg Publisher Валянціна Андрэева.

Дзейнасць мяркуе каардынацыю незалежных беларускіх выдаўцоў, у тым ліку тых, хто працуе ў выгнанні; прасоўванне беларускай кнігі на міжнароднай арэне і спрыянне ўдзелу ў міжнародных кніжных кірмашах ды праектах; арганізацыю імпрэзаў для выдаўцоў, аўтараў і чытачоў.

## GUTENBERG PUBLISHER

Незалежнае еўрапейскае беларускае выдавецтва спецыялізуецца на выданні беларускамоўных кніг. Выдае кнігі па-беларуску і пра беларускую культуру, у тым ліку белетрыстыку, гістарычныя і мастацкія творы. Гэта сучасная беларуская проза, кнігі для дзяцей, пераклады замежных аўтараў на беларускую мову, навукова-папулярныя выданні.

Вырабляе і прадае настольныя гульні, мапы і падарункі, часта звязаная з літаратурай і гісторыяй. Ладзіць сустрэчы, лекцыі і прэзентацыі для аматараў літаратуры і беларускай культуры ў Кракаве і не толькі. Мае знак No AI Content Inside, які пазначае творы, створаныя без дапамогі штучнага інтэлекту, падкрэсліваючы каштоўнасць чалавечай творчасці.

Больш інфармацыі: gutenbergpublisher.eu

## «КНІЖНЫ ВЫРАЙ»

Культурніцка-асветніцкая арганізацыя створаная, каб прасоўваць чытанне і беларускую літаратуру. З 2022 года збірае бібліятэку беларускіх кніг, што налічвае ўжо больш за 700 асобнікаў. Тут рэгулярна праходзяць дыскусійныя клубы, інтэрактыўныя чытанні для дзяцей, сустрэчы з аўтарамі. Акрамя папулярызацыі чытання, фонд займаецца выдавецкай дзейнасцю: перакладае замежную літаратуру на беларускую мову. Ладзіць адукацыйныя праекты для моладзі, а таксама распрацоўвае ініцыятывы, што яднаюць беларускую супольнасць Кракава вакол бібліятэкі.

Больш інфармацыі: vyraj.club

## TAMAKA PUBLISHING / «ТАМАКА», БЕРЛІН – КРАКАЎ – ВІЛЬНЯ

Незалежнае беларускае выдавецтва пачало працу ў 2025 годзе, спецыялізуецца на кнігах пра выяўленчае мастацтва, фатаграфію, дызайн і архітэктуру. Выдала кнігі малюнкаў Машы Святагор Everybody Dance! і альбом фота Rattus Sapiens Марыі Карнеенкі. Кніга Everybody Dance! трапіла ў спіс найлепшых новых выданняў сезону паводле The British Journal of Photography.

Больш інфармацыі: tamaka.eu

# ПОЗНАНЬ

## ROZUM

Выдавецтва, місія якога – рабіць пачутымі сучасныя галасы беларусаў. Выдае кнігі па-беларуску і па-расейску, рыхтуе пераклады беларускай літаратуры на еўрапейскія мовы. Запачаткаванае ў лістападзе 2025 года падчас фестывалю Pradmova, дэкларуе, што існуе дзякуючы падтрыманню чытачоў і валанцёраў.

Больш інфармацыі: rozum.media

***

## «БЕЛАВЕЖА»

Беларускае літаратурнае аб'яднанне стварылі ў 1958 годзе беларусы ў Польшчы. Яднае пісьменнікаў, якія пішуць па-беларуску. Мэты – падтрымаць беларускую літаратуру і творчасці, развіццё пісьменніцтва на беларускай мове сярод беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы. Аўтары, што ўваходзяць у «Белавежу» пішуць прозу, паэзію ды іншыя творы па-беларуску, часта звязаныя з тэмамі культурнай ідэнтычнасці і гісторыі беларусаў Заходняй Беларусі. Аб'яднанне выдае штогадовы літаратурны часопіс «Тэрмапілы» і серыю кніг у межах Бібліятэчкі Беларускага літаратурнага аб'яднання «Белавежа».

Больш інфармацыі: kamunikat.org/bielavieza

# АЎТАРЫ

## *ВАРШАВА*

### АНЦІПАЎ ПАВЕЛ

Пісьменнік і выдавец, стваральнік Беларускага літаратурнага радыё, сузаснавальнік выдавецтва «Мяне няма» ў Варшаве. Аўтар кніг «Верхом на звезде», «Краткая история премии Г.», «Куда-нибудь приезжать что-нибудь делать и уезжать» ды іншых.

Больш інфармацыі: litradio.link/

### АРЦЁМАВА ЮЛЯ

Аўтарка прозы, з 2021 да 2024 года жыла ва Украіне. Аўтарка раману «Я рэвалюцыя», выдадзенага выдавецкай ініцыятывай «Пфляўмбаўм». Удзельніца літаратурнай рэзідэнцыі ў Гданьску і літаратурнай рэзідэнцыі імя Яніны Кац у Кракаве.

### ВАЛЫНКІН МАКАР

Пісьменнік, а таксама кніжны відэаблогер і папулярызатар сучаснай беларускай літаратуры. Дэбютная кніга «Апошняе пакаленне» апавядае пра пакаленне Z у Менску і адлюстроўвае беларускую рэчаіснасць пасля 2020 года. Другі раман – містычны трылер «Ніці», пра менчука, які скіроўваецца працаваць у глухую беларускую вёску.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Макар_Валынкін

### ВАШКЕВІЧ ДАР'Я

Пісьменніца і перакладніца з англійскай, польскай, іспанскай, шведскай моваў. Аўтарка больш як 12 публікацыяў па-беларуску, па-расейску, па-англійску і па-польску. Выдала дзве кнігі для дзяцей – «Баваўняная дзяўчынка» і «Прыгоды Паўлінкі, Антося і мураша Фелікса». Мае больш за 13 апублікаваных літаратурных перакладаў на беларускую і расейскую мовы, у тым ліку 8 кніг.

### ВЕЖНАВЕЦ ЕВА (СВЯТЛАНА КУРС)

Пісьменніца і журналістка, аўтарка прозы пра беларускую штодзённасць, памяць, «ценявыя» бакі жыцця і маральныя выбары чалавека. Лаўрэатка Літаратурнай прэміі імя Ежы Гедройця і Прэміі вольнага слова. Кнігу «Па што ідзеш, воўча?» пераклалі

на нямецкую, чэшскую, шведскую, нарвежскую, польскую, дацкую, іспанскую мовы, неаднаразова ператваралі ў тэатральныя пастаноўкі. Выдавецтва Gutenberg Publisher перавыдала дэбютную кнігу прозы Евы Вежнавец «Шлях дробнай сволачы».

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Ева_Вежнавец

## ДЗЯДЗЕНКА ЗМІЦЕР

Пісьменнік і журналіст, аўтар і выканаўца ўласных песняў. Аўтар краязнаўча-генеалагічнага даведніку «Аршанская шляхта», суаўтар праекту «Наша страва». Напісаў і выдаў мастацкія вострасюжэтныя кнігі «Гісторыі ў прыцемках», «Вялікая пралетарская сексуальная рэвалюцыя». У 2020 годзе электронным выданнем выйшаў «Ордэн Прамяністых», а ягоная апошняя кніга «Гульні Цырцэі» заняла 3-е месца Прэміі Гедройця 2025.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Зміцер_Дзядзенка

## ДРОБЫШ КРЫСЦІНА

Аўдыявыдаўца, дыктарка, менеджарка. Былая акторка Купалаўскага тэатру. Асноўны кірунак працы сёння – літаратура, аўдыякніга, дубляж. Стваральніца і менеджарка праекту для дзяцей «Кніжны воз», працуе з аўдыявыдавецтвам audiobooks.by. Супрацоўнічае ў якасці голасу з тэлеканалам «Белсат», брала ўдзел у праектах для агучвання сведчанняў катаванняў беларусаў ды лістоў палітзняволеных для Press club Belarus, праваабарончага цэнтру «Вясна», Міжнароднага камітэту расследавання катаванняў у Беларусі, праекту «Палітвязынка», як дыктарка супрацоўнічала з лічбаваю платформаю «Новая Беларусь», фондам «Камунікат», кінафестывалем «Паўночнае ззянне» ды іншымі.

Больш інфармацыі: be-tarask.wikipedia.org/wiki/Крысьціна_Дробыш

## ІЛЬЮШЫНА ЛІЛІЯ

Пісьменніца (фэнтэзі, падлеткавая літаратура) і філасафка, культурніцкая менеджарка, каардынатарка Інстытуту беларускай кнігі і выканаўчая дырэктарка фестывалю Prad-mova. Аўтарка кніг «Ключ дарог. Пачатак» і «Мэтт Грэнвилл, Везучий Неудачник», што выйшлі ў 2019 годзе. Працуе на скрыжаванні літаратуры, культурніцкага менеджменту і будаўніцтва інтэлектуальнай супольнасці. Мае справу з тэкстам, аўдыторыяй і культурніцкай інфраструктураю – трыма ўзроўнямі, якія, на ейнае меркаванне, крытычна важныя для захавання і развіцця беларускай культурніцкай прасторы.

## КАЗЛОЎСКАЯ МАРЫНА

Літаратуразнаўца, выкладніца літаратуры, перакладніца, рэдактарка. Выкладае беларускую літаратуру ў Школе маладога пісьменніка пры Міжнародным саюзе беларускіх пісьменнікаў. Як рэдактарка супрацоўнічае з незалежнымі беларускімі выдавецтвамі Gutenberg Publisher, «Янушкевіч», «Пфляўмбаўм». Куратарка варшаўскай праграмы Фестывалю інтэлектуальнай кнігі Pradmova.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Марына_Міхайлаўна_Казлоўская

## КАРНАЦКАЯ НАСТА

Філалагіня, літаратурная аглядальніца. Працуе ў кнігарні «Кнігаўка» і выдавецтве «Янушкевіч». Вядоўца і стваральніца падкасту Bellit. Пераклала з англійскай мовы раманы Стывэна Кінга «Ззянне» і Рэбэкі Кван «Елаўфэй».

## КУСТАВА ВАЛЕРЫЯ

Пісьменніца, грамадская дзяячка, медыякрэатарка, ментарка, сцэнарыстка, аўтарка і прадзюсарка тэле- і кінапраграмаў, медыяпраектаў. Магістарка мастацтвазнаўства. Аўтарка кніг паэзіі «Кроў Сусвету», «Каб неба сагрэць...», «Тамсама» ды іншых. Удзельніца шматлікіх беларускіх і міжнародных літаратурных хрэстаматыяў, анталогіяў, фестываляў. Асобныя паэтычныя творы перакладзеныя на асноўныя мовы свету. Друкуецца з 6 гадоў. За апошнія гады сталася стыпендыяткаю Балтыйскага цэнтру пісьменнікаў і перакладнікаў у Швецыі і Міжнароднага цэнтру пісьменнікаў і перакладнікаў у Вэнтспілсе ў Латвіі.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Валерыя_Кустава

## МАЦІЕЎСКАЯ КАЦЯРЫНА

Перакладніца з польскай, англійскай, французскай моваў. Лаўрэатка прэміі Карласа Шэрмана для перакладнікаў, стыпендыятка Gaude Polonia. Перакладае класічную і сучасную літаратуру – прозу і паэзію. За апошнія гады ў перакладах з польскай выйшлі вершы Балеслава Лесьмяна, Кшыштафа Каміля Бачыньскага, Уладыслава Шленгеля, першыя пяць частак сагі «Вядзьмар» Анджэя Сапкоўскага, «Нуль» Шчэпана Твардаха ды іншыя.

Больш інфармацыі: be-tarask.wikipedia.org/wiki/Кацярына_Маціеўская

## НЯДБАЙ ТАЦЦЯНА

Літаратарка, праваабаронца, выдаўца, менеджарка культурніцкіх і медыяпраектаў. Старшыня Беларускага ПЭНу, сябра Рады Беларускага дому правоў чалавека і Кансультацыйнай рады Сеткі дамоў правоў чалавека. Намесніца старшыні фонду Open Culture у Любліне, супрацоўнічае з Беларускім Домам правоў чалавека ў Вільні.

Аўтарка дзвюх паэтычных кніг «Сірэны спяваюць джаз» і «Там, за сцяной». Лаўрэатка прэміі беларускай праваабарончай супольнасці «Праваабаронца года 2025». Пераклала на беларускую мову кнігу Эвы Томпсан «Песняры імперыі. Расійская літаратура і каланіялізм», суаўтарка перакладаў кніг Лешэка Калакоўскага «Наш вясёлы апакаліпсіс», Анны Бужыньскай і Міхала Паўла Маркоўскага «Тэорыі літаратуры ХХ стагоддзя» ды іншых. У Польшчы заснавала выдавецтва «Полацкія лабірынты», у якім выйшлі кнігі Марыі Мартысевіч «Водападзел», Алеся Бяляцкага «Алесь», Максіма Знака «Зэкамерон. Вершы. Гутаркі», першы поўны пераклад на беларускую мову «Іліяды» Гамера ды іншыя.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Таццяна_Нядбай

## РЫЖКОЎ ВІТАЛЬ

Паэт, перакладнік, сцэнарыст, удзельнік беларускіх культурніцкіх ініцыятываў, лаўрэат прэміі «Дэбют» імя Максіма Багдановіча. Перавыдаў у Польшчы дэбютную кнігу паэзіі «Дзверы, замкнёныя на ключы», выступае ў фармаце літаратурнага сольнага стэндап--шоу. Канцэрты «Прэзентацыя» з аншлагам прайшлі ў гарадах Польшчы і Еўропы.

Больш інфармацыі: lyrikline.org/fr/poemes/dva-skrypachy-7464

## ХАРЫТАНЮК НАТАЛКА

Філалагіня, выкладніца англійскай, нямецкай і беларускай моваў, аўтарка прозы, перакладніца. У 2010 выйшла першая кніга «Трынаццаць гісторый пра мёртвага ката» якая сталася лаўрэатам прэміі «Дэбют» імя Максіма Багдановіча. У 2015, 2018, 2022 і 2025 гадах выйшлі чатыры наступныя – раман і тры кнігі для дзяцей. Кніга «Казкі старога Адамкова» ўвайшла ў кароткі спіс прэміі Цёткі за найлепшую дзіцячую кнігу. «Казка пра тое, як Святога Міколу забаранялі» і «Каляды 1992» былі выдадзеныя ў Вроцлаве і ў Кракаве.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Наталка_Харытанюк

# БЕЛАСТОК

## АРКУШ АЛЕСЬ

Паэт, празаік, журналіст, уваходзіў у Таварыства маладых літаратараў «Тутэйшыя». Піша вершы, прозу, эсэістыку, крытычныя артыкулы. Аўтар каля дваццаці кніг паэзіі, прозы, эсэістыкі, шасці невялікіх раманаў. Аўтар тэксту – гімну Полацку і песняў шэрагу рок-гуртоў: «Мясцовы час», Rima, Sumarok. Друкаваўся ў польскіх часопісах Czas Kultury (Познань) і Borussia (Ольштын). У Беластоку заснаваў кніжную паэтычную серыю «Брукаванка».

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Алесь_Аркуш

## БАРТОСІК ЗМІЦЕР

Пісьменнік, публіцыст, аўтар і выканаўца песняў. Аўтар чатырох кніг – «Чорны пісталет», «Быў у пана верабейка гаварушчы», «Клініка кітайскага дантыста». У 2022 годзе апублікавалі «Забіць упалмінзага». Кніга «Быў у пана верабейка гаварушчы» свайго часу заняла першае месца прэміі Ежы Гедройца. Спектакль беларускага Свабоднага тэатру паводле «Верабейкі» паказвалі ў Менску, Варшаве і Лондане. Кніга выходзіла і па-польску пад назвай I miał pan wróbelka, który mówił. Кніга «Забіць упалмінзага» заняла трэцяе месца прэміі Гедройца.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Зміцер_Бартосік

## БЯЛЬКЕВІЧ ДАША

Паэтка, аўтарка песняў, перакладніца, арт-менеджарка, рэдактарка паэтычных кніг. Аўтарка кнігі паэзіі «Слёзы на вецер». Кніга атрымала прэмію Наталлі Арсенневай як найлепшая паэтычная кніга на беларускай мове. Зборнік стаўся найлепшаю кнігаю паэзіі 2021 года паводле версіі Радыё Свабода.

У Польшчы пачала музычны праект da kostka разам з кракаўскім музыкам Lastoŭski: піша тэксты і спявае. Вядзе літаратурны падкаст «Спіс на лета». Удзельніца літаратурнай рэзідэнцыі ў Вайнавіцах ад Калегіуму Усходняй Еўропы.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Дар’я_Бялькевіч

# ВРОЦЛАЎ

## ХАДАНОВІЧ АНДРЭЙ

Паэт, перакладнік, эсэіст, літаратуразнаўца і культурніцкі дзеяч. Перакладае вершы з французскай, польскай, англійскай, украінскай, расейскай ды іншых моваў. Аўтар каля дзесяці зборнікаў паэзіі для дарослых і адной кнігі паэзіі для дзяцей. Вершы перакладаліся і выходзілі ў розных краінах, у тым ліку ў Польшчы, Украіне і Швецыі. Лаўрэат Прэміі Нарвежскага звязу пісьменнікаў за свабоду слова, прэміі Польскага ПЭН-клубу, Прэміі Карласа Шэрмана і прэміі Наталлі Арсенневай.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Андрэй_Валер’евіч_Хадановіч

# ЛЮБЛІН

## ЛАПО ІРЫНА

Тэатразнаўца, літаратуразнаўца, перакладніца і этналінгвістка, ад'юнктка кафедры сучаснай польскай літаратуры і культуры Універсітэту Марыі Складоўскай-Кюры ў Любліне, доктар навук. Займаецца гісторыяй тэатру і драматургіі, тэатральнаю рэцэпцыяй, тэорыяй і практыкаю перакладу, а таксама праблематыкаю культурнай ідэнтычнасці ў тэатры Цэнтральна-Усходняй Еўропы.

Аўтарка манаграфіяў «Мрожэк à la russe. Тэатральная рэцэпцыя драматургіі Славоміра Мрожэка ў расейскім моўна-культурніцкім асяроддзі», «Тэатр Чэхава ў Польшчы» і «Вольныя купалаўцы. Нацыянальны тэатр у выгнанні», суаўтарка кнігі «Поколение RU белорусской драмы. Контекст – тенденции – индивидуальности». Публікуецца ў часопісах Dialog, Teatr, Pamiętnik Teatralny, Studia Białorutenistyczne ды іншых. Куратарка міжнароднага тэатральнага фестывалю Bliski Wschód.

## РУСЕЦКАЯ НАТАЛЛЯ

Славістка, перакладніца, літаратуразнаўца, аўтарка паэтычных і драматургічных тэкстаў, працуе ў Люблінскім універсітэце Марыі Складоўскай-Кюры. Яшчэ да 2020 года выдала паэтычныя зборнікі «Два бяссонні» і «Каштаны ў кішэнях», а таксама манаграфію «Сямейная муза. Паэзія Францішкі Уршулі Радзівіл». У 2020-м у суаўтарстве з Сяргеем Кавалёвым і Ірынай Лапо падрыхтавала манаграфію «Поколение RU белорусской драмы: контекст, тенденции, индивидуальности». Пераклала на беларускую творы польскіх і ўкраінскіх паэтаў Віславы Шымборскай, Канстантыя Галчыньскага, Юзэфа Чэховіча, Юрыя Іздрыка.

Наталліны пераклады п'есаў Францішкі Радзівіл, Вітальда Гамбровіча ды іншых аўтараў ставіліся ў Купалаўскім тэатры ў Менску да 2020 года – цяпер працягвае супрацу з «Вольнымі Купалаўцамі». Чытае жыхарам Любліна лекцыі пра беларускую культуру, арганізоўвае дыктоўкі на Дзень роднай мовы, вечарыны памяці расстраляных паэтаў, калядныя канцэрты, бярэ ўдзел у арганізацыі тэатральнага фестывалю Bliski Wschód.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Наталля_Леанідаўна_Русецкая

## КРАКАЎ

### ІОФЕ КАСЯ (КАЦЯРЫНА НАВІНСКІ)

Паэтка і перакладніца, актывістка і заснавальніца беларускага таварыства «Крок». Аўтарка паэтычных зборнікаў «Белы леў» і «Калі дрэвы растуць з галавы». Навучалася крытыцы літаратуры і юдаістыцы ў Ягелонскім універсітэце. Паводле прафесіі – клінічная псіхалагіня са спецыялізацыяй у арт-тэрапіі ды сексалогіі, мае кваліфікацыю выкладніцы рэабілітацыйнай ёгі. У 2023 годзе выйшла Касіна шматмоўная паэтычная кніга «Шыба без шкла» (hochroth Minsk, Берлін), дзе прысутнічаюць беларуская, расейская, польская, украінская мовы і ідыш.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Кася_Іофе

## ПОЗНАНЬ

### КВЯТКОЎСКІ СЕВЯРЫН

Пісьменнік, кіраўнік фонду «Беларусь 2020», працаваў як журналіст незалежных беларускіх медыяў. Аўтар кніг «Фрашкі да фляшкі», «Падарунак для Адэлі», «Як стаць беларусам» і «Каларадская пушча». У 2025 годзе выдаў кнігу «Мы ідзём на марш!» – галасы рэальных людзей, сабраныя аўтарам у кнізе кароткай іранічнай прозы. У кнізе ёсць раздзел кароткіх іранічных нарысаў пра беларусаў у Польшчы. Развівае фонд «Беларусь 2020» і яго медыйны праект – анімаваную энцыклапедыю «2020».

Больш інфармацыі: belarus2020.re

# ТРУЙМЯСТА

## КУДАСАВА НАСТА, ГДЫНЯ

Паэтка, перакладніца, літаратуразнаўца. Аўтарка паэтычных кніг «Лісце маіх рук», «Рыбы», «Маё невымаўля», пасля 2020 года выйшлі «Вясна. Вуснам цесна» і «Побач». Перакладае паэзію з расейскай, украінскай і ўдмурцкай моваў на беларускую. Насціны вершы перакладаліся на польскую, чэшскую, украінскую, літоўскую ды іншыя мовы. Пасля 2020-га – лаўрэатка Літаратурнай прэміі імя Міхася Стральцова.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Наста_Кудасава

# МУЗЫКА І СЦЭНІЧНЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

# VI

# Беларуская музыка, паводле музыказнаўца Аляксандра Чарнухі, ператвараецца ў сусветны феномен, пры гэтым хутка адаптуецца ў Польшчы, што сталася самым папулярным кірункам і для гэтай сферы.

Шмат якія індывідуальныя музыкі і гурты, не зважаючы на часта неспрыяльныя побытавыя пытанні, звязаныя з эміграцыяй, ды агульны негатыўны кантэкст у рэгіёне, развіваюцца і знаходзяць аўдыторыю ў польскім асяроддзі. Частка – незалежна ад мовы, частка адразу намагаецца ўпісацца ў польскі кантэкст праз польскамоўныя песні альбо пераклады на польскую.

Пасля падзеяў 2020 года ў Беларусі, як сведчыць музыка Віктар Сямашка, у Польшчу рэлакаваліся музычныя фармацыі розных кірункаў – ад рок-гуртоў да шматасабовых хораў. Тут жа паўстаюць новыя калектывы, асобныя з якіх знаходзяць магчымасці для гастроляў і студыйнай працы, камунікацыі з еўрапейскімі музычнымі выданнямі, інтэграцыі ў новую прастору праз узаемадзеянне з мясцовымі калегамі ды грантавае падтрыманне інстытуцыяў.

З гістарычнага пункту гледжання Віктар Сямашка бачыць у гэтым узаемадзеянні не стыхійныя і рэактыўныя спробы выхаду з сітуацыі выгнання, характэрныя для класічнай «эмігранцкай культуры», а натуральнае аднаўленне страчаных культурніцкіх сувязяў, узбагачэнне агульнага досведу і вяртанне цэласнай ідэйнай прасторы, якой яна была ў час Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Як прыклад паспяховай адаптацыі беларускіх музыкаў у Польшчы Аляксандр Чарнуха называе гурт Soyuz, што трапляе ў польскія музычныя рэйтынгі за год. У музычным калектыве ёсць польскія ўдзельнікі, але творчую частку ствараюць беларусы. Другі прыклад – Pan Savyan, асоба з беларускай стэндап-тусоўкі, які паўжартам пачаў ствараць кантэнт па-польску і стаўся вядомым менавіта ў польскім асяроддзі як польскі артыст. У гэтым кантэксце варта згадаць і поспех падляскага гурта Sw@da x Niczos, вядомасць якога сведчыць пра тое, што беларуская музыка натхняе польскіх творцаў.

Беларускія гурты збіраюць у Польшчы вялікія пляцоўкі. NaviBand тры разы сабраў варшаўскі клуб Progresja – паводле Аляксандра Чарнухі, гэта чарговы раз сведчыць пра тое, што ў беларускіх музыкаў апроч беларускай, з'яўляецца польская аўдыторыя. Гучным у тым ліку ў палітычным кантэксце стаўся канцэрт Макса Каржа на варшаўскім стадыёне Narodowy, квіткі

→ ЗМЕСТ

на які былі раскупленыя за 5 дзён. Адзін з самых вядомых у свеце беларускіх гуртоў – Molchat Doma, удзельнікі якога, зрэшты, не жывуць у Польшчы, – сабраў солдаўт у клубе Progresja ды меў выступ на буйным польскім фестывалі Open'er, які пасля ў запісе паказвалі на TVP.

> Сфера музыкі тым не менш не сталася ўнікальнаю: шмат хто з музыкаў зарабляе некваліфікаванаю працай, а творчасцю займаюцца толькі ў вольны час. У некаторых, паводле Віктара Сямашкі, паўстаюць праблемы з аўдыторыяй, бо ранейшая «эмігранцкая» публіка страчвае цікавасць, а мясцовая яе не праяўляе. Музыка заўважае: з боку беларускіх аўтараў паўстае недастаткова арыгінальнага прадукту, створанага па-за шаблонамі мэйнстрыму, з агульнаеўрапейскім патэнцыялам, тым часам натуральная музыканцкая інтэграцыя па прыкладзе Soyuz, Koob & Swada, Fantastic Swimmers магла б мець большы маштаб.

З апошнім пагаджаецца Аляксандр Чарнуха, якому не стае супрацы і ўвагі польскіх медыяў, прытым што беларускае поле, паводле яго, прапануе вялікіх андэграўндных, джазавых і поп-артыстаў.

# ІНСТЫТУЦЫІ, ПРАЕКТЫ І ІНІЦЫЯТЫВЫ

## ВАРШАВА

### ANIMA MEA

Камерны вакальны ансамбль заснавалі ў 2025 годзе, выконвае рэпертуар ад эпохі Адраджэння да сучаснай музыкі, у склад уваходзяць польскія і беларускія спевакі ад 30 да 55 гадоў. Мастацкая кіраўніца і дырыжорка – музыка і педагагіня Таццяна Сцепанюк. Рэпетуюць у касцёле Святога Аляксандра на плошчы Трох Крыжоў і ў музычнай студыі Sonore.

Ансамбль даў два канцэрты – «Пасія» з удзелам беларускай арганісткі Вікторыі Кучко і салістак Элады Колер і Таццяны Сцепанюк, падчас якога выканалі кантату Stabat Mater Джаванні Батысты Пэргалезі, а таксама прысвечаны жанчынам Канцэрт надзеі, які адбыўся ў часе Адвэнту.

### BELARUS OUTSIDE SOUND SYSTEM (BOSS)

Беларускі музычны дабрачынны рух у эміграцыі, створаны ў 2022 годзе культурніцкім менеджарам і прадзюсарам Аляксандрам Багданавым. Ініцыятыва яднае музыкаў, менеджараў і культурніцкіх дзеячаў, якія арганізуюць фестывалі, канцэрты і рэйвы салідарнасці дзеля падтрымання беларускіх палітычных вязняў і ўцекачоў.

За тры гады дзейнасці BOSS правёў вялікія падзеі ў Варшаве, Вільні, Берліне і Тбілісі, Кракаве, Познані і Гданьску, сабраўшы больш за 50 тысяч еўраў на дапамогу праз фонды салідарнасці. У Польшчы праект стаўся адною з найбольш прыкметных ініцыятываў беларускай музычнай дыяспары.

У 2025-м ініцыятыва зрэалізавала аднайменны фестываль, які прайшоў у дзень прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі 26 студзеня адначасова ў Гданьску, Кракаве, Познані і Варшаве. Мэта акцыі – аб'яднаць і зрабіць бачнаю беларускую дыяспару. На пляцоўках чатырох гарадоў выступілі найбольш актуальныя беларускія музыкі і дыджэі ў эміграцыі, а агульная колькасць наведнікаў склала каля 3 тысячаў чалавек.

Больш інфармацыі: belarusout.site

### «ВАРУШНЯК» / VARUŠNIAK

Культурніцка-музычная імпрэза – мікс традыцыйных матываў (Купалле, часам ладзіцца на Шчодрык) і сучаснай клубнай сцэны. Пазіцыянуецца як найбуйнейшы музычны фестываль беларускай культуры, зроблены «людзьмі і дзеля людзей».

Найбольш вядомы фармат – Kupalle: ноч ці содні музыкі, агню, танцаў і рытуальных матываў, часта з рэйв-эстэтыкаю.

Складнікі: 2+ сцэны, лайвы гуртоў і салістаў + DJ-сэты; атмасфера «народнае + сучаснае» – этна, індзі, электроніка, фолк-электроніка, эксперыментальная музыка; часта прысутнічае кірмаш, фуд-корт ды іншыя актыўнасці.

Больш інфармацыі: instagram.com/varushniak

## ВОЛЬНЫ ХОР

Музычна-палітычны рух, які з'явіўся падчас пратэстаў 2020 года ў Беларусі: выконваў найбольш знакавыя беларускія песні і гімны, ладзіў флэш-мобы на вуліцах і ў грамадскіх месцах, браў удзел у дваравых канцэртах, ладзіў онлайн-канцэрты, запісаў альбом і выдаў нотны зборнік «Годныя песні», запісваў кліпы.

З 2021-га – у Варшаве. Акрамя канцэртаў (больш за 200 па ўсёй Еўропе), запісаныя 3 альбомы («Песні вольных людзей», «Калядны падарунак» (Live), «Наша песня»), а таксама знятыя некалькі кліпаў. Важная місія ў эміграцыі – данесці да еўрапейскага слухача інфармацыю пра тое, што адбываецца ў Беларусі. Канцэрты хору – харавы тэатр са сцэнаграфіяй, відэа, удзелам актораў, чытаннем тэкстаў і вершаў.

Больш інфармацыі: volnychor.com

## «ГРАЙ» / GRAJ

Пляцоўка для «вялікіх імёнаў» і новых артыстаў беларускай сцэны, найчасцей у клубным/канцэртным фармаце. Складнікі: канцэртны лайн-ап з вядомых беларускіх гуртоў і сольных артыстаў; акцэнт не толькі на зорках, але і на падтрыманні маладых – у 2024-м рабілі адборачны конкурс для маладых артыстаў перад падзеяй; часам фэст мае і сацыяльную, дабрачынную мэту – сабраць сродкі для асобаў у патрэбе, ладзіцца арт-маркет. У 2025-м адбыўся 4-ы раз.

Больш інфармацыі: grajfest.pl

## HUČNA FEST

Беларускі культурніцкі фестываль, які арганізоўвае Free Belarus Center на беразе Віслы. Падзея паказвае актуальную беларускую культуру: канцэрты беларускіх артыстаў; літаратурныя сустрэчы і дыскусіі, арт-маркет. Ладзіць секцыі сацыяльных ініцыятываў.

У асобных эдыцыях бывае бясплатны. Фестываль збірае беларускую дыяспару і мае на мэце паказаць: беларуская культура – сучасная, жывая і разнастайная.

### CONCORDIA CHOIR

Камерны харавы калектыў, заснаваны ў 2007 годзе, складаецца з людзей розных прафесіяў і ўзростаў, а таксама з рознаю ступенню музычнай падрыхтоўкі і адукацыі. Выконвае харавую музыку a cappella. У рэпертуары хору больш за 150 твораў розных эпох: адраджэнне, барока, класіцызм, рамантызм, музыка XX стагоддзя і жанраў – харавыя канцэрты, харавыя мініяцюры і песні, песні народаў свету, калядная музыка, джазавыя творы. Вялікае месца ў рэпертуары хору займае беларуская музыка. З 2021-га працуе ў Варшаве. Удзельнік міжнародных фэстаў, пераможца 41-га Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі «Гайнаўка» і атрымальнік спецыяльнага прызу міністра культуры Польшчы.

Больш інфармацыі: facebook.com/concordiachoir.by

### FIVE-STOREY ENSEMBLE

Камерны ансамбль сучаснай музыкі, заснаваны ў 2012 годзе кампазітарамі Вольгаю Падгайскай і Віталіем Эпавым. Рэгулярна бярэ ўдзел у міжнародных музычных фестывалях і запісвае музыку для кіно і тэатру. Тры альбомы былі выпушчаныя італьянскім лэйблам Altrock. Бралі ўдзел у паказах фестывалю нямога кіно і музычнай інтэрпрэтацыі «Нямая ліхаманка» ў Варшаве.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/3tBMmZkSmMeUmEU768CZQL

## ВРОЦЛАЎ

### ALBA MUSIC TRIO

Музычны калектыў заснавалі беларускія музыкі, у склад уваходзяць Дар'я Елісеева (флейта), Эдуард Радзвіловіч (віяланчэль) і Настасся Бура (фартэпіяна, аранжаванне, мастацкае кіраўніцтва). Чальцы трыа – лаўрэаты міжнародных конкурсаў з 15-гадовым досведам канцэртнай дзейнасці. Супрацоўнічае з музыкамі, спевакамі, акторамі, мастакамі, пісьменнікамі.

У рэпертуар уваходзяць класічныя творы, каверы, джазавыя творы. Адметныя аўтарскія праекты: «Беларускае. Сусветнае. Любімае» – найлепшыя творы з рэпертуару трыа, якія прэзентуюць беларускую і сусветную культуру; Wrocław na językach świata, muzyki i przyjaźni – музыка і вершы розных народаў свету; Cosmo-Barocco

– шэдэўры эпохі барока; Gala Operowa – гіты сусветнай оперы і інструментальнай музыкі ва ўласных аранжаваннях; Zaproszenie do tanga – творы Астара П'ясоллі. Калектыў зладзіў канцэрт Stanisław Moniuszko – ojciec opery narodowej, супрацоўнічае з вроцлаўскім кампазітарам Веславам Малюхам, выконваючы ягоныя творы ў межах штогадовага фестывалю класічнай музыкі Wrocław Summer Classic.

Больш інфармацыі: instagram.com/alba_music_trio

# АЎТАРЫ

## *ВАРШАВА*

### ATESTA

Стрыт-панк гурт, вядомы жорсткім, простым і наўмысна непаліраваным гучаннем, а таксама сацыяльна і палітычна завостранымі тэкстамі. Адзін з калектываў, што ўспрымаюцца не як індзі-праект, а частка панк-супольнасці і вулічнай культуры. Гурт з выразнай DIY-этыкаю: мінімум глянцу, максімум энергіі і пазіцыі. Альбом Hramadstva прэзентавалі ў Варшаве, Беластоку, Вроцлаве.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/0AX6Iby6wU6yoEFy10Di9e

### ВЕКТОР

Выканаўца хіп-хопу. Ягоная музыка – эмацыйны, меланхалічны хіп-хоп з «поп-хукам»: трымаецца на настроі, унутраным стане, лірычны герой разважае пра стасункі, настальгію і трывогу.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/4z0OokRQUzur9rfy9KUiSf

### ЛЯВОН ВОЛЬСКІ

Музыка, паэт, кампазітар, аранжавальнік, лідар гуртоў N.R.M. і «Крамбамбуля», аўтар шэрагу сольных і праектных рэлізаў. Пасля 2020 года працягвае сольныя і праектныя рэлізы (Volski), выпускае кліпы і сінглы ды трымае канцэртную дзейнасць у эміграцыі.

Нядаўнія альбомы: Emihranty – канцэптуальны рэліз пра досвед новай хвалі беларускай эміграцыі; «Лісты палітвязням» – 12 песняў-«лістоў», прысвечаных беларускім палітычным вязням. Выступае як калумніст, стварае ўласныя відэапраекты (напрыклад, прыкметная серыя відэа пра беларускія назвы вуліцаў польскіх гарадоў).

Шматгадовы ўдзельнік вялікіх фестываляў салідарнасці Solidarni z Białorusią. Апошні такі канцэрт увосень 2020 года сабраў на стадыёне Narodowy ў Варшаве больш за 10 тысяч гледачоў. Атрымаў ганаровую падзяку ад факультэту беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэту за ўнёсак у працу на карысць беларускай культуры. У 2022-м выступіў на пляцы Пілсудскага ў цэнтры Варшавы разам з польскім аркестрам Адама Штабы ў межах вялікага праекту падтрымання Украіны Chwała Ukrainie,

а таксама запісаў супольную песню Слава Украіне! з беларускімі музыкамі і зоркаю польскай рок-сцэны Томашам Арганэкам.

Больш інфармацыі: last.fm/pl/music/Lavon+Volski

## «ДАЙ ДАРОГУ!»

Панк-рок гурт з Берасця, заснаваны ў 1998 годзе. Мае выразную сацыяльную, антыаўтарытарную пазіцыю, выкарыстоўвае іронію. Заснавальнік і фронтмэн – Юры Стыльскі (аўтар тэкстаў, вакал). У канцы 2025-га прэзентавалі новы поўнафарматны альбом «Не до законов». Выступаюць на беларускіх фэстах у Польшчы, Літве, іншых краінах.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/06ZvLf8DkcWzl9AgCBGx49

## DZIECIUKI

Фолк-панк гурт, створаны ў Горадні ў 2012 годзе. Спяваюць выключна па-беларуску, а галоўная тэма песняў – гісторыя Беларусі, яе героі, сюжэты супраціву (плюс гарадзенская гарадская міфалогія і панк-іронія). Назва асацыюецца з асобай і дзейнасцю Кастуся Каліноўскага – кіраўніка паўстання 1863–1864 гадоў на Беларусі.

Апроч выступаў на беларускіх фэстах і для беларускай аўдыторыі, робіць супольныя праекты з польскімі гуртамі: напрыклад, Hańbuki супольна з Hańba. Выступаў на польскіх канцэртах канадцаў The Real McKenzies, што ёсць маркерам пазнавальнасці ў польскім панк-асяроддзі.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/2ickO4SwvjX9SaBBXRBl6w

## DYMNA LOTVA

Гурт на скрыжаванні постблэк-мэталу і дум-мэталу. Альбом «Зямля пад чорнымі крыламі: Кроў» (The Land Under The Black Wings: Blood) – адзін з галоўных рэлізаў апошніх гадоў. Калектыў рэгулярна ездзіць у еўрапейскія туры, часта выступае ў Польшчы. 2026 год пачалі з невялікага туру: Кракаў, Гожаў, Вроцлаў, Бельска-Бяла, Познань.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/61PwJzYfSOG5zlmuluoEHT

## ZUI

Музычны праект, вядомы індзі-поп, альт-электронным гукам. Сумяшчае лёгкую танцавальную электроніку з эмацыйнымі мелодыямі і сінт-вакалам. Праект акторкі і спявачкі Алены Зуй-Вайцяхоўскай ды актора і музыкі Міхаіла Зуя. У 2024 годзе выпусцілі поўнафарматны альбом Arka з песнямі па-беларуску.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/3QORtA7mmkplIqONVj99hM

## J:MORS

Поп-рок гурт апошнія гады шмат выступае для беларускай аўдыторыі ў эміграцыі. У рэпертуары сустракаюцца песні па-расейску і па-беларуску, з апошняга – «Святло» і «Зброя». Лідар Уладзімір Пугач бярэ ўдзел у тэатральных пастаноўках («Зэкамерон» «Вольных купалаўцаў»), адзін са стваральнікаў аўдыявыдавецтва Litaralna.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/7Epwr85muyr25AdKsmE36V

## ЕЎДАКІМАЎ АНДРЭЙ

Музыка, кампазітар і мастак гуку. Практыка сканцэнтраваная на электраакустычнай і мультымедыйнай кампазіцыі, шматканальным гуку, а таксама міждысцыплінарных фарматах на скрыжаванні музыкі, перформансу і медыя. Атрымаў адукацыю кампазітара ў Музычнай акадэміі імя Фэлікса Нававейскага ў Быдгашчы ды гукарэжысёра ў Акадэміі журналістыкі і рэалізацыі гуку ў Варшаве. Працуе як кампазітар і гукарэжысёр з культурніцкімі, у прыватнасці тэатральнымі праектамі, у тым ліку міжнароднымі.

Сярод рэалізаваных у Польшчы праектаў – шматканальная інсталяцыя Sampel, czyli przekrój dźwiękowy owada і прадметна арыентаваны перформанс Historie (z) połączeń, паказаныя на фестывалі Warszawska Jesień 2025; мультымедыйны цыкл Rust of Reverence, зрэалізаваны ў межах стыпендыі Gaude Polonia.

Супрацоўнічаў з пляцоўкамі TR Warszawa, Teatr Ósmego Dnia, Тэатр анімацыі ў Познані, Scena Robocza. Браў удзел у адукацыйна-мастацкіх ініцыятывах, у тым ліку ў межах праекту Spaceopera 2.0. Ягоны музычна-тэатральны праект Diafilm Live пачынаўся ў Беларусі, а з 2021 года працуе ў Польшчы. У 2023-м была падрыхтаваная і прэзентаваная праграма дыяфільмаў на падставе тэкстаў і ілюстрацыяў сучасных беларускіх аўтараў. У межах мастацкай стыпендыі Варшавы працуе над інтэрактыўнаю шматканальнай інсталяцыяй.

## КАЗІМІРОЎСКАЯ ГАЛІНА

Дырыжорка, культурніцкая менеджарка і арганізатарка. Адна са стваральніц і дырыжорка Вольнага хору і Concordia Choir. Заснавальніца Мастацкай школы імя Міколы Равенскага ў Варшаве. Адною з місіяў працы бачыць вяртанне беларусам музычнай спадчыны: працавала з эміграцыйнымі архівамі бібліятэкі імя Скарыны ў Лондане, дзе сістэматызавала матэрыялы, апісала і склала каталогі, каб ноты і дакументы рабіліся даступныя даследнікам і выканаўцам. У прыватнасці гаворка пра архіў Міколы Куліковіча. На аснове архіўнай калекцыі падрыхтаваны музычны матэрыял, запісаны як альбом з 11 духоўных твораў Міколы Куліковіча.

## КАСЦЯХІН ІВАН

Оперны, балетны, сімфанічны, харавы дырыжор; оперны коўч і педагог; аўтар аркестравых і ансамблевых рэдакцыяў і аранжаванняў, у прыватнасці камерных аркестравых рэдакцыяў операў Моцарта, Данідзэцці, Сальеры, Манюшкі, балетаў Чайкоўскага, рамансаў, аркестравых твораў. Прафесійны досвед складае каля 25 гадоў. У Беларусі працаваў у Вялікім тэатры, Беларускай акадэміі музыкі, Рэспубліканскім музычным каледжы, Белдзяржфілармоніі.

У Польшчы зрабіў рэканструкцыю і поўную аўтарскую транскрыпцыю партытуры страчанай оперы «Маргер» беларускага кампазітара Канстанціна Горскага – найбольш маштабнай оперы, якая існуе на польскай і беларускай мовах. Мэта паўнавартаснай пастаноўкі оперы пакуль не рэалізаваная. У 2024 годзе разам з камерным аркестрам Arsis Nova (складаецца з больш як 20 прафесійных беларускіх музыкаў, якія вымушана з'ехалі за мяжу) запісаў альбом музыкі сучасных беларускіх кампазітараў Hidden Place | Secret Life. Узяў удзел у канцэртнай працы і шоу Universe Orchestra, узяў музычнае кіраванне праектам Timeless Orchestra: Muzyka przez ciało і падрыхтаваў аранжацыі да яго. Узяў удзел у пластычнай майстэрні Timeless.concerts у якасці кіраўніка камернага ансамблю, піяніста і спікера.

## АСРАТАШВІЛІ КЕТЭВАН (KETEVAN)

Беларуская спявачка з грузінскімі каранямі. Піша і выконвае ўласныя песні, часта ў эстэтычным, атмасферным поп-электронным, або трансавым гучанні з беларускаю лірыкай. Адметная эмацыйнаю музычнаю манераю, лёгкай успрымальнасцю і сучаснай афарбоўкаю. За апошнія гады выпусціла шэраг рэлізаў. У ліку найяскравейшых – песня Ptuški і глыбока асабісты EP Adčapiciesia ad mianie!

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/3lejG6nilGhlSnrvxOTAVX

## КЛЮЕЎ ПЁТР

Піяніст, вакаліст, аўтар песняў і кампазітар. Вядомы як сольны артыст і стваральнік праекту Love Machine, выпусціў альбом Punk’s Line. Актыўна выступае з канцэртамі ў Варшаве ды іншых гарадах Польшчы.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/2NSn9oZ3A4kfhhBmDyPqzw?si=d0sk-SyCQQEWHLieM4DgM1Q

## LEAR

Спявачка і аўтарка песняў, творчасць у стылі індзі-поп. Стала вядомая ў сеціве ў 2020 годзе праз беларускамоўны кавер на песню з серыялу «Вядзьмар», а ў 2022-м выпусціла дэбютны альбом «Зачапіцца».

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/0P8ggU0cm1oGhLQyn3l3iM

## LITY TALER

Гурт сярэднявечнай, фолк-музыкі, грае на старадаўніх інструментах і робіць рэканструкцыі сярэднявечных мелодыяў, а таксама ўласныя фолкавыя інтэрпрэтацыі вядомых песняў. Каманда рэгулярна ладзіць стрыт-перформансы ў Варшаве ды іншых гарадах, збіраючы аўдыторыю на імправізаваныя танцавальныя вечарыны. Бяруць удзел у фэстах сярэднявечнай культуры і рэканструктарскіх, гістарычных падзеях. Ладзяць майстар-класы музыкі і танцаў.

Больш інфармацыі: www.youtube.com/c/litytaler

## NAVIBAND (КСЕНІЯ ЖУК І АРЦЁМ ЛУК'ЯНЕНКА)

Гурт вядомы меладычным поп-рок і індзі-попам, песеннаю лірыкаю. У гучанні змешваюцца поп-рок, індзі-поп, фолк-поп: мелодыі, дуэтны вакал, шчыльныя, але «цёплыя» аранжацыі добра працуюць і ў клубе, і на вялікай сцэне. Збіраюць у Варшаве і ў іншых гарадах вялікія клубы, плошчы, выступаюць і на камерных пляцоўках.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/3VPwrxGAeBDIeBLdNVCAMi

## NOCHY

Беларускамоўны індзі-поп гурт з выразнымі элементамі фолку і электронікі. У 2025 годзе адбыўся першы сольны канцэрт у Варшаве, часта выступаюць на беларускіх фэстах у Польшчы і Еўропе.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/3uB7eq9cwroFMFKyaSeSRo

## МАЦКЕВІЧ АНАСТАСІЯ (АНА)

Магістарка оперы і тэатру, мультыдысцыплінарная артыстка і рэжысёрка, скончыла Музычны ўніверсітэт Фрыдэрыка Шапэна ў Варшаве. Стваральніца праекту Heartbreaking Performance і сузаснавальніца AuDHD-кам'юніці кавярні Michelle у Варшаве. Як музыка, кампазітарка і спявачка выступае пад імем AnaMova. З найбольш адметных беларускіх арт-праектаў можна адзначыць выставу «Я хачу дадому» і выданне аднайменнага фотаальбому, кінатрылогію «Менск 2020», мультыдысцыплінарны праект «Споведзь». Цяперашні фокусам працы – правы жывёлы, экалогія і нейраразнастайнасць.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/2bKihtfkKAujrdXvKBRf5c

## ПАДГАЙСКАЯ ВОЛЬГА

Кампазітарка і арганістка. Аўтарка шырокага спектру твораў – операў, твораў для музычнага тэатру, харавых твораў, аркестравых і камерных кампазіцыяў, а таксама музыкі да фільмаў, што выконваецца па ўсім свеце. Аддае перавагу сімфанічнай музыцы, асаблівага поспеху дасягае ў творах для сольнага аргана або аргана ў спалучэнні з іншымі інструментамі. Апроч кампазітарскай працы, актыўна выступае як салістка і ў камерных ансамблях.

Творы Падгайскай выконваліся на такіх фестывалях, як «Нямыя ночы», Beethovenfest Bonn, Ludwigsburger Schlossfestspiele, Зальцбургскі фестываль ды іншых. Стыпендыятка Gaude Polonia, удзельніца і галоўная кампазітарка ансамблю сучаснай музыкі Five-Storey Ensemble. На замову беларускага Свабоднага тэатру і лонданскага цэнтру Barbican напісала оперу «Дзікае паляванне караля Стаха», прэм'ера адбылася ў Лондане ў 2023 годзе.

Больш інфармацыі: podgaiskaya.com

## PAN SAVYAN

Сцэнічны вобраз беларускага артыста Дзмітрыя Саўяненкі. Камічны поп з эстэтыкаю рэтрарамантыкі, вусамі і кветкамі стаўся вельмі заўважным у польскім інтэрнэце. Трэк W kolorku Amaretto зрабіўся медыйным прарывам. Музыка з'яўляецца ў польскіх шоу (у тым ліку браў удзел у Mam talent) і браў удзел у адборы на «Еўрабачанне-2024».

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/4Bkz15h2Rj6fphdjxB7GaT

## ПІТ ПАЎЛАЎ

Рок-музыка, гітарыст і спявак, адзін з самых вядомых удзельнікаў і фронтмэнаў сцэны, звязанай з гуртамі «Мроя», N.R.M., а таксама праектамі Pete-Paff, GARADz-KIJA ды іншымі. Шырокай аўдыторыі запомніўся таксама «дваравымі канцэртамі» 2020 года. У Польшчы выпусціў поўнафарматны альбом «Зброя. Золата. Кабеты». Шмат выступае з канцэртамі, практыкуе жанр канцэртаў-стэндапу, падчас якіх шмат камунікуе з аўдыторыяй.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/4kJoeD15hVs3Zk07e2xoSo

## ПУКСТ СЯРГЕЙ

Кампазітар, аранжавальнік, музыка (піяніст, гітарыст), а таксама музычны журналіст і радыёвядоўца. Увесь час мяняе формы і ролі – ад «нігілістычнага джазу» да панку, арт-попу, працуе сольна і ў калектывах ды канцэптуальных альтэр-эга. У біяграфіі – важныя праекты Pukstband, Георгій Дабро (альтэр-эга) і True Litwin Beat. Музыка выступае ў Варшаве, Беластоку ды іншых гарадах Польшчы. Альбом Jawfish – першы варшаўскі рэліз.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/4hSyfSEYsxM7EALkZyrG0Z

## «РАЗБІТАЕ СЭРЦА ПАЦАНА» (РСП)

Індзі- і рок-поп гурт. Галоўная асаблівасць – песні на трасянцы (сумесь беларускай і расейскай моваў), шмат гумару, сарказму і сацыяльнай сатыры. Склад – акторы і музыкі Дзяніс Тарасенка і Павел Гарадніцкі. За апошнія гады выдалі тры поўнафарматныя альбомы – пра турму, пратэсты і эміграцыю. Свежы сентыментальны

рэліз «Бо кругом свінарнік, а ты прэкрасней усех» склалі простыя гітарныя песні, «сыры» канцэртны гук і «чыстыя пачуцці», але ўсё яшчэ з фірмовай іроніяй. Канцэртуюць у Польшчы.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/6erYHFwUsutU8968XYA5gC

## RELIKT

Жанравы дыяпазон гурта – арт-рок, фолк-рок, альтэрнатыўны рок, построк, да таго ж яго называюць піянерам беларускамоўнага постмэталу. Адметны літаратурнымі тэкстамі песняў, створанымі на аснове беларускіх легендаў, фальклорных сюжэтаў, класічнай беларускай паэзіі і прозы.

Сярод значных рэлізаў апошняга часу – складанка Byli, Jość, Budziem, што змяшчае падбор знакавых беларускіх песняў у фірмовым гучанні гурта. У 2025 годзе зладзіў канцэртны тур па Польшчы і Літве ды выдаў поўнафарматны альбом Ramantyzm.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/0IC1TeAHWCR6nmrKK7XDH1

## САВІЦКАЯ МАРЫНА

Радыёжурналістка, вядоўца і арганізатарка музычных імпрэзаў, удзельніца беларускага музычнага руху. Вядоўца імпрэзаў, сярод якіх – міжнародны дабрачынны фестываль Opor, пікнік Letucień, фэст «Грай». Вядоўца музычнага YouTube-шоу K6 Live.

Разам з Аляксеем Ажогіным зарганізавала першую ў эміграцыі беларускую музычную прэмію Uwaga!. Брала ўдзел у міжнародным праекце Voices Across Borders.

Больш інфармацыі: youtube.com/@K6_live_show

## СКРЫПНІКАВА ГАННА

Скрыпачка, настаўніца музыкі. Заснавальніца Беларускай музычнай школы ў Варшаве. Удзельніца беларускіх канцэртаў у Варшаве, выступала ў складзе Варшаўскага вольнага аркестру.

## SOYUZ

Гурт грае рэтрапоп, «інтэлігентны» поп з моцнымі ўплывамі джазу, фолку, кінематаграфічных аранжацыяў і «глабальных» гукаў. Музыкі падкрэсліваюць у творчасці сумесь усходнееўрапейскіх каранёў з джазам і фолкам ды складанымі струннымі і духавымі аранжацыямі. Поўнафарматны беларускамоўны

альбом Krok эксперты называлі ў ліку найважнейшых музычных падзеяў года. У 2026-м запланаваны вялікі еўрапейскі тур.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/0UirLOZvkWWLoWe93BEFjK

## СЦЕПАНЮК ТАЦЦЯНА

Музыка, тэарэтык і настаўніца музыкі, праводзіць заняткі ў трэнаванні слыху ў Варшаўскай музычнай школе. Заснавала творчую музычную студыю Sonore Music Studio, дзе выкладае фартэпіяна, тэорыю музыкі і гармонію для дзяцей і дарослых. Дырыжуе і кіруе камерным вакальным ансамблем Anima Mea. Раней супрацоўнічала з хорам Rozśpiewawa у Вялікім тэатры – Нацыянальнай оперы і хорам VRC. Брала ўдзел у выкананні Сімфоніі № 9 Людвіга ван Бэтховэна на сцэне Вялікага тэатру з аркестрам Sinfonia Varsovia ў складзе грамадзянскага хору разам з хорам Нацыянальнай філармоніі.

## SYNDROM SAMAZVANCA

Індзі-постпанк, дарк-поп, альт-рок праект, вядомы інтэнсіўнай эмацыйнасцю, іранічнаю самарэфлексіяй і літаратурнымі тэкстамі пра трывожнасць, уразлівасць і досвед пакалення. Адметныя жывымі канцэртамі ў невялікіх клубах і фестывальных шоукейсах, дзе важная не маштабнасць, а шчыльны кантакт з публікай. Асабліва добра праект працуе ў фармаце цёмных інтымных лайваў.

Mahajba – поўнафарматны рэліз 2025 года. Тут гурт асабліва выразна паварочваецца ў бок беларускай фальклорнай мовы, злучаючы яе з фірмоваю сумессю псіхадэлічнага, краўт-рокавага, арт-рокавага і постпанкавага гучання. Mahajba названы экспертамі ў ліку найлепшых беларускіх альбомаў 2025-га.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/4Dd0C12XvG2nEzh6Hs49mN

## ЧАРНУХА АЛЯКСАНДР

Беларускі журналіст, пісьменнік і блогер. Эксперт у галіне беларускай музыкі. Рэгулярна выступае спікерам у беларускіх, замежных і польскіх медыях, у тым ліку TVP, Krytyka Polityczna, радыё Kampus. Дзве кнігі аўтара, «Свінні» і «Гвалт», – беларускія бестселеры, якія чытаюць у 50 краінах свету. Рыхтуецца да друку трэцяя кніга – афіцыйная біяграфія беларускага гурта Molchat Doma, самага славутага калектыву з Усходняй Еўропы ў свеце. Аўтар YouTube-каналу пра беларускую музыку «Міністэрства сепультуры».

### SHUMA

Этнаэлектронны праект спалучае старажытныя, у тым ліку паганскія беларускія песні – замовы з электронікаю (deep house, dub techno, minimal, acid ды іншае). Bahna – адзін з апошніх рэлізаў: аўтары апісваюць яго як гіпна-тэхна, укаранёны ў рытмы, са злучэннем электронікі і славянскага фолку.

Асаблівасць – не проста «фолк на біце», а менавіта рытуальная, замоўная энергетыка тэкстаў і вакалу. Песні маюць аўтэнтычныя крыніцы, а вакал часта працуе як элемент абраднасці, што спалучаецца з клубным сучасным гукам.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/6BXJJXxdnfAbdfbryCGr0l

### ЭПАЎ ВІТАЛІ (VITALI APPOW)

Мультыінструменталіст і кампазітар, культурніцкі менеджар, суарганізаваў фестываль нямога кіно і музычнай інтэрпрэтацыі ў Варшава «Нямая ліхаманка», у Беларусі быў мастацкім кіраўніком міжнароднага фестывалю сучаснай музыкі і нямога кіно Kinemo. Стыпендыят Gaude Polonia. Стала выступае ў прафесійных аркестрах і супрацоўнічае з міжнароднымі ансамблямі. Да эміграцыі працаваў у Польскім інстытуце ў Менску, дзе кураваў праекты, звязаныя з канцэртамі і выставамі польскіх музыкаў і мастакоў. Сузаснавальнік ансамблю Five-Storey Ensemble, каардынатар адукацыйнага праекту Bach in the Subways. Стварае інструментальную, тэатральную і кінамузыку.

## БЕЛАСТОК І ПАДЛЯШША

### SW@DA I NICZOS

Дуэт прадзюсара Sw@da і вакалісткі MC Niczos робіць клубную электроніку (Podlasie bounce) па-падляску – гаворцы, блізкай да беларускай мовы. Бралі ўдзел у польскіх кваліфікацыях на «Еўрабачанне-2025» з песняю Lusterka і занялі 2-е месца ў фінале па выніках галасавання. #Indawoods – галоўны альбом дуэту.

Адзін з самых бачных прыкладаў, як памежная ідэнтычнасць можа стацца часткаю мэйнстрым-размовы. Для беларускага кантэксту важныя, бо музыкі робяць «сучасную сцэну» з мовы і інтанацыяў, якія беларусы лёгка счытваюць як свае ці суседнія, што працуе як культурніцкі мост паміж беларускім і падляскім ды, шырэй, польскім полем.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/album/4lyXg3Y04FNJ614uti4Lez

### СЯМАШКА ВІКТАР

Музыка, паэт, даследнік. Асноўная музычная справа – авант-джазавы гурт Fantastic Swimmers, у якім бяруць удзел беларускія і польскія музыкі. Выдаў у Беластоку дзве кнігі паэзіі: «Аўтар мае рацыю заўжды» і «Ромб». Актуальныя даследаванні датычаць супольных беларуска-польска-літоўскіх каранёў рэгіянальнага джазу, выходзяць у фармаце радыёпраграмы «Кракатук» на беларускім радыё «Рацыя».

### .K / KROPKA K (ЯЎГЕН КУЧМЕЙНА), МАЛЫЯ АЗЯРАНЫ

Эксперыментальны музычны і паэтычны праект на скрыжаванні spoken word, авангарднай электронікі, noise і перфарматыўнага мастацтва. Гэта аўтарская форма музычнага выказвання, дзе тэкст, голас і гук раўнапраўныя. Поўнафарматны альбом 1ok – апошні вялікі рэліз. Выступаў з канцэртамі ў Варшаве, Беластоку. Жыве ў Малых Азяранах недалёка ад беларускай мяжы, куды пераехаў у межах праекту падтрымання вёскі, ініцыяванага солтысам.

## КРАКАЎ

### ХУМАЛА АЛЯКСАНДР

Дырыжор, з 2021 да 2025 года – мастацкі кіраўнік Кракаўскай філармоніі імя Караля Шыманоўскага. Уладальнік першых узнагародаў на 4-м Міжнародным конкурсе харавога дырыжавання імя Язэпса Віталса ў Рызе і 5-м Міжнародным конкурсе харавога дырыжавання W Stronie Polifonii ў Вроцлаве, дзе таксама атрымаў усе дадатковыя прызы. Як стыпендыят Gaude Polonia прайшоў стажыяванне ў Вроцлаўскай оперы і Нацыянальнай філармоніі ў Варшаве. Як музычны кіраўнік арганізаваў некалькі значных музычных фэстаў, у тым ліку фестываль барока і сучаснай музыкі, што прасоўвалі маладых беларускіх і еўрапейскіх кампазітараў.

Дырыжаваў на 1-м Міжнародным музычным конкурсе імя Караля Шыманоўскага і Міжнародным конкурсе скрыпачоў імя Мечыслава Вайнбэрга. Супрацоўнічаў з вядомымі ансамблямі, у тым ліку з Кракаўскім філарманічным аркестрам і хорам, Варшаўскім нацыянальным філарманічным аркестрам, Сімфанічным аркестрам Польскага нацыянальнага радыё, сімфанічным аркестрам Тронгэйму, Загрэбскім філарманічным аркестрам ды іншымі. Супрацоўнічаў з такімі кампазітарамі, як Кшыштаф Пэндэрэцкі, Павэл Мыкетын, Аляксандр Раскатаў, Столе Клейбэрг і Эльят Гоўлдэнтал. Выступы і запісы Аляксандра Хумалы трансляваліся на каналах Mezzo, Arte TV, TVP Kultura і Другім канале Польскага радыё.

Больш інфармацыі: alexhumala.com

# ЛОДЗЬ

## BOTANIC PROJECT

Рэгі-каманда. Маюць як аўтарскі ўнікальны матэрыял, гэтак і часта выступаюць з каверамі на сусветныя гіты. У 2025 годзе сабралі вялікі канцэрт у Варшаве (падчас яго знялі фільм «Каб гучаць»), таксама прэзентавалі калабарацыі з іншымі беларускім музыкамі. Выдалі альбом «Флэшбэк».

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/5tabeLH03dWycx9imvOWqT

## :B:N (BIAZ NAZVY)

Рок-гурт, створаны ў беларускім раённым цэнтры ў 1999 годзе. Выступае ў Польшчы. Граюць альтэрнатыўны рок з прымешкамі гранжу, панк-року і альтэрнатыўнага мэталу, спяваюць па-беларуску. Альбом «20 +» – буйны свежы рэліз.

Больш інфармацыі: https://open.spotify.com/artist/0QmgYB1Hcozdsisxqn6Xqc

# ПОЗНАНЬ

## DOMSUN

Індзі-электронны музыкант і DJ, у тым ліку са сваім live-фарматам.

Больш інфармацыі: domsun.bandcamp.com

## MANDZIK

Музыка, прадзюсар з электроннай і бітмэйкерскай сцэны, шмат супрацоўнічае (вакалісты, рэп-артысты). Сумесь электронікі, клубных бітаў, бас-музыкі і DnB і хіп--хоп вакальных супольных праектаў. У 2025 годзе выдаў беларускамоўны альбом «М.».

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/0I2IE7KIHTKOvjRSutb8BK

# ТРУЙМЯСТА

## PALINA, ГДАНЬСК

Спявачка і аўтарка песень, раней выступала пад псеўданімам Palina Respublika. Піша ўласны матэрыял і спявае на некалькіх мовах – беларускай, расейскай, украінскай, французскай. Апошнім выйшаў альбом «Ни берега, ни дна». Выступае з канцэртамі ў Польшчы. У канцы 2025 года мела выступы ў Варшаве, Кракаве, Жэшаве, Гданьску, Вроцлаве. Напісала пяць трэкаў для паказу калекцыі «от куцюр» ліванскага моднага дому Georges Hobeika на Парыжскім тыдні высокай моды 2025 (Haute Couture Week).

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/0CxYQi3VnWYI0Un6oyyaEB

## ЯСЬКОЎ КАНСТАНЦІН, ГДАНЬСК

Кампазітар, аранжавальнік, музыка-імправізатар, кандыдат мастацтвазнаўства, выкладчык. Член беларускага культурніцкага таварыства «Хатка» ў Гданьску, у межах праграмы «Салідарныя з Беларуссю» NAWA працаваў яе дацэнт кафедры тэорыі музыкі ў Акадэміі музыкі імя Манюшкі ў Гданьску. Супрацоўнічае з вядомымі беларускімі музыкамі ў Польшчы ды іншых краінах свету, сярод якіх Маргарыта Ляўчук, Ілля Сільчукоў, Кірыл Кедук, Ганна Шабаева, Віталь Алексяёнак, Віктар Сямашка.

У якасці аранжавальніка супрацоўнічае з Вольным хорам, хорам вольных беларусаў «Гук цішы», Беларускаю музычнаю школай імя Равенскага ў Варшаве, гуртам NaviBand. У якасці кампазітара, піяніста і музыкі-імправізатара супрацоўнічаў з Еўрапейскім цэнтрам салідарнасці ў Гданьску, Ваяводскай і гарадской публічнай бібліятэкай імя Юзэфа Кажэнёўскага ў Гданьску. Ягоныя аранжацыі выконваюць такія паморскія калектывы, як Wave Orchestra / Orkiestra Formacja 22 і хор Juventus.

# ТЭАТР
# І ПЕРФОРМАНС

VII

# Ад беларускага народнага тэатру «Батлейка» да прэм'ераў у Нацыянальнай оперы – беларускія тэатральныя дзеячы і дзяячкі працуюць у Польшчы для беларускай аўдыторыі ды інтэгруюцца ў польскі тэатральны кантэкст.

Польшча сталася цэнтрам эміграцыйнага жыцця і ў гэтай сферы: беларусы запускаюць сямейна-сяброўскія праекты, калектывамі супрацоўнічаюць з польскімі рэжысёрамі і сцэнамі, ладзяць тэатральныя фестывалі ў розных гарадах краіны.

Індывідуальныя творцы – як Юра Дзівакоў, Паліна Дабравольская альбо Мікіта Ільінчык – з'яўляюцца ў афішах польскіх тэатраў. Хіба самым паспяховым прыкладам беларуска-польскага культурніцкага абмену ў тэатры сёння можна назваць драматургічную і рэжысёрскую працу Мікіты Ільінчыка, які дэбютаваў у Польшчы ў 2022 годзе, а ўжо ў 2025-м атрымаў намінацыю на прэмію Paszporty Polityki ў катэгорыі «Сцэна».

У сваёй працы тэатральныя творцы з Беларусі кажуць пра ідэнтычнасць, досвед вымушанай эміграцыі, сутыкненне постсавецкага досведу з еўрапейскім, ксенафобію, дыктатуру агулам і рэпрэсіі ў Беларусі ў прыватнасці, вайну Расеі супраць Украіны.

Добра вядомыя ў супольнасці прафесійныя калектывы сфармаваліся з тэатралаў, праца якіх сталася з розных прычынаў немагчымай у Беларусі. Самы гучны ў гэтым кантэксце прыклад – «Вольныя Купалаўцы», якія раней працавалі ў прэстыжным Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы ў Менску, але вялікаю групаю звольніліся з установы ў 2020 годзе на знак пратэсту. У эміграцыі яны сталі працаваць і з польскімі рэжысёрамі, і з польскаю драматургіяй.

У Польшчу ж пераехаў адзін з галоўных брэндаў беларускай тэатральнай сцэны – беларускі Свабодны тэатр. У Беларусі ён гадамі працаваў падпольна, а адначасова ладзіў і працягвае ладзіць гучныя прэм'еры ў Лондане.

Тэатразнаўца Зміцер Ермаловіч-Дашчынскі сярод тэндэнцыяў асобна вылучае беларускія тэатры-студыі педагагічнага кірунку, дзе асабліва значэнне набывае ўзаемная інтэграцыя беларускай і ўкраінскай моладзі, а таксама фестывальны рух. Не ўсе новыя калектывы і ініцыятывы, у якія згуртаваліся беларускія акторы і акторкі падчас маштабнай эміграцыі, дзеюць да сёння.

→ ЗМЕСТ

І індывідуальныя творцы, і сфармаваныя калектывы ў большасці сваёй не маюць сталай пляцоўкі ды працуюць ад праекту да праекту, што пакуль не дазваляе ім займацца тэатрам на тым узроўні, які яны мелі ў Беларусі. Большасць тэатралаў, якія сёння дзеяць у Польшчы, у Беларусі працавалі ў трупах дзяржаўных тэатраў, што значыла сталую дзейнасць і стабільны ўдзел у рэпертуары. Новая рэчаіснасць амаль ніколі не мяркуе для іх стабільнасці – наадварот, патрабуе шукаць фінансавання і партнёраў для рэалізацыі кожнага асобнага тэатральнага праекту.

Не зважаючы на некаторыя паспяховыя выпадкі супрацы і асобныя інтэграцыі беларускіх творцаў у кантэкст польскага тэатру, беларускія тэатральныя ініцыятывы збольшага застаюцца дыяспаральнымі. Поўныя залы, якія ў Варшаве за імгненне вока збіраюць, напрыклад, «Вольныя Купалаўцы», запаўняюцца пераважна беларусамі. Праекты польскіх тэатраў з беларускімі творцамі часта ўзнікалі на хвалі салідарнасці, з'яўляліся ў межах рэзідэнцыяў і стыпендыяў, і ў гэтым сэнсе польска-беларускай супрацы з увагі на мастацкія якасці і ўнікальную аўтарскую перспектыву ў сферы тэатру ўвесь час бракуе.

→ ЗМЕСТ

# ІНСТЫТУЦЫІ, ПРАЕКТЫ І ІНІЦЫЯТЫВЫ

## БЕЛАРУСКІ СВАБОДНЫ ТЭАТР

Сузаснавальнікі і мастацкія кіраўнікі беларускага Свабоднага тэатру Мікалай Халезін і Наталля Каляда называюць яго адзіным тэатрам у Еўропе, забароненым урадам з палітычных матываў. Быў заснаваны ў 2005 годзе ў Менску, а з 2021-га базуецца ў Польшчы. БСТ – піянер глабальнай мадэлі актывізму, якая аб'ядноўвае мастацкія, геапалітычныя, экалагічныя і праваабарончыя праблемы, выкарыстоўваючы тэатр як каталізатар сацыяльных зменаў.

За час існавання больш за 50 пастановак тэатру былі паказаныя ў больш як 40 краінах. Пасля 2020 года БСТ паставіў спектаклі «Сабакі Еўропы» і «Дзікае паляванне караля Стаха» на аснове кніг беларускіх пісьменнікаў, KS6: Small Forward на аснове асабістай гісторыі беларускай баскетбалісткі Кацярыны Сныцінай – іх прэм'еры адбыліся на сцэне лонданскага цэнтру Barbican, паказы адбываліся ў тым ліку ў Польшчы. Прэм'ера пастаноўкі Urząd Przyjemności адбылася ў 2025 годзе ў Варшаве.

Больш інфармацыі: belarusfreetheatre.com

## BY TEATR

Дзейнасць фонду скіраваная на захаванне, развіццё і папулярызацыю беларускай тэатральнай культуры. Працуе студыя, адкрыты набор на аддзяленне лялечнага тэатру. Да прыкладу, спектакль Bieżeńcy 1915, настаўлены паводле кнігі Анеты Прымакі-Онішк Bieżeństwo 1915. Zapomniani uchodźcy, апавядае пра лёс жыхароў усходняй Польшчы і заходняй Беларусі падчас Першай сусветнай вайны, быў паказаны 15 разоў за першыя паўгода, браў удзел у чатырох міжнародных фестывалях, зладзіў гастрольны тур па месцах пражывання нашчадкаў герояў кнігі.

Таксама вядомы польска-беларускім спектаклем Galera, пастаноўкамі «Мора Крысціны», «З@мова», How are you?.., драматургічнай лабараторыяй «Простыя словы/proste słowa», у выніку якой паўсталі пяць твораў. BY Teatr выступае прадзюсарам і юрыдычным партнёрам ініцыятываў беларускіх творцаў, мае шэраг польскіх партнёраў і грантадаўцаў, сярод якіх – Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны, Цэнтр Мерашэўскага, Тэатральны інстытут імя Збігнева Рашэўскага, Цэнтр культуры ў Любліне ды іншыя.

Больш інфармацыі: facebook.com/p/BY-teatr-100090755918014/

## «ВОЛЬНЫЯ КУПАЛАЎЦЫ»

Незалежная тэатральная група сфармавалася з актораў, якія звольніліся з Купалаўскага тэатру ў Менску ў 2020 годзе на знак нязгоды з рэпрэсіямі. Дзяржаўную ўстанову тады пакінулі 72 асобы: частка з іх, не маючы магчымасці працягваць прафесійную дзейнасць у Беларусі, пераехала ў Польшчу і пастанавіла захоўваць тэатр і беларускую мову. «Вольныя Купалаўцы», у тым ліку ў супрацы з польскімі рэжысёрамі Паўлам Пасіні і Войцехам Урбаньскім, паставілі спектаклі «Дзяды», «Гусі-людзі-лебедзі», «Рамантычнасць», «Сфагнум», «Камедыя Юдзіфі», Moj Hleb, «Плошча Перамогі», «Экстрэмісты», «Зэкамерон».

Прэм'ера пастаноўкі «Рамантычнасць» паводле творчасці Адама Міцкевіча адбылася на сцэне Тэатру Польскага ў Варшаве. З апошніх у рэпертуары калектыву – спектакль «Валізка» Аляксандра Гарцуева паводле п'есы Малгажаты Сікорскай-Мішчук, а таксама спектакль «Ваўкі» паводле аповесці «Па што ідзеш, воўча» беларускай пісьменніцы Евы Вежнавец, зрэалізаваны супольна з Люблінскім цэнтрам культуры і рэжысёрам Паўлам Пасіні.

Больш інфармацыі: youtube.com/c/kupalaucy

## «КУПАЛІНКА»

Беларуская тэатральная студыя для мігрантаў – галоўны праект фонду «Купалінка»: тут спалучаецца тэатральная педагогіка, інклюзіўная культура, навучанне сацыяльным навыкам. «Купалінка» мае вялікі досвед у пастаноўцы спектакляў, а падмуркам унікальнасці называе разуменне стану «па-за межамі гэтага месца».

Падтрымлівае мігрантаў любога веку праз тэатральныя заняткі з элементамі драматэрапіі, арганізацыю выступаў у польскіх супольнасцях для спрыяння культурніцкаму абмену і міжкультурных майстар-класаў у школах і дарослым асяроддзі. «Купалінка» падтрымлівае дарослых мастакоў-мігрантаў без поўнай занятасці ў вяртанні да прафесіі. У студыі працуюць 9 групаў мігрантаў, зрэалізаваныя 10 спектакляў на матывы сучаснай беларускай і народнай драмы, яшчэ 3 прэм'еры распрацоўваюцца. Штогадовая ініцыятыва фонд «Беларускія вянкі» на Пражскім пляжы прыцягвае каля дзвюх тысяч удзельнікаў.

«Купалінка» атрымала ўзнагароду Złoty Gargulec, адзначаная Варшаўскім фестывалем моладзевага тэатру, Мазавецкім тэатральным фондам. Сярод тых, з кім фонд супрацоўнічаў альбо ад каго атрымліваў падтрыманне, – Варшава, Мазавецкі інстытут культуры, Centrum Wielokulturowe ў Варшаве, Беларускі цэнтр салідарнасці,

Этнаграфічны музей, Польскі тэатр у Варшаве, Дом культуры Kadr, Музей Вольнай Беларусі, цэнтр Karta.

Больш інфармацыі: facebook.com/Kupalinkawarszawa

## STAND UP LOKAL

Камедыйны клуб, створаны як прастора для жывых стэндап-выступаў і творчых сустрэчаў. Беларускіх комікаў Яна Ліпая, Паўла Крыўца, Ідрака Мірзалізадэ і Лёшу Суворава аб'яднала ідэя стварыць пляцоўку для гумару і свабоднага самавыяўлення. Адкрылі клуб у верасні 2024 года, з таго моманту ён стаўся прыкметным гульцом на лакальнай камедыйнай сцэне.

Клуб яднае антываенных комікаў розных нацыянальнасцяў: рэгулярна адбываюцца гумарыстычныя шоу на беларускай, польскай, англійскай, украінскай і расейскай мовах, выступаюць зоркі беларускага і польскага стэндапу з вялікай аўдыторыяй. Апроч стэндапу, у праграме шмат імправізацыйных фарматаў – адукацыйных, музычных ды іншых імпрэзаў.

Lokal стаўся і вытворцам забаўляльнага кантэнту: комікі развіваюць YouTube-канал, на якім некалькі разоў на месяц выходзяць камедыйныя шоу і падкасты. Канал добра вядомы беларусам паводле шоу «Гутаркі» ды іншых фарматаў.

Больш інфармацыі: standuplokal.pl

## ТУТЭЙШЫ ТЭАТР (TUTEJŠY TEATR)

Нефармальная група, якая стварае спектаклі, перформансы, фільмы, аўдыякнігі, а таксама ладзіць адукацыйныя праекты – ад майстар-класаў да лабараторыяў. Сярод апошніх праектаў – спектаклі «Статус» супольна з варшаўскім Mit Space, «Ёмахо Ёмасо» ў тэатры Rampe ў Штутгарце, «Лэдзі & МакБэт» у сценах арганізацыі «Вітрына Усходнееўрапейскага дому», «Святло ў цемры» ў партнёрстве з фондам Tu-taka. Удзельнік фестываляў Off Polska, Bliski Wschód, «Я-ёсць», «Бардаўская восень». Падтрымлівае сувязі і супрацоўнічае з культурніцкімі, грамадскімі, спартовымі арганізацыямі і суполкамі ў Польшчы, Беларусі ды іншых краінах. Лідар – актор і рэжысёр Андрэй Саўчанка.

Больш інфармацыі: instagram.com/tutejshyteatr

# БЕЛАСТОК І ПАДЛЯШША

### «ПРЫЕХАЛІ»

Тэатр заснавалі ў 2023 годзе ў Беластоку прафесійныя акторы і мастакі, вымушаныя пакінуць Беларусь, у спробе захаваць беларускую культуру, мову і тэатральную традыцыю. Аснову тэатру склалі акторы Гарадзенскага тэатру лялек, што здабылі шматгадовы прафесійны досвед у Беларусі. Першы і пакуль адзіны спектакль тэатру – «Сумны суп» паводле апавяданняў беларускай пісьменніцы Вольгі Гапеевай – паказалі ў Варшаве, Кракаве, Вроцлаве, Вільні, Клайпедзе ды іншых гарадах. Тэатр працуе над наступнымі праектамі для дарослай і сямейнай аўдыторыі.

Разам з тэатральнаю дзейнасцю на базе калектыву створаная Тэатральная студыя Аляксандра Енджэеўскага, якая працуе з дзецьмі і падлеткамі з сем'яў беларускіх і ўкраінскіх мігрантаў. Тэатр працуе на скрыжаванні драматычнага, лялечнага і аб'ектнага, фізічнага і дакументальнага кірункаў.

Больш інфармацыі: teatrpryehali.pl/be

# ЛЮБЛІН

### ФЕСТЫВАЛЬ BLISKI WSCHÓD

Фестываль узнік у 2022 годзе пры падтрыманні Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Польшчы як адказ на мірныя пратэсты ў Беларусі і наступныя за імі рэпрэсіі. Bliski Wschód стаўся адным з першых фестываляў у Еўропе, які сістэмна рэпрэзентуе незалежны беларускі тэатр, прадстаўнікі і прадстаўніцы якога мусілі альбо пайсці ў падполле, альбо эміграваць. Гэта першы ў Польшчы трансмежны фестываль незалежных тэатраў краінаў, тэрыторыі якіх складалі Вялікае Княства Літоўскае: Польшчы, Украіны, Літвы і Беларусі.

Першая эдыцыя фестывалю адбылася ў жніўні 2022 года, другая – у снежні 2023-га пад лозунгам «Запрашэнне ў пекла», трэцяя – у снежні 2024-га («Стратэгічны лес») з акцэнтам на танцавальнае мастацтва, а чацвёртая – у снежні 2025-га – была прысвечаная творчай спадчыне «Вольных Купалаўцаў».

На фестывалі Bliski Wschód спектаклі, перфарматыўныя чытанні і прэзентацыі суіснуюць з дыскусіямі, лекцыямі, навуковымі канферэнцыямі, Лабараторыяй драматургіі і шматмоўнаю фестывальнаю газетаю Blizka. Фестываль стварае прастору сустрэчы для мастакоў, даследнікаў, перакладнікаў і гледачоў, сцвярджаючы тэатр як форму мастацтва і як інструмент сацыяльнага, палітычнага і культурнага мыслення.

Дырэктар фестывалю – Павел Пасіні, куратарка – Ірына Лапо, прадзюсарка – Аляксандра Канарская.

Больш інфармацыі: nettheatre.eu/festiwal-bliski-wschod

## ПОЗНАНЬ

### DIAFILM LIVE

Візуальны тэатральна-музычны праект для дзяцей і дарослых. З 2022 года большая частка калектыву – у Польшчы. За гэты час праект паспеў выступіць на фестывалях Malta Festywal, Festiwal Łódź Czterech Kultur, Wshód Kultury (Беласток), Festywal Najmłodzych (Познань), а таксама зладзіць канцэрты ў розных гарадах Польшчы ды замежжа. У 2023-м была зрэалізаваная тэатральна-музычная праграма «Беларускія казкі на стужках», якая прыцягнула як беларускую, так і польскую аўдыторыі. Цягам 2023 года адбыліся больш за 15 канцэртаў калектыву. Праект актыўна супрацоўнічае з мастакамі і творцамі, а таксама адкрыты да новых ідэяў.

Больш інфармацыі: youtube.com/@DiafilmLive

### DRUGA PRÓBA

Тэатральны фестываль Druga Próba. Teatr ponad granicami яднае ўдзельнікаў з Польшчы, Беларусі і Украіны ды складае праграму з беларускіх і ўкраінскіх спектакляў, перфарматыўных чытанняў п'есаў сучасных беларускіх і ўкраінскіх драматургаў, дыскусіяў, майстар-класаў. Арганізатар – познанскі Barak Kultury, а суарганізатары – прадстаўнікі беларускага тэатральнага кам'юніці ў Польшчы. Асноўнымі менеджарамі выступаюць Ілля Меюмаеў як прадстаўнік ініцыятывы Barak Kultury і Валянціна Мароз як праграмная судырэктарка ды куратарка перфарматыўных чытанняў. Падзея адбываецца пры фінансаванні Цэнтру Мерашэўскага і ўладаў Познаню. Фестывалі Druga Próba адбыліся двойчы – у 2024 і 2025 гадах.

### «КАЗАЧКІ БАЙ!»

Камерны тэатральны праект, які паказвае спектаклі і ладзіць творчыя тэатралізаваныя майстэрні для дзяцей. Некалькі спектакляў паўстала ўжо ў Польшчы, як «Страшная казка» ў стылі тэатру Kamishibai і «Снежны чалавек» на падставе гісторыі шведскай аўтаркі Эвы Суса. Рыхтуе прэм'еру лялечнага спектаклю па-беларуску і па-польску на падставе казкі беларускай аўтаркі. За гады ў Польшчы праект «Казачкі бай!» супрацоўнічаў з фестывалем Malta, Тэатрам анімацыі ў Познані, Estrada Poznańska,

фондам Barak Kultury, выдавецтвам Zakamarki, незалежным тэатрам Tlusta Langusta ды іншымі польскімі ініцыятывамі.

Больш інфармацыі: facebook.com/kazachkiby

### «ТЭМА». ТЭАТРАЛЬНЫЯ МАЙСТЭРНІ

Аб'яднанне заснавалі ў 2023 годзе з мэтаю стварыць прастору творчасці і дыялогу для дзяцей, падлеткаў і дарослых з Беларусі і Украіны праз тэатр і мастацтва. Заснавальніцы і выкладніцы – Валянціна Мароз, Наталля Ляванава, Алена Гіранок і Ганна Сабалеўская. «Тэма» ладзіць заняткі акторскага майстэрства, а таксама перфарматыўныя чытанні, майстар-класы і спектаклі. Майстэрні супрацоўнічаюць з іншымі беларускімі і польскімі ініцыятывамі ў Познані ды іншых гарадах. Майстэрні налічваюць 6 групаў вучняў 6–8 гадоў і 3 дарослыя групы. Адна з куратарак праекту Валянціна Мароз – ініцыятарка фестывалю Dróga próba ў Познані.

Больш інфармацыі: instagram.com/tema.teatralnyja_majsterni

## ТРУЙМЯСТА

### ТЭАТР_БЕЗНАЗВЫ, ГДАНЬСК

Тэатральны праект, які ставіць спектаклі з рознымі творцамі і ў супрацы з рознымі партнёрамі. У межах ініцыятывы былі пастаўленыя спектаклі «Дадому наўпрост 10 гадзін язды» ў рэжысуры Жэні Давідзенкі, «Нейрашторм» у рэжысуры Вікі Ягоравай, монаспектакль «Матылёк», дзіцячыя спектаклі «Як Вожык, Медзведзяня і Заяц хадзілі да ракі снедаць» і «Цацачная гісторыя». Першы са згаданых зрэалізаваны на стыпендыю Тэатральнага інстытуту імя Збігнева Рашэўскага.

Больш інфармацыі: instagram.com/teatr.beznazwy

***

### БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ ТЭАТРУ

Аб'яднанне беларускіх тэатральных дзеячаў узнікла ў 2023 годзе ў Варшаве ў адказ на рызыкі існавання незалежнага беларускага тэатру ва ўмовах сацыяльна-палітычнага крызісу ў Беларусі і вымушанай эміграцыі. Займаецца адвакацыяй формаў

падтрымання, рэпрэзентуе беларускую тэатральную супольнасць на міжнародных дыялогавых пляцоўках, даследуе і архівуе беларускую тэатральную спадчыну, падтрымлівае праграмы прафесійнай адукацыі ў галіне тэатру, арганізуе дыялогавыя захады для тэатральнай супольнасці, папулярызуе і прасоўвае актуальны беларускі тэатр. Арганізуе конкурс актуальнай беларускай драматургіі Dramatyzacyja'2026.

Больш інфармацыі: belarustheatre.org

## INEXKULT

Незалежны беларускі культурніцкі фонд сістэмна працуе ў сферы тэатру і перфарматыўных мастацтваў. У адказ на масавую вымушаную эміграцыю беларускіх творцаў пасля 2020 года фонд сканцэнтраваўся на іхным прафесійным падтрыманні, інтэграцыі ў польскае культурнае поле і развіццё ўстойлівых формаў міжнароднай супрацы.

З 2022 да 2025 года зрэалізаваў больш за 20 мастацкіх, адукацыйных і рэзідэнцыйных праектаў у Польшчы (Варшава, Гданьск, Сопат, Люблін, Кракаў) на прыблізна 1,2 мільёна злотых. Сярод асноўных праектаў – дзве эдыцыі Inex Fest у Варшаве ў 2023–2024 гадах, на якім паказалі 18 спектакляў і якія наведалі каля 3500 гледачоў. У 2023–2025 гадах фонд паказаў у Польшчы 45 спектакляў, прадаўшы каля 9 тысячаў квіткоў. Сярэдні гадавы даход ад квіткоў – каля 200 тысячаў злотых.

У праграмах рэзідэнцыяў, мастацкіх лабараторыяў і курсаў арт-менеджменту ўзялі ўдзел больш за 80 творцаў-эмігрантаў з Беларусі і Украіны. Inexkult супрацоўнічае з ключавымі польскімі і міжнароднымі інстытуцыямі культуры, у тым ліку Інстытутам тэатру імя Збігнева Рашэўскага, Goethe-Institut, Міністэрствам замежных справаў Польшчы і Дацкім інстытутам культуры, выконваючы ролю інфраструктурнай платформы для беларускага незалежнага тэатру ў Польшчы.

Больш інфармацыі: instagram.com/inexkult

# АЎТАРЫ

## *ВАРШАВА*

### БЕЛАХВОСЦІК ЗОЯ

Шматгадовая акторка Купалаўскага тэатру, якая ў 2020-м разам з іншымі калегамі звольнілася з установы на знак пратэсту, сёння ў складзе «Вольных Купалаўцаў».

Ужо ў Польшчы сыграла ў спектаклях «Дзяды» Паўла Пасіні паводле Адама Міцкевіча, «Камедыя Юдзіфі» таго ж рэжысёра паводле п'есы Сяргея Кавалёва, «Ваўкі» Паўла Пасіні паводле кнігі беларускай пісьменніцы Евы Вежнавец «Куды ідзеш, воўча?», «Валізка» Аляксандра Гарцуева ў супрацы з польскаю пісьменніцаю Малгажатаю Сікорскаю-Мішчук. Аляксандр Гарцуеў таксама паставіў монаспектакль Moj Hleb з Зояй Белахвосцік як аповед пра пяць пакаленняў сваёй сям'і і калегаў з тэатральнай дзейнасці.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Зоя_Валянцінаўна_Белахвосцік

### ГАРАДНІЦКІ ПАВЕЛ

Актор, рэжысёр, тэатральны педагог. З 2005 да 2021 года быў акторам і рэжысёрам у складзе беларускага Свабоднага тэатру.

Як рэжысёр паставіў у Варшаве спектакль «Паслядзяцінства» (Postchildhood) для Свабоднага тэатру ў 2022-м. У 2023-м паставіў у Варшаве спектакль «Выгаралы» (Wypaliony), у 2024-м – монаспектакль «Паслязаўтра будзе заўтра» на аснове дакументальнага тэксту беларускага палітвязня, у 2025-м – монаспектакль «Мужчыны плачуць». Як актор дэбютаваў у Польшчы ў спектаклі «1,8 м» на сцэне варшаўскага Новага тэатру. Сыграў у спектаклі Urząd przyjemności Свабоднага тэатру па-польску і па-англійску. З апошніх акторскіх працаў – спектакль Emigranci на сцэне тэатру Po-tem-o-tem і пластычны спектакль Timeless Orchestra: Muzyka przez ciało на сцэне цэнтру культуры Alternatywy. У творчасці спалучае глыбокі псіхалагізм і працу з целам, фізічны тэатр.

Фільмы з Паўлавымі ролямі двойчы бралі ўдзел у праграме Берлінскага міжнароднага кінафестывалю. Выкладае акторскае майстэрства і фізічны тэатр ва ўніверсітэце Mozarteum у Зальцбургзе.

## ГАРБУЗ АЛЕГ

Актор, актор дубляжу. Шматгадовы работнік Купалаўскага тэатру ў Менску, у 2020 годзе звольніўся на знак пратэсту разам з іншымі калегамі. Сёння ўваходзіць у каманду «Вольных Купалаўцаў».

У Польшчы сыграў у спектаклях «1,8 м» на сцэне варшаўскага Новага тэатру, Emigranci на сцэне Драматычнага тэатру імя Александра Вэнгерка ў Беластоку, «Плошча Перамогі», «Гусі-людзі-лебедзі», «Рамантычнасць, «Зэкамерон» «Вольных Купалаўцаў». Выканаў ролю ў серыяле «Працэсы» Андрэя Кашперскага, сыграў эпізадычныя ролі ў фільмах «Зялёная мяжа» Агнешкі Голянд, «Пад шэрым небам» Мары Тамковіч, серыяле Przesmyk на HBO ды іншых. Запісаў каля 50 аўдыякніг.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Алег_Аляксандравіч_Гарбуз

## ГАРЦУЕВА ВАЛЯНЦІНА

Акторка, працавала ў Купалаўскім тэатры ў Менску, з якога на знак пратэсту звольнілася ў 2020 годзе. Сёння – частка трупы «Вольныя Купалаўцы».

У 2022-м узяла ўдзел у першым для каманды польска-беларускім праекце «Дзяды» ў рэжысуры Паўла Пасіні ў Любліне. Сыграла ў пастаноўках «Камедыя Юдзіфі», «Ваўкі», зрэалізаванымі той жа камандай, а таксама ўзяла ўдзел у канцэрце песняў Яцэка Качмарскага «Запрашэнне ў пекла» на польскай мове.

У 2023 годзе ў Польскім тэатры імя Арнальда Шыфмана пад кіраўніцтвам Анджэя Сэвэрына сыграла шэраг роляў у спектаклі «Вольных Купалаўцаў» у пастаноўцы Мікалая Пінігіна «Рамантычнасць». У межах стыпендыі Gaude Polonia выпусціла першыя аўдыякнігі для YouTube-каналу «Вольныя Купалаўцы» – польскага пісьменніка і педагога Януша Корчака. У 2025-м сыграла адну з галоўных роляў у «Валізцы», спектаклі «Вольных Купалаўцаў».

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Валянціна_Аляксандраўна_Гарцуева

## ГАРЦУЕЎ АЛЯКСАНДР

Беларускі актор, рэжысёр, сцэнарыст, выкладнік. Як актор сыграў больш за 40 роляў, як рэжысёр паставіў больш за 70 спектакляў, выкладаў акторскае майстэрства і рэжысуру ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

У Польшчы далучыўся да групы «Вольныя Купалаўцы» і пры падтрыманні ды ў супрацы з польскімі інстытуцыямі як рэжысёр паставіў спектаклі «Гусі-людзі-лебедзі», «Сфагнум», «Плошча Перамогі», «Экстрэмісты», «Валізка».

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Аляксандр_Фёдаравіч_Гарцуеў

## ГРЭКАВА КРЫСЦІНА

Акторка, аўтарка п'есаў, грае ў Тутэйшым тэатры. Брала ўдзел у пастаноўцы дакументальных спектакляў «Паўгода» і «Расколіна» Лабараторыі сацыяльнага тэатру (на гэты момант спыніла працу) на тэму пратэстаў у Беларусі, а таксама стасункаў паміж людзьмі пасля 2020 года. У Тутэйшым тэатры сыграла ў імправізацыйным спектаклі «Гаральд», а таксама дакументальнай пастаноўцы «Статус» пра асобаў з станоўчым ВІЧ-статусам. Працуе галоўным чынам з сацыяльна-палітычнымі тэмамі, досведам іншых людзей, пытаннем ідэнтычнасці і сучаснаю літаратураю.

## ДАБРАВОЛЬСКАЯ ПАЛІНА

Акторка, тэатральная рэжысёрка, музыка і міждысцыплінарная мастачка. Стварыла 8 арыгінальных тэатральных праектаў і выканала больш за 25 роляў у Беларусі і Еўропе.

Сярод рэжысёрскіх пастановак – нямецка-польская прадукцыя Kręgosłup у тэатры «Камуна Варшава», Bohaterki ў чэшскім Divadlo Husa na provàzku, а таксама Sarmaty/ja ў межах рэзідэнцыі ў Інстытуце імя Ежы Гратоўскага ў Вроцлаве і паказаны ў Сеуле, Мюнхене, Гэлераў, Кракаве, Любліне ды іншых гарадах. Як акторка і выканаўца супрацоўнічала з Новым тэатрам, Драматычным тэатрам, тэатрам Powszechny, SDK, Тэатральным інстытутам, Варшаўскім музеем ды іншымі.

Палініны працы былі адзначаныя прэміямі, у тым ліку Гран-пры фестывалю Albamono ў Албаніі і «Найлепшая акторка» фестывалю Noul val românesc у Румыніі. Былая стыпендыятка праграмы Gaude Polonia. Спецыялізуецца на даследаванні тэмаў ідэнтычнасці, выгнання, памяці і месца чалавека ў сацыяльных і прасторавых сістэмах.

Як музыка выступае пад псеўданімам Chornobrova, спалучаючы альтэрнатыўны хіп-хоп з фальклорам у жанры, які называе b-pop.

Больш інфармацыі: open.spotify.com/artist/7quY6DH5DpKyID9DWizl0Z

## ДАШУК МАРЫНА

Тэатральная прадзюсарка, арт-менеджарка і агентка. Спрадзюсавала перформанс 375 0908 2334 The body you are calling is currently not available Ігара Шугалеева, Сяргея

Шабохіна і Аляксандры Кананчанкі. Перформанс увайшоў у рэпертуар варшаўскага Новага тэатру, дзе застаецца да сёння. Паказваўся на міжнародных фестывалях – Schwindelfrei Festival, Electropark Festival, Spielart, Spring, Performing Arts Festival, Theatertreffen, Zürcher Theater Spektakel, Santarcangelo Festival ды іншых.

Прадзюсарка спектаклю «1,8 м» паводле ананімнага беларускага драматурга пра палітычных вязняў ды перформансу Ich heiße Frau Troffea з польскаю харэографкай Агнешкаю Крыст і беларускаю творчаю камандаю – абодва ў капрадукцыі з Новым тэатрам. Перформанс застаецца часткаю рэпертуару Новага тэатру і рэпрэзентуе Беларусь на міжнародных фестывалях, яго тэма – досвед траўматычнай апантанасці і балючага пошуку свабоды ў вымушанай эміграцыі. Таксама прадзюсарка польска-беларуска-славацкага перформансу Igor і Dawid ды новай версіі спектаклю «Гэтамы» паводле кнігі «Радіва Прудок» беларускага аўтара Андрэя Горвата.

Марына каардынавала арт-рэзідэнцыі для беларускіх артыстаў ад Klub Sztuki ў Шчэціне, а таксама рэзідэнцыі Тэатральнага інстытуту ў Варшаве ў Новым тэатры.

Больш інфармацыі: marinadashuk.art/Agent

## ДЗІВАКОЎ ЮРА

Рэжысёр, мастак, тэатральны дызайнер асвятлення, графічны дызайнер, стваральнік лялек, актор, перформер і выкладнік мастацтва. Супрацоўнічаў з тэатрамі з Беларусі, Польшчы, Украіны і Румыніі. У 2021–2024 гадах браў удзел у дзвюх тэатральных рэзідэнцыях у Тэатральным інстытуце ў Варшаве, стыпендыят Gaude Polonia.

Як рэжысёр альбо сурэжысёр вядомы спектаклямі Ulenspiegel і Koniec półświni ў TR Варшава, Niepokój przychodzi o zmierzchu ў Big Book Cafe, а таксама Zła krew, rEwolucja Zającana і Nastia ў тэатры Powszechny ў Варшаве. Удзельнік выставы «Дзіўнасць межаў» – Queer vernissage у Варшаве. Як мастак правёў майстар-класы ў Цюрыхскім універсітэце і Ляйпцыгскім універсітэце. Меў персанальную выставу C(a)ementum. Biografia ў кракаўскай галерэі Baszta. Арганізатар драматургічнай лабараторыі ў Варшаве.

## ДЗІВАКОВА ТАЦЦЯНА

Займаецца сцэнаграфіяй і касцюмамі ў драматычным ды лялечным тэатрах, а таксама графічным дызайнам і камерцыйным праектаваннем (visual merchandising).

Плакат «Дом» прайшоў кваліфікацыю на 28-е Міжнароднае квадрыенале плакату ў Варшаве. Удзельніца стыпендыяльнай праграмы Gaude Polonia. Працавала сцэнографкаю, мастачкаю касцюмаў у спектаклях Nastia, Opowieść o dzielnym zającu, Zła krew у тэатры Powszechny, спектаклях Queer not for here мастацкай групы Teraz Polish, «Маніфест раслін» ад Strefa WolnoSłowa, у перформансе «Паніка» BigBookCafe,

рабіла ілюстрацыі да спектаклю «Куды падзеліся колеры» KreatiBaj. Выкладала ў інстытуцыях Fundacja dla wolności i Lato w teatrze. Стала супрацоўнічае з беларускімі тэатральнымі і кніжнымі ініцыятывамі.

## ДРАНЬКО-МАЙСЮК ВАСІЛЬ І БАЯРАВА АЛЕНА

Стварылі падкаст «Літаратурны вір», дзе ў тэатралізаванай манеры расказваюць пра дзеячаў беларускай культуры, а таксама падкаст «Казкі для Дзівусі і ўсёй Беларусі», дзе разыгрываюць фантастычныя гісторыі, напісаныя Францішкам Аляхновічам, Аляксеем Пысіным, Васілём Віткам ды іншымі класікамі беларускай літаратуры. Разам стварылі тэатр «Літаратурны вір»: спектакль «Жарсці Караткевіча» ў 2025 годзе паказалі беларусам ЗША, Канады, Бельгіі, Нідэрландаў, Польшчы. З 2023-га да 2025-га працавалі ў складзе тэатру Dzieja Druhaja. Васіль Дранько-Майсюк паставіў камедыю Францішка Аляхновіча «Шчаслівы муж» і фантасмагарычную драму «Васіль Быкаў і ягоныя д'ябы» паводле ўласнага тэксту.

## ЕРМАЛОВІЧ КАЦЯРЫНА

Акторка, рэжысёрка, аўтарка. У Беларусі 11 гадоў працавала ў менскім Новым драматычным тэатры і брала ўдзел у незалежных тэатрах.

У Польшчы сыграла ў некалькіх спектаклях тэатру Powszechny ў Варшаве, а таксама ў пастаноўцы Matka ў рэжысуры Патрыка Вархала. У межах стыпендыі Gaude Polonia разам в рэжысёркай Юліяй Шаўчук ажыццявіла пастаноўку монаспектаклю Po co babie sztuka? у тэатры Powszechny.

## ЕРМАЛОВІЧ-ДАШЧЫНСКІ ЗМІЦЕР

Даследнік і тэатразнавец, публікуецца як крытык і журналіст, выступае з адкрытымі лекцыямі. Сябра Нацыянальнага звязу тэатральных дзеячаў Украіны, а таксама Супольнасці журналістаў і актывістаў, што працуюць над пытаннямі ЛГБТКІ+ Unit. Іграе ў пастаноўках, кансультуе тэатральныя праекты, піша тэксты песняў – у гэтых ролях датычны да такіх спектакляў, як Nastia Юры Дзівакова ў тэатры Powszechny, Urząd Przyjemności ў рэжысуры Юліі Шаўчук беларускага Свабоднага тэатру, перформансу Moja Miłość у рэжысуры Мацея Гарчыньскага ў Centrum Kultury ў Любліне і спектаклю Ulisses wg James'a Joyce'a ў рэжысуры Міхала Борчуха ў кракаўскім Тэатры імя Славацкага.

Рэгулярна выступае з адкрытымі лекцыямі. Напрыклад, пра кўір-тэалогію і эвалюцыя стасункаў паміж хрысціянскімі інстытуцыямі і супольнасцю ЛГБТ+ у віленскім Create Culture Space (закрыты), пра найноўшы тэатр ва Украіне і Беларусі ва ўмовах трансфармацыі і катастрофы ў кракаўскім тэатры Scena Supernova, пра транс-культуру і эстэтыку канца XX і XXI стагоддзяў на досведзе Украіны, Беларусі і Малдовы ў Акадэміі мастацтваў у Шчэціне, пра беларуска-ўкраінскую міжкультурную

камунікацыю ў сучасным тэатры і ЛГБТ+ у антыфашысцкім супраціве XX стагоддзя ў варшаўскім цэнтры «Свабодная Беларусь».

## ЖДАНОВІЧ АЛЕСЬ

Беларускі актор, рэжысёр, тэатральны педагог, спецыяліст у беларускім тэатры «Батлейка». У Беларусі быў мастацкім кіраўніком фестывалю батлеечных тэатраў «Нябёсы» і стваральнікам інклюзіўнага дзіцячага тэатру «Радасць» з удзелам асобаў з інваліднасцю.

У Польшчы ладзіць тэатральна-крэатыўныя заняткі ў Беларускай школе мастацтва імя Равенскага, «Купалінцы», кінашколе «К4». Гастралюе па гарадах Польшчы, Еўропы агулам і Злучаных Штатаў з праграмаю, прысвечанаю гісторыі беларускай батлейкі. Выступае са спектаклем «Батлейка-Шагал», у якім спалучаюцца элементы старажытнага батлеечнага тэатру і мастацтва Марка Шагала. Рыхтуе музычна-драматычны спектакль «Маленькі прынц» паводле тэкстаў Экзюпэры і музыкі беларускага кампазітара Яўгена Глебава, а таксама фестываль дзіцячых тэатраў беларусаў замежжа.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Аляксандр_Віктаравіч_Ждановіч

## ЗЕЛЯНКОЎСКАЯ СВЯТЛАНА

Акторка тэатру і кіно. У Беларусі вядомая ролямі ў Купалаўскім тэатры і галоўнаю роляй у фільме «Анастасія Слуцкая». З 2016 да 2022 года жыла і працавала ў Кіеве, адтуль пераехала ў Польшчу. У 2023-м заснавала тэатр-студыю для дарослых «Зялёнае святло», стала выкладаць акторскае майстэрства і сцэнічную мову для дзяцей у тэатры-студыі «Купалінка». У 2024-м выканала адну з галоўных роляў у спектаклі «Суп да Вінчы» ў пастаноўцы Яўгеніі Кульбачнай, узяла ўдзел у перфаматыўных чытаннях, а пасля і спектаклі «Па што ідзеш, воўча?» паводле кнігі Евы Вежнавец ў пастаноўцы Монікі Дабраўлянскай – яго паказалі ў Беластоку, Гданьску, Варшаве, Любліне, Берліне, а таксама на Авіннёнскім тэатральным фестывалі ў Францыі ў 2025-м. У 2024 годзе сыграла ў спектаклі «Ордэн Белай Мышы» паводле Уладзіміра Арлова ў пастаноўцы Уладзіміра Ушакова.

## КУЛІКОЎСКАЯ ВОЛЬГА

Культурніцкая менеджарка, тэатральная прадзюсарка і куратарка, заснавальніца і кіраўніца фонду Inexkult. У 2020 годзе заснавала незалежную беларускую

тэатральную групу «Купалаўцы» (сёння «Вольныя Купалаўцы») і кіравала ёю да 2023-га, зрэалізаваўшы больш за 15 спектакляў у якасці прадзюсаркі і менеджаркі праектаў у Польшчы ды іншых еўрапейскіх краінах. Прадзюсарка польскіх тэатральных фестываляў Sopot non-fiction і Sopockie Konsekwencje Teatralne, якія рэалізуюцца ў супрацы з культурніцкімі інстытуцыямі Памор'я.

## МАШЭКА КІРЫЛ

Беларускі актор, перформер, педагог акторскага майстэрства. У 2016–2020 гадах быў акторам, драматургам і памочнікам рэжысёра праекту Pussy Riot Days. Былы актор беларускага Свабоднага тэатру.

З 2023-га жыве ў Польшчы, да гэтага 3,5 года правёў у беларускай турме. Супрацоўнічае з польскімі пляцоўкамі: Драматычны тэатр у Варшаве і Сучасны тэатр у Вроцлаве, дзе грае галоўную ролю ў спектаклі Un-packing у рэжысуры Катажыны Кальват паводле п'есы Мікіты Ільінчыка. Таксама як актор іграў у студэнцкіх працах рэжысёрскіх курсаў Тэатральнай акадэміі ў Варшаве. Браў удзел у рэзідэнцыях інстытуцыяў Kalektar і Domie ў Познані, клубу Storady у Шчэціне, доме культуры Staromiejski ў Варшаве.

## НОВІК АНДРЭЙ

Актор і рэжысёр, заснавальнік і кіраўнік BY Teatr, кіруе тэатральнаю студыяй (больш за 30 вучняў). Заснавальнік і кіраўнік польска-беларускай драматургічнай лабараторыі «Простыя словы».

За акторскую кар'еру выканаў больш за 30 роляў у тэатры і больш за 40 роляў у кіно. Вядомы рэжысёрскімі работамі «Мора Крысціны», Galera, How are you?.., Bieżeńcy 1915. Кіраваў акторскаю лабараторыяй у межах фестывалю Bliski Wschód 2025. З сваймі працамі браў удзел у фестывалях Kresy bezkresów, Sopot non-fiction, Konfrontacje teatralne, Kierunek Wschód, Bliski Wschód, Art Weekend.

## НОВІК ДАР'Я

Акторка тэатру, вакалістка, кампазітарка. У Беларусі была салісткаю хору Нацыянальнага акадэмічнага тэатру оперы і балету, выступала як акторка ў спектаклях дзяржаўных і незалежных тэатраў.

Пасля пераезду ў Польшчу ў 2021-м у розныя гады грала ў спектаклях тэатру Powszechny – Nastia, Chór kobiet, Польскага тэатру ў Познані – Mezopotamia і Haga. Выступае акторкай і кампазітаркай у арганізацыі BY Teatr ды іншых беларускіх ініцыятывах – «Мора Крысціны», «Замова», Galera, How are you?.., Bieżeńcy 1915.

Як музыка ў 2022 годзе ў межах Мастацкай стыпендыі Варшавы стварыла цыкл з чатырох монаопераў на трох мовах (беларускай, украінскай і польскай) пад назваю «Дарога да свабоды» / Droga do wolności. Заснавальніца і кіраўніца вакальнай школы Dara, дзе навучанне грунтуецца на прафесійным спалучэнні акадэмічнай

базы і сучасных вакальных методык. Навучанне прайшлі каля 100 вучняў. У 2024-м правяла серыю аўтарскіх майстар-класаў гукавой імправізацыі ў розных гарадах (Гданьск, Познань, Вроцлаў, Беласток, Вільня).

Больш інфармацыі: facebook.com/dara.vocal.school

## ПЯТРОВІЧ МАРЫЯ

Акторка, спявачка. Шматгадовая акторка беларусацэнтрычнага Рэспубліканскага тэатру беларускай драматургіі ў Менску.

У Польшчы далучылася да каманды тэатру Team, які працаваў у Варшаве з 2022 да 2024 года, сыграла ў спектаклях «Верасовы мёд», Z@klęcie / «З@.мова», How are you?.., Wyjdę z lasu, wyciągnę grzbiet i będzie mi służył zamiast miecza, Ulenspiegel, «Мора Крысціны».

Разам з беларускім кампазітарам Мікітам Залатаром выпусціла міні-альбом, які спалучае беларускія народныя песні і электронную музыку ў стылі dramatic techno. Спектаклі з Марыіным удзелам паказваліся на фестывалях Bliski Wschód, Sopot non-fiction, Inext Fest, на двухдзённай падзеі Contextual echoes of civic resilience у берлінскім тэатры GOЯKI.

## САПРЫКІН АЛЯКСЕЙ

Актор, сябра Прафесійнага звязу польскіх актораў (ZZAP), стыпендыят Gaude Polonia. У межах рэзідэнцыі Тэатральнага інстытуту імя Збігнева Рашэўскага сыграў у спектаклі Koniec Półświni Юры Дзівакова і Паўліны Пракапюк паводле аднайменнай п'есы Гэльмута Кайзара – спектакль стаўся лаўрэатам спецыяльнай узнагароды імя Гэбаноўскага за найцікавейшае польскае рэпертуарнае адкрыццё ў 10-й эдыцыі конкурсу Klasyka Żywa.

За час у Польшчы навязаў супрацу з тэатрам Stary ў Кракаве, BigBook Cafe, BY Teatr, фондам Inexkult і Teatr Króla. Спектаклі з Аляксеевым удзелам паказваліся на XI Фестывалі незалежнай беларускай культуры ў Вроцлаве, Inex Fest, Big Book Festival, Bliski Wschód, Sopot non-fiction, Kresy i bezkresy ў Тыкоціне, Konfrontacje teatralne ў Любліне. Браў удзел у кінапраектах, тэлевізійных і рэкламных роліках, прадукаваных кампаніямі Filmmedia, Outset Films, Watchout studio, Tuzinas TV, «Белсат».

## САЎЧАНКА АНДРЭЙ

Рэжысёр, педагог, актор, дыктар, кіраўнік Тутэйшага тэатру. Паставіў спектаклі і зладзіў тэатральныя майстар-класы ў Беларусі, Польшчы, Грузіі, Літве, Аўстрыі, Нямеччыне і Францыі. У творчасці працуе з тэмамі ідэнтычнасці, асэнсавання і месца асобы

ў свеце, каранёў памяці, сацыяльных і грамадскіх праблемаў. Шмат узаемадзеіць з моладдзю і дзіцячай аўдыторыяй.

За апошнія гады зладзіў адукацыйныя праграмы «Міф пра актораў», «Прастора маналогу», лабараторыі «Хто я?», «Дэканструкцыя тэксту», паставіў спектаклі «Статус» з варшаўскім Mit Space, «Мемуары Мумітаты» ў Беларускай школе ў Варшаве, «Ёмахо Ёмасо» ў тэатры Rampe ў Штутгарце, «Лэдзі & МакБэт» у сценах арганізацыі «Вітрына Усходнееўрапейскага дому», «Святло ў цемры» ў партнёрстве з фондам Tutaka. Запісаў аўдыякнігу «Вялікі Гэтсбі» ў супрацы з Audiobooks.by.

## ЧАКАТОЎСКАЯ КАСЯ

Драматургіня і акторка. Аўтарка шэрагу п'есаў, пастаўленых на розных тэатральных пляцоўках, перакладзеных на англійскую, нямецкую, чэшскую, польскую і расейскую мовы: «Гаргоны», «Паўгода», «Далікатна», «Апошні сняданак» ды іншыя. У 2025 годзе п'есу «Паўгода» пераклалі на польскую, яна ўвайшла ў анталогію новай беларускай драмы Niekończący się sierpień (пад псеўданімам Вікторыя Коваль). Раней гэтую п'есу паставілі ў Познані ў межах рэзідэнцыі Тэатральнага інстытуту імя Збігнева Рашэўскага і паказвалі на фестывалі Bliski Wschód.

## ШАЎЧУК ЮЛІЯ

Рэжысёрка, акторка, аўтарка п'есаў, педагагіня спецыяльных дысцыплінаў, частка каманды беларускага Свабоднага тэатру. Аўтарка інтэрпрэтацыі «Евы» Хаіма Суціна з факам, папулярнай у часе прэзідэнцкай кампаніі ў Беларусі 2020 года і пратэстаў. У Свабодным тэатры ўжо ў Польшчы паставіла спектаклі «Паслядзяцінства/ Пасляўцякацтва» (з Паўлам Гарадніцкім) паводле дакументальных гісторый герояў, а таксама No Exit на матывы п'есы Вольгі Баранковай Lucky. Паводле п'есы Мікіты Ільінчыка паставіла спектакль I'll huck you, dictator у берлінскім тэатры GOЯKI. Суаўтарка п'есы і рэжысёрка пастаноўкі Po co babie sztuka? у тэатры Powszechny, зрэалізаванай у межах стыпендыі Gaude Polonia. Апошнім быў пастаўлены спектакль Urząd przyjemności беларускага Свабоднага тэатру паводле п'есы Рамана Шыцька – у межах праграмы Off Polska пры падтрыманні Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Польшчы.

Як кінаакторка была намінаваная на прэмію «Найлепшая жаночая роля другога плану» на Фестывалі польскіх мастацкіх фільмаў у Гдыні за ролю ў фільме «Пад шэрым небам» Мары Тамковіч.

## ШУГАЛЕЕЎ ІГАР

Актор і перформер з міждысцыплінарнаю практыкаю на мяжы тэатру, танцу і перформансу, харэограф, педагог. З 2021 года жыве і працуе ў Польшчы. Працуе з тэмамі траўмы, памяці, уразлівасці і супраціву.

Аўтар перформансаў 375 0908 2334 The body you are calling is currently not available i Ich heiße Frau Troffea, што паказваюцца ў Новым тэатры, іграў у спектаклях «1,8 м» у Новым тэатры, Igor i Dawid тэатру Sztuka Nowa, беларускага праекту «Гэтамы». У 2025 годзе быў запрошаны ў трупу Новага тэатру, дзе грае таксама ў спектаклі Człowiek jaki jest, każdy widzi ў рэжысуры лаўрэаткі прэміі Paszporty Polityki Катажыны Мінкоўскай. Як харэограф выступіў у пастаноўцы Kofman. Podwójne wiązanie ў рэжысуры Катажыны Кальват.

Праводзіць майстар-класы, у тым ліку адукацыйныя, у галіне руху, перформансу і працы з целам.

Больш інфармацыі: marinadashuk.art/Igor-Shugaleev

### ШЫШКО МАКСІМ

Актор, рэжысёр, арганізацыйна і тэхнічна падтрымлівае тэатральныя ды аўдыявізуальныя праекты, бярэ ўдзел у арганізацыі рэпертуарных паказаў і тэатральных імпрэзаў, ладзіць заняткі і практычныя трэнінгі акторскага майстэрства. Быў часткаю тэатру Team, які працаваў у Варшаве з 2022 да 2024 года, пасля сузаснаваў BY Teatr. Сыграў ролі ў спектаклях «Верасовы мёд», Ulenspiegel, How are you?.., «Мора Крысціны», Galera. Рэжысёр музычнай пастаноўкі Z@klęcie / «З@.мова». З 2025-га працуе ў варшаўскім тэатры Nowe Formy, дзе сыграў у спектаклі «Бог разні» ў рэжысуры Рафала Пыкі.

Арганізатар першага міжнароднага тэатральнага Капусніку ў тэатры Nowe Formy ў 2025 годзе – калектыўнай тэатральнай падзеі з удзелам тэатральных калектываў і артыстаў з Беларусі, Украіны і Польшчы. Тут жа ўлетку 2025-га стаўся суарганізатарам Фестывалю незалежных тэатральных калектываў (Festiwal kolektywòw niezależnych), арыентаванага на развіццё міжнароднага прафесійнага дыялогу. Спектаклі з Максімавым удзелам былі прысутныя на фестывалях Bliski Wschód, Sopot non-fiction ды іншых.

## *БЕЛАСТОК І ПАДЛЯШША*

### ЕСЯНЕВІЧ ЗМІЦЕР

Актор, музыка. Шматгадовы актор Купалаўскага тэатру, з якога звольніўся разам з калегамі ў 2020 годзе.

Сёння ўваходзіць у трупу «Вольныя Купалаўцы», дзе сыграў у спектаклях «Тутэйшыя», «Страх», «Валізка». Суаўтар музыкі для музычнага альбому калектыву

«Я гавару». Актор спектаклю «Радзіва Прудок», пастаўленага яшчэ да 2020 года ў Беларусі, а сёння аднаўленага ў Польшчы фондам Inexkult. З апошніх акторскіх працаў – спектакль Emigranci паводле Славоміра Мрожэка на сцэне варшаўскага тэатру Potem-o-tem.

Пасля пераезду ў Польшчу ў 2024-м разам з Міхаілам Зуём аднавіў музычны гурт ili-ili і з ім узяў удзел у фестывалях Tutaka і «Юнацтва». Суаўтар і адзін з галоўных персанажаў сатырычнага праекту ChinChinChannel.

# ЛЮБЛІН

## КАВАЛЁЎ СЯРГЕЙ

Беларускі драматург і літаратуразнаўца, аўтар звыш 30 п'есаў для драматычных і лялечных тэатраў. З 1993 года працуе ва Універсітэце Марыі Складоўскай-Кюры. Ягоныя п'есы ставіліся ў тэатрах Беларусі, Польшчы, Украіны, Расеі, Славаччыны, Балгарыі. Польскія пераклады п'есаў Кавалёва выдадзеныя ў аўтарскіх зборніках: Zmęczony diabeł і Komedia Judyty. У Менску ў 2009-м выйшаў зборнік артыкулаў беларускіх і польскіх даследнікаў пра драматургічную творчасць Сяргея Кавалёва «Паміж Беларуссю і Польшчай: Драматургія Сяргея Кавалёва». Папулярызуе беларускую культуру ў Польшчы і польскую культуру ў Беларусі. За дзейнасць быў адзначаны ўзнагародай імя Ежы Гедройца Польскага інстытуту ў Менску, медалём Камісіі нацыянальнай адукацыі Польшчы (KEN), Залатым Крыжам Заслугі.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Сяргей_Валер’евіч_Кавалёў

# ПОЗНАНЬ

## ІЛЫНЧЫК МІКІТА

Драматург і рэжысёр, намінант на прэмію Paszporty Polityki 2025 года ў катэгорыі «Сцэна», у творах даследуе тэмы вымушанай міграцыі, расізму, траўмаў пакаленняў, кўір-супольнасці. У 2021-м атрымаў драматургічную прэмію Aurora гораду Быдгашч за п'есу Dark Room. У 2022-м спектаклем F***ing in Brussels у Польскім тэатры ў Быдгашчы дэбютаваў у Польшчы як рэжысёр і драматург (пастаноўка пра мігранта з Усходу, які прадумвае помсту праз тое, што Еўрапейскі Звяз яго не прыняў).

Як драматург выступіў у спектаклях Maria de Buenos Aires Нацыянальнай оперы ў Варшаве, 2049: Witaj Abdo ў тэатры Studio, Un-packing капрадукцыі варшаўскага Драматычнага тэатру і вроцлаўскага Сучаснага тэатру ды іншых. Вядомы як рэжысёр

пастаноўкі «Пігмаліён» у Польскім тэатры ў Познані. За спектакль разам з суаўтарам Анджэем Блажэвічам атрымаў узнагароду за найбольш цікавы тэкст, які ўздымае пытанні пра будучыню, падчас 31-га Агульнапольскага конкурсу на выставу польскага сучаснага мастацтва.

Больш інфармацыі: be.wikipedia.org/wiki/Мікіта_Ільінчык

### ЛЯВАНАВА НАТАЛЛЯ

Рэжысёрка, акторка, кіраўніца культурніцкіх праектаў у Беларусі і Польшчы – «Казачкі бай!» і Diafilm Live. Стыпендыятка Gaude Polonia. Рэжысёрка спектакляў Wielki mały świat і Cała nadzeja w jajku ў Тэатры анімацыі ў Познані. Заканчвае паслядыпломнае навучанне ў кірунку педагогікі тэатру.

## *ТРУЙМЯСТА*

### ДАВЫДЗЕНКА ЖЭНЯ, ГДАНЬСК

Рэжысёрка і драматургіня, распрацоўвае міждысцыплінарныя тэатральныя праекты, працуе з сучаснаю драматургіяй, эксперыментальнымі формамі і сімвалічным тэатрам. Як аўтарка супрацоўнічала з Гданьскім Шэкспіраўскім тэатрам (10 godzin w linii prostej do domu, Rozstrzelani), тэатрам Atelier у Сопаце і Старамейскім домам культуры ў Варшаве. Жэніны працы былі прэзентаваныя на фестывалях Sopot non-fiction, Eastern Stage. Стыпендыятка праграмы Gaude Polonia і Гданьскай культурніцкай стыпендыі Creative Fund 2025, удзельніца Sceny Nowej Dramaturgii ў Жэшаве і дакументальнага курсу Teatr na Faktach у Інстытуце імя Ежы Гратоўскага.

# РЭКАМЕНДАЦЫІ

Беларуская культура ўвесь час з пачатку масавай эміграцыі ў 2020 годзе карысталася і працягвае карыстацца падтрыманнем польскай дзяржавы і польскіх калегаў. Істотная частка назваў, згаданых у рапарце, не паўстала б без адпаведнага партнёрства і ў прыватнасці польскага фінансавання. Натуральна, культурніцкую эміграцыю такога маштабу немагчыма цалкам «засвоіць», і чакаць гэтага ад Польшчы было б наіўна.

Так ці інакш разам з новаю дынамікаю, што назіраецца і ў свеце адносна беларусаў, і ў беларускай супольнасці, дарэчна змяняцца і падыходу да беларускай культуры. Досыць працяглы час падтрыманне і супраца ў культуры зыходзілі і месцамі дасюль зыходзяць з пачуцця салідарнасці. Гэтая, з аднаго боку, высакародная практыка, з другога мяркуе ўстаноўку на кропкавыя, кароткатэрміновыя ініцыятывы, як бы трэба было развязаць раптоўную гуманітарную праблему. У выніку за больш як 5 гадоў беларусы атрымалі магутнае падтрыманне па ўсёй краіне, здольнае набыць больш сістэматычны кшталт.

У беларускім кантэксце культуру можна назваць адным з самых перспектыўных кірункаў пры наяўнай расстаноўцы сілаў у рэгіёне: праца з самаідэнтычнасцю дазваляе найбольш праактыўны падыход, бо здольная ўтрымаць дыстанцыю паміж Беларуссю і Расеяй ды падрыхтаваць грамадства да больш хуткага пераходу да дэмакратыі.

Мы ў моманце, найбольш дарэчным для зрушэння фокусу. Беларусы ўсё больш прыстасоўваюцца да Польшчы і інтэгруюцца ў мясцовы кантэкст, усё лепш ведаюць мову, шмат хто з іх мае польскае грамадзянства і звязвае будучыню з Польшчаю. Пры гэтым беларусы таксама і гістарычная нацыянальная меншасць, што апрыёры ёсць часткаю культурнага ландшафту краіны.

У гэтым кантэксце больш дарэчнымі робяцца не салідарнасць, а выкарыстанне рэсурсу, не дапамога альбо падтрыманне, а супраца, капрадукцыя, кааперацыя. Калі арыентавацца на патэнцыял культурніцкай супольнасці і глядзець на яе як у тым ліку рэсурс, што можа ўзбагаціць лакальную і міжнародную культурніцкую сцэну, мы маем наступныя рэкамендацыі.

- Адукацыйныя ініцыятывы, што даюць інструменты для стварэння і ўтрымлівання арганізацыяў і праектаў паводле новай эканамічнай мадэлі, а таксама рыхтуюць менеджараў і прадзюсараў.
- Спрыянне пашырэнню польска-беларускіх калабарацыяў – на ўзроўні аб'яднанняў і інстытутаў, буйных фестываляў і кірмашоў, прэстыжных культурніцкіх пляцовак. Частцы беларускай каманды гэта павінна даць магчымасць атрымліваць практычны досвед удзелу і арганізацыі буйных івэнтаў.

- Арганізацыя флагманскіх супольных імпрэзаў, у тым ліку з выкарыстаннем такіх праваднiх імёнаў, як Адам Міцкевіч, Станіслаў Манюшка, Уладзіслаў Страмінскі ды іншыя.
- На пэўны перыяд (напрыклад, 2 гады) забяспечыць субпраграму дзяржаўнага падтрымання для беларусаў, мэтай якой будзе ў тым ліку павышэнне канкурэнтаздольнасці беларусаў у справе афармлення заявак, выбудоўвання стратэгіяў і наладжвання кааперацыяў.
- Змясціць фокус у наратывах з салідарных праектаў на супольныя крэатыўныя праекты сучаснага мастацтва: салідарнасць, калі яна цягнецца гадамі, не прыцягвае арганічнай публікі.
- Дэманстрацыя выразнага раздзялення беларусаў і сённяшняй дзяржавы ў Беларусі на розных узроўнях. Шмат якія інстытуцыі і праекты памылкова пазбягаюць супрацы з беларусамі альбо наймання беларусаў на працу з пераканання, што санкцыйныя абмежаванні могуць гэта забараняць.

Гэтыя рэкамендацыі ўтрымліваюць захады, якія далі б культурніцкім дзеячам інструменты і досвед, каб дзеяць у новым для іх культурным полі самастойна, а таксама паспрыяюць карыснаму для абодвух бакоў культурніцкаму абмену, які можа прынесці вынікі і на міжнародным узроўні.

# АЛФАВІТНЫ ПАКАЗАЛЬНІК АСОБ І ІНІЦЫЯТЫЎ


**А**

Аберамок Віктар 31
Агрэніч Нэла 73
Адамаў Аляксандр 31
«Акно на Усход» 16
Анёлава Ксенія 31
Анціпаў Павел 90
Арахоўская Ірына 32
Аркуш Алесь 94
Арт-праект Revolution 25
Архіпава Вольга 47
Архіў Veha 30
Арцёмава Юля 90
Асацыяцыя беларускіх выдаўцоў 87
Асраташвілі Кетэван (Ketevan) 108
Ацясаў Аляксандр 32

**Б**

Банэт Марыя Алена 34
Бартосік Зміцер 94
Барышнікава Вольга 65
Барышнікаў Яўген 64
Бацюкоў Аляксей 62
«Белавежа» 89
Белавец Марта 46
Беларускае гістарычнае таварыства 59
Беларускае грамадска-культурніцкае таварыства 17
Беларускае культурніцкае таварыства «Хатка» 21
Беларускае таварыства «Крок» 19
Беларуская музейная лабараторыя 55
Беларуская незалежная кінаакадэмія 70
Беларуская прэмія кінакрытыкаў «Чырвоны верас» 71
Беларуская рада культуры 12
Беларуская школа мастацтваў імя Міколы Равенскага 55
Беларускі гістарычны зборнік 60
Беларускі дом у Варшаве 11
Беларускі інстытут публічнай гісторыі 55
Беларускі інстытут спадчыны 56
Беларускі інстытут тэатру 126
Беларускі моладзевы хаб 11
Беларускі ПЭН 83
Беларускі свабодны тэатр 121
Беларускія аўдыякнігі Audiobooks.by. 83
Беларускія магістраты 11
Белахвосцік Зоя 128
«Белсат Doc» 69
Брыян Даша 32
«Будзьма беларусамі!» 12
Буйніцкі Максім 73
Бурко-Дземідзюк Анастасія 33
Бурнашаў Глеб 33
Бусел Разаліна 33
Бялькевіч Даша 94

**В**

Ваданосава Кацярына 63
Валынкін Макар 90
«Варушняк» / Varušniak 101

Васюковіч Аляксандр 34
Вашкевіч Дар'я 90
Вашкевіч Лёша 34
Вежнавец Ева (Святлана Курс) 90
Вектор 105
Веледзімовіч Аляксандр 48
Вольны хор 102
«Вольныя Купалаўцы» 122
Выдавецтва «Янушкевіч» і кнігарня «Кнігаўка» 86
Вялічка Саша 35

Г
Галубовіч Ксенія 73
Ганчароў Даніла 35
Гапіенка Іван 74
Гарадніцкі Павел 128
Гарбуз Алег 129
Гарцуева Валянціна 129
Гарцуеў Аляксандр 129
Глушэнь Яўген 35
Грабеннікава Віка 36
«Грай» / Graj 102
Грыцкевіч Ксенія 36
Грыц Марыя 64
Грэкава Крысціна 130
Грэсь Міхал 44

Д
Дабравольская Паліна 130
Давыдзенка Жэня 139
«Дай Дарогу!» 106
Дашук Вольга 78
Дашук Марына 130
Дзівакова Таццяна 131
Дзівакоў Юра 131
Дзядзенка Зміцер 91
Дом буслоў 25
Дом творцаў 13
Доўгушаў Сяржук 62
Дранько-Майсюк Васіль і Баярава Алена 132
Дробыш Крысціна 91
«Дзея» Мультыкультурны фонд 20

Е
Ермаловіч-Дашчынскі Зміцер 132
Ермаловіч Кацярына 132
Есяневіч Зміцер 137
Еўдакімаў Андрэй 107

Ж
Ждановіч Алесь 133
«Жыветэка» 83

З
Залуцкая Вера 36
Зелянкоўская Святлана 133
Зуй Міхаіл 74

І
Ільінчык Мікіта 138
Ільюшына Лілія 91
Інстытут беларускае мовы 57
Інстытут беларускай кнігі 84
Іофе Кася (Кацярына Навінскі) 96

К
.k / Kropka K (Яўген Кучмейна), Малыя Азяраны 115
Кавалёў Сяргей 74
Кавалёў Сяргей 138
«Казачкі бай!» 125
Казіміроўская Галіна 108
Казлоўская Марына 92
Калядзюк Віка 46
Канафальская Аляксандра 45
Кандраценка Таня 37
Карнацкая Наста 92
Карнеенка Марыя 37
Кастусік Павал 37

→ ЗМЕСТ

Касцяхін Іван 108
Кацуба Таша 48
Кашперскі Андрэй 75
Кватэра 27 13
Квяткоўскі Севярын 96
Кірвель Яраслаў 37
Кіркевіч Алесь 64
Кліп Вольга 37
Клубакавярня «Мы» (MY) 29
Клуб беларускіх мецэнатаў 13
Клюеў Пётр 109
«Кніжны воз» 84
«Кніжны вырай» 88
Копач Арцемій 38
Копач Віктар 38
Кот-Зайцаў Аляксандр 38
Кудасава Наста 97
Кузьміч Вольга 39
Кузьмічова Кацярына 45
Кулевіч Руслан 64
Кулікоўская Вольга 133
«Купалінка» 122
Кустава Валерыя 92
Куціла Андрэй 78
Кштałт 14

**Л**

Лапо Ірына 95
Лобач Уладзімір 62
Лунёў Аляксей 47
«Лысы чэрап» 84
Ляванава Наталля 139
Лявон Вольскі 105

**М**

Маісей Раман 39
Максімовіч Марк 47
Марчык Сяргей 75
Маслёнчанка Ліза 39
Матафонаў Аляксандр 75
Маціеўская Кацярына 92
Мацкевіч Анастасія (Ана) 110
Машэка Кірыл 134
Медыяпраект «Культурны фронт» 14
Меюмаеў Ілля 48
Мжэльская Вольга 39
Міхалковіч Аляксандр 76
Мішук Міхась 40
Моладзевы клуб развіцця і культуры Spadčyna 61
Мужава Яўгенія 40
Мужаў Канстанцін 40
Музей Вольнай Беларусі 58
Музей малой айчыны ў Студзіводах 60
«Мяне няма» 85

**Н**

Новік Андрэй 134
Новік Дар'я 134
Нядбай Таццяна 93
«Нямая ліхаманка» 70

**О**

Осіпаў Максім 40

**П**

Падгайская Вольга 110
Пазняк Уладзімір 49
Палупанаў Андрэй 76
Палякова Караліна 40
«Паўночнае ззянне» 70
Пашковіч Вольга 62
Пікнік Letucień 19
Піт Паўлаў 111
«Полацкія лабірынты» 85
Праграма «Вусы Скарыны» 56
Прастора беларускай культуры Doswied 20
«Прыехалі» 124
Пукст Сяргей 111
Пчолка Леся 45

Пятровіч Марыя 135

Р
Радаман Андрэй 63
Радзівонаў Антон 41
«Разбітае сэрца пацана» (РСП) 111
Рудакова Мар'яна 76
Рудкоўскі Пётр 63
Русецкая Наталля 95
Рыдлеўская Анастасія 49
Рыжкоў Віталь 93

С
Савашэвіч Ала 45
Савіцкая Марына 112
Салодкі Дзмітрый 41
Сандрас Ніка 49
Сапрыкін Аляксей 135
Сарычаў Максім 46
Саўчанка Андрэй 135
Саяпіна Надзя 41
Свірэпа Таня 79
«Сейбіт» / SayBeat 85
Сельвесюк Валенці 45
Скрыпнікава Ганна 112
Спрынджук Ілля 41
«Старая школа» 17
Стратовіч Юля 41
Сурскі Ягор 42
Суханосік Настасся 64
Сцебур Антаніна 42
Сцепанюк Таццяна 113
Сцяцко Лізавета 48
Сямашка Віктар 115
Сямашка Юрый 77
Сянькова Улада 76

Т
Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны 58
Таварыства «Музей і цэнтр беларускай культуры ў Гайнаўцы» 61
Тамковіч Мара 77
Тарасэвіч Лявон 44
«Традыцыя» 59
Тутэйшы тэатр (Tutejšy Teatr) 123
Тэатр_безназвы 126
«ТэМа». Тэатральныя майстэрні 126

У
Урублеўскі Аляксей 44

Ф
Фестываль Bliski Wschód 124
Фестываль Tutaka 18
Фонд Kamunikat 87
Фонд Mochnarte 27
Фонд Tutaka 18
Форум культурніцкіх арганізацыяў 15
ФШ1: Беларуская фатаграфічная платформа 27

Х
Хаб «Новая зямля» 17
Хадановіч Андрэй 95
Харытанюк Наталка 93
Хельда Ян 42
Хлаба Аля 43
Хмель Настасся 64
Хумала Аляксандр 115

Ц
Цемра Дар'я 36
Цэнтр беларускай культуры 19
Цэнтр беларускай салідарнасці 16
«Чабор» 86
Чакатоўская Кася 136
Чарнуха Аляксандр 113

→ ЗМЕСТ

**Ш**

Шаблоўская Юлія 43
Шадко Яўген 43
Шаўчук Юлія 136
Швед Максім 77
Школа беларускай традыцыйнай культуры Ethno.art.by 59
Шостак Яна 43
Шот Ганна 44
Шугалееў Ігар 136
Шышко Максім 137

**Э**

Эпаў Віталі (Vitali Appow) 114
«Этыка» 27

**Я**

Яськоў Канстанцін 117
Яфімаў Ягор 78

**A**

Alba Music Trio 103
AlesPushkin.com 30
Anima Mea 101
Atesta 105

**B**

Belarusian Filmmakers' Network 71
Belarus Outside Sound System (BOSS) 101
Bergamot Group 47
:B:N (Biaz Nazvy) 116
Botanic Project 116
Bulbamovie 69
ByProsvet 87
BY Teatr 121

**C**

Concordia Choir 103

**D**

Diafilm Live 125
Domsun 116
Druga Próba 125
Dymna Lotva 106
Dzieciuki 106

**F**

Five-storey ensemble 103
Free Belarus Center 15

**G**

Grey Mandorla Studio 28
Gronka 13
Gutenberg Publisher 88

**H**

Hożaspace 16
Hučna Fest 102

**I**

Inexkult 127
Invictus 1863 60

**J**

J:Mors 107

**K**

Kalektar 29
Kanaplev+Leydik (Лейдзік Юлія і Канаплёў Яўген) 36
KANVA 26
Kasary 57
Kut 29

**L**

Lear 109
Kanaplev+Leydik (Лейдзік Юлія і Канаплёў Яўген) 36
Lity Taler 109

**M**
Maldzis 57
Mandzik 116
Marafest 21
Maramora 30
Mit Space 15

**N**
NaviBand
(Ксенія Жук і Арцём Лук'яненка) 109
Nochy 110

**P**
pakoj_202 20
Palatno 61
Palina 117
Pan Savyan 111
Pradmova 86

**R**
Relikt 112
Rozum 89

**S**
Saliva Live 26
Sekktor 15
Shuma 114
Słowianka 85
Soyuz 112
Spievy z-pad mosta 58
Stand Up Lokal 123
Sw@da i Niczos 114
Syndrom Samazvanca 113

**T**
Tamaka Publishing / «Тамака» 88
TrzyMaj 28

**V**
Varta 25
Villa Sokrates 18
Vodblisk 72

**Z**
Znivien 26
Zui 107

Гэты рапарт узнік як спроба ацаніць маштаб, якасць і праблемы беларускай культурніцкай супольнасці ў Польшчы. З 2020 года эміграцыя творцаў розных дысцыплінаў з Беларусі ў Польшчу адбываецца хутчэй у экстранны, чымся натуральны спосаб. У выніку, значная інтэграцыя беларускай творчай эліты ў мясцовы культурніцкі кантэкст аказалася выклікам, нягледзячы на пазіцыю адкрытасці і жэсты салідарнасці.

Пра якую колькасць прадстаўнікоў і прадстаўніц творчых прафесіяў мы кажам? Дакладных альбо хаця б прыблізных звестак, прынамсі пакуль, не існуе. Арганізацыі і адмыслоўцы, якія маніторацць стан беларускай культуры, прызнаюць, што бачаць толькі верхавіну айсберга. Нават агульны лік людзей з Беларусі, якія сёння жывуць у Польшчы, істотна адрозніваецца ў залежнасці ад спосабу падліку і вар'юецца паміж 145 і 350 тысячамі. Лічба да таго ж стала павялічваецца.

Адзінае, што можна сказаць з упэўненасцю: беларусы – другая найбуйнейшая група замежнікаў у Польшчы.

**Centrum Mieroszewskiego**
**The Mieroszewski Centre**

ul. Jasna 14/16a
00-041 Warszawa
www.mieroszewski.pl

Цэнтр Мерашэўскага – гэта дзяржаўная юрыдычная асоба, створаная ў адпаведнасці з законам. Яе місія – ініцыяванне, падтрыманне і правядзенне імпрэзаў, скіраваных на народы Усходняй Еўропы, у прыватнасці ўкраінцаў, беларусаў, грузінаў і малдаванаў, з мэтай умацавання незалежнасці іхных дзяржаваў у святле спробаў Расеі перагледзець межы і аднавіць рэгіянальную гегемонію. Ён таксама падтрымлівае працэсы, якія будуць спрыяць пабудове развітых дэмакратыяў, умацаванню больш цесных сувязяў з еўраатлантычнымі структурамі і паглыбленню сувязяў з Польшчаю. Дыялог з расіянамі застаецца ў цэнтры ўвагі Цэнтру, але як з палітычных, так і маральных прычынаў ён павінен быць абмежаваны асобамі і ўстановамі, якія адназначна асудзілі расейскую агрэсію і злачынствы.